# КАНСПЕКТЫ

## ДАПАМОЖНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

## ДЛЯ КАТЭХЕЗАЎ

VI кл.

Катэхетычная секцыя пры ККББ

2013 г.

## Тэма 1. Бог выбраў Марыю за Маці Божую

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з біблійнай гісторыяй пра звеставанне Найсвяцейшай Дзеве Марыі; дапамагчы вучням зразумець, што дзякуючы паслухмянасці Найсвяцейшай Дзевы Марыі Пану Богу Езус Хрыстус — наш Збаўца — прыйшоў у свет.

**Выхаваўчая мэта:**

фарміраваць у вучняў пачуццё ўдзячнасці да Найсвяцейшай Панны Марыі за тое, што Яна згадзілася стаць Маці Езуса Хрыста і нашай Маці.

**Матэрыялы:**

Біблія: Лк 1, 26–56; Ян 19, 25–27.

Ілюстрацыі: «Звеставанне Дзеве Марыі», «Дзева Марыя ў доме Альжбеты» і «Марыя пад крыжам». Касцюм для Марыі. Абраз «Пакроў Божай Маці».

Надпісы: «Вось я, слуга Пана. Няхай мне станецца паводле твайго слова» (Лк 1, 38); «Шчаслівая тая, якая паверыла, што споўніцца сказанае Ёй Панам» (Лк 1, 45); «Вось Маці твая» (Ян 19, 27).

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразом, асацыяцыі, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагмента з фільма, інсцэніроўка, чытанне па ролях, дыялог, пісьмовая праца на падставе тэксту, маляванне.

### Ход занятку

**Малітва**

Тваёй абароне

**Чалавек пытаецца**

*Катэхет пытаецца ў вучняў:*

1. Напішы, якія асацыяцыі ў цябе выклікае слова «мама»? (*Заданне у сшытку №1*)




Кожны з нас з’явіўся на свет дзякуючы маці. Слова «маці» ў нас асацыюецца з блізкім і любімым чалавекам. Яна нас нарадзіла, яна корміць нас і клапоціцца пра нас — такая задума Пана Бога. У Езуса Хрыста таксама ёсць Маці.

**Бог адказвае**

Сёння мы з вамі даведаемся пра тое, як Пан Бог выбраў Маці для Езуса Хрыста.

*Катэхет вешае на дошку тры ілюстрацыі:* «Звеставанне Дзеве Марыі», «Дзева Марыя ў доме Альжбеты» і «Марыя пад крыжам», а таксама надпісы: «Вось я, слуга Пана. Няхай мне станецца паводле твайго слова» (Лк 1, 38); «Шчаслівая тая, якая паверыла, што споўніцца сказанае Ёй Панам» (Лк 1, 45); «Вось Маці твая» (Ян 19, 27).

Паслухайце, як гэтая падзея апісваецца ў Святым Пісанні.

*Катэхет дае вучням магчымасць праслухаць біблійныя тэксты з аўдыёзапісу Бібліі: Лк 1, 26–56; Ян 19, 25–27.*

*Можна паказаць фрагмент з фільма пра звеставанне Найсвяцейшай Дзеве Марыі (звярніце ўвагу на тое, каб фрагмент дакладна адлюстроўваў біблійны сюжэт*).

*Катэхет прапануе вучням паставіць сцэнку. Ролі: аўтар-апавядальнік, Марыя, арханёл Габрыэль, святая Альжбета. Можна выкарыстоўваць музычнае афармленне.*

*Вучні інсцэніруюць фрагмент з Евангелля паводле Лукі (1, 26–56).*

**Аўтар:** У шосты месяц Бог паслаў анёла Габрыэля у горад галілейскі, называны Назарэт, да Дзевы, заручанай з мужам па імені Юзаф, з дому Давіда, а імя Дзевы – Марыя. Анёл, увайшоўшы да Яе, сказаў:

**Арханёл Габрыэль:** Вітай, поўная ласкі, Пан з Табою.

**Аўтар:** Яна ж збянтэжылася ад словаў ягоных і разважала, што гэта за прывітанне. І сказаў Ёй анёл:

**Арханёл Габрыэль:** Не бойся, Марыя, бо знайшла Ты ласку ў Пана. Вось зачнеш ва ўлонні сваім і народзіш Сына, і дасі Яму імя Езус. Ён будзе вялікі і будзе названы Сынам Найвышэйшага, і дасць яму Пан Бог трон Давіда, бацькі Ягонага, і валадарыць будзе над домам Якуба вечна, а валадарству Яго не будзе канца.

**Аўтар:** І сказала Марыя анёлу:

**Марыя:** Як станецца гэта, калі я мужа не спазнала?

**Аўтар:** Анёл сказаў Ёй у адказ:

**Арханёл Габрыэль:** Дух Святы сыдзе на Цябе, і моц Найвышэйшага ахіне Цябе. Таму і Святое, што народзіцца, будзе названа Сынам Божым. Вось і Альжбета, сваячка твая, і яна зачала сына ў старасці сваёй; і ўжо на шостым месяцы тая, якую называлі бясплоднай, бо для Бога няма нічога немагчымага.

**Аўтар:** Тады Марыя сказала:

**Марыя:** Вось я, слуга Пана. Няхай мне станецца паводле твайго слова.

**Аўтар:** І адышоў ад Яе анёл. Сабраўшыся, Марыя ў тыя дні пасьпяшыла ў горную краіну, у горад Юды. Яна ўвайшла ў дом Захарыі і прывітала Альжбету. Калі Альжбета пачула прывітанне Марыі, узварухнулася дзіцятка ва ўлонні яе, і напоўнілася Альжбета Духам Святым. Яна ўсклікнула моцным голасам і сказала:

**Альжбета:** Благаслаўлёная Ты між жанчынамі і благаслаўлёны плод улоння Твайго. Адкуль мне гэта, што Маці Пана майго прыйшла да мяне? Бо калі голас прывітання Твайго загучаў у вушах маіх, узварухнулася радасна дзіцятка ва ўлонні маім. І шчаслівая тая, якая паверыла, што споўніцца сказанае Ёй Панам.

**Аўтар:** І сказала Марыя:

**Марыя:** Велічае душа мая Пана,
і ўзрадаваўся дух мой у Богу, маім Збаўцу,
бо глянуў Бог на пакору сваёй слугі.
І цяпер благаслаўляць мяне будуць усе пакаленні.
Бо вялікае ўчыніў мне Усемагутны,
а імя Яго святое.
І міласэрнасць Яго з пакалення ў пакаленне
над тымі, хто яго баіцца.
Паказаў моц сваёй правіцы,
рассеяў тых, хто пыхлівы сэрцам.
Скінуў магутных з трона
і ўзвысіў пакорных.
Дабром галодных насыціў,
а багатых ні з чым адправіў.
Прыняў свайго слугу Ізраэля,
памятаючы пра сваю міласэрнасць,

як абяцаў бацькам нашым,
Абрагаму і яго патомству навекі.

**<u>Аўтар:</u>** Прабыла Марыя ў Альжбеты каля трох мясяцаў і вярнулася ў дом свой.

*Катэзхет задае пытанні вучням (у сшытку заданне № 2):*

— Каго Пан Бог паслаў да Марыі?

— Якімі словамі прывітаў арханёл Габрыэль Марыю?

— Якую вестку прынёс арханёл Габрыэль Марыі?

— Што адказала Марыя?

— Куды і да каго пайшла Марыя?

— Што здарылася з Альжбетай, калі яна пачула голас прывітання Марыі?

— Якімі словамі Альжбета прывітала Марыю?

— Чаму мяне вучыць Найсвяцейшая Дзева Марыя?

*Катэхет прапануе вучням пісьмова адказаць на пытанне (заданне № 3 у сшытку):* напішы, як ты разумееш выраз: «Шчаслівая тая, якая паверыла, што споўніцца сказанае Ёй Панам» (Лк 1, 45).

*Вучні прадстаўляюць свае адказы на форум.*

*Катэхет гаворыць:*

На крыжы Езус даў нам Марыю як Маці. Яна з'яўляецца Маці кожнага верніка.

*Катэхет прапануе вучням самастойна знайсці біблійны тэкст з Евангелля паводле Яна (19, 25–27) і выпісаць словы Езуса, у якіх Ён дае нам Марыю як нашу Маці (заданне № 4 у сшытку).*

**Чалавек адказвае Богу**

Спрадвеку хрысціяне звярталіся да матчынага заступніцтва Найсвяцейшай Дзевы Марыі праз малітву і пілігрымаванне. Яна няспынна моліцца за нас да свайго Сына Езуса Хрыста. Мы ўшаноўваем Маці Божую і імкнёмся так, як Яна, даверыць усё сваё жыццё Пану Богу. Найсвяцейшая Дзева Марыя заўсёды вядзе нас да свайго Сына Езуса Хрыста і вучыць нас: «Усё, што скажа вам Езус, тое і рабіце».

Штогод у нас у Беларусі арганізоўваюцца пілігрымкі да цудатворных абразоў Найсвяцейшай Дзевы Марыі. У Будславе знаходзіцца наш галоўны нацыянальны санктуарый, прысвечаны Найсвяцейшай Дзеве Марыі.

*Можна з дапамогаю праектара паказаць прэзентацыю «Цудатворныя абразы Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Беларусі».*

Па Божай волі з гэтых месцаў, асвечаных прысутнасцю Найсвяцейшай Дзевы Марыі, сыходзіць асаблівая ласка, якая сведчыць пра Яе малітву за нас. Малітвы, якія пілігрымы з верай узносяць праз заступніцтва Маці Божай, выслуханыя Панам Богам. Многія пілігрымы даюць сведчанні пра цуды, якія ўчыніў Пан Бог у іх жыцці праз заступніцтва Найсвяцейшай Дзевы Марыі.

Пілігрымка — гэта наведванне святых месцаў, г.зн. месцаў жыцця і аб’яўленняў Пана Езуса Хрыста, Найсвяцейшай Дзевы Марыі, Апосталаў і найбольш шанаваных святых.

*Катэхет прапануе вучням на падставе малітвы «Тваёй абароне» напісаць, што для нас чыніць Найсвяцейшая Дзева Марыя (заданне ў сшытку № 5).*




*Вучні прадстаўляюць свае адказы на форум.*

*На ватмане ці на дошцы, у залежнасці ад тэхнічных магчымасцяў, намаляваць абраз «Пакроў Маці Божай». Катэхет прапануе вучням намаляваць сябе пад пакровам Марыі.*

**Разважанне**

*Катэхет задае вучням пытанні:*

— Кім для мяне з’яўляецца Марыя?

— Як часта я прашу заступніцтва Марыі ў сваім жыцці?

— У якіх выпадках я прашу ў Яе дапамогі?

— Ці ўдзячны я Езусу за тое, што Ён даў мне Марыю за Маці?

— Чаму я магу навучыцца ў Марыі?

— Што я магу зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з Ім?

**Пастанова**

*Катэхет прапануе дзецям запісаць пастанову ў сшытак.*

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям’і і сябрам пра звеставанне Найсвяцейшай Дзеве Марыі і пра тое, як Езус даў нам Марыю за Маці.

— Апішы выпадак з жыцця, у якім Найсвяцейшая Дзева Марыя прыходзіла з канкрэтнай дапамогай да людзей, што аддаваліся Яе заступніцтву. Можна знайсці гэтыя выпадкі ў інтэрнэце ці ў рэлігійных часопісах.

**Заключная малітва**

Ларэтанская літанія ці песня, прысвечаная Найсвяцейшай Панне Марыі (песні ў падручніку).

## Тэма 2. Уцелаўленне Езуса Хрыста

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з біблійнымі гісторыямі, якія звязаныя з падзеямі нараджэння Езуса Хрыста; дапамагчы вучням зразумець, што Езус — абяцаны Месія, Сын Божы, які ўцелавіўся для нашага збаўлення.

**Выхаваўчая мэта:**

фарміраваць у вучняў пачуццё ўдзячнасці да Бога за нараджэнне Езуса Хрыста; дапамагчы вучням прымаць Езуса як абяцанага Богам Месію — сапраўднага і адзінага Збаўцу свету.

**Матэрыялы:**

Біблія: Лк 2, 1–20. 22–24, 36–40; Мц 2, 1–9, 12–18; Лк 2, 22–35; Мц 2, 1–12.

Ілюстрацыі: «Божае Нараджэнне», «Пакланенне мудрацоў» і «Ахвяравание Езуса ў святыні».

Надпісы: «І сказаў ім анёл: „Не бойцеся, я абвяшчаю вам вялікую радасць, якая будзе для ўсяго народу, бо нарадзіўся вам сёння ў горадзе Давіда Збаўца, якім ёсць Хрыстус Пан“» (Лк 2, 10–11); «Упаўшы, пакланіліся Яму і, адчыніўшы скарбніцы свае, ахвяравалі яму дары: золата, кадзіла і міра» (Мц 2, 11); «Вочы мае ўбачылі збаўленне Тваё, якое падрыхтаваў Ты перад абліччам усіх народаў» (Лк 2, 30–31).

Фрагменты з фільма, звязаныя з падзеямі Божага Нараджэння і ахвяравання Езуса Хрыста ў святыні.

Касцюмы біблійных персанажаў.

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразом, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Біблii, прагляд фрагмента з фільма, інсцэніроўка-перадача, дыялог, медытацыя- разважанне.

### Ход занятку

**Малітва**

Апостальскі сімвал веры

**Праверка хатняга задання**

*Вучні апісваюць выпадкі з жыцця, у якіх Найсвяцейшая Дзева Марыя прыходзіла з канкрэтнай дапамогай да людзей, што аддаваліся Яе заступніцтву. Гэтыя гісторыі можна знайсці ў інтэрнэце ці ў рэлігійных часопісах. Падчас паўтарэння хатняга задання можна карыстацца крыжаванкамі, змешчанымі ў канцы сшытка (крыжаванка № 1).*

**Чалавек пытаецца**

Уявіце сабе, што ўвесь свет у вас як на далоні. Вы бачыце і чуеце ўсё, што адбываецца ў свеце. Вы бачыце дабрыню і любоў, шчырасць і разуменне, радасць і веру. Але вы таксама бачыце несправядлівасць і зло, войны і забойствы, чуеце праклёны і словы нянавісці. Што вы адчуваеце, калі ўсё гэта чуеце і бачыце? Што вы хочаце зрабіць?

*Вучні дзеляцца сваімі думкамі.*

**Бог адказвае**

Пасля таго, як чалавек учыніў першародны грэх і зло ўвайшло ў жыццё чалавека, лёс чалавека трагічна змяніўся. Але Бог не пакінуў чалавека. Ён знайшоў спосаб яго выратавання. Бог паслаў Свайго адзінага і любімага Сына, каб збавіць чалавецтва.

*Катэхет вешае на дошку тры ілюстрацыі:* «Божае Нараджэнне», «Пакланенне мудрацоў» і «Ахвяраванне Езуса ў святыні», а таксама надпісы: «І сказаў ім анёл: „Не бойцеся, я абвяшчаю вам вялікую радасць, якая будзе для ўсяго народу, бо нарадзіўся вам сёння ў горадзе Давіда Збаўца, які ёсць Хрыстус Пан“» (Лк 2, 10–11); «Упаўшы, пакланіліся Яму і, адчыніўшы скарбніцы свае, ахвяравалі яму дары: золата, кадзіла і міра» (Мц 2, 11); «Вочы мае ўбачылі збаўленне Тваё, якое падрыхтаваў Ты перад абліччам усіх народаў» (Лк 2, 30–31).

Паслухайце, як гэтая падзея апісваецца ў Святым Пісаннеі. *Катэхет дае вучням магчымасць праслухаць аўдыёзапіс біблійных тэкстаў: Мц 2, 1–18; Лк 2, 22–40.*

*Можна паказаць фрагменты з фільма, звязаныя з падзеямі Божага Нараджэння і ахвяравання Езуса Хрыста ў святыні (звярніце ўвагу на тое, каб фрагмент дакладна адлюстроўваў біблійны сюжэт).*

*Катэхет прапаноўвае вучням стварыць перадачу: «Божае Нараджэнне вачамі відавочцаў».*

На перадачу запрашаем галоўных сведкаў нараджэння Езуса Хрыста.

Ролі:

Вядучы – катэхет

Марыя з Немаўлём

Юзаф

Пастухі

Каспар

Мельхіёр

Бальтазар

Сімяон

Ганна

Ірад

*Катэхет дзеліць ролі паміж вучнямі і прапаноўвае ім атаясаміць сябе з біблійнымі персанажамі. Для гэтага вучні самастойна працуюць з тэкстамі Святога Пісання і рыхтуюць адказы на пытанні (у сшытку — заданне № 1).*

Пытанні для мудрацоў (Мц 2, 1–12):

— Вы надзвычай мудрыя і багатыя людзі. Што прымусіла вас пакінуць родныя мясціны і адправіцца ў далёкі і небяспечны шлях?

— Ці праўда, што вы ішлі за зоркай?

— Чаму вы шукалі нованароджанага Езуса ў палацы?

— Якое ўражанне засталося ў вас пасля сустрэчы з Ірадам?

— Куды вас прывяла зорка? Што вы там убачылі? Якія пачуцці выклікала ў вас месца, у якім нарадзілася Немаўля?

— Што вы падарылі Немаўляці? Што сімвалізуюць вашы дары?

— Як Юзаф і Марыя адрэагавалі на ваша з’яўленне?

— Як змянілася ваша жыццё пасля сустрэчы з Немаўлём?

Пытанні для пастухоў (Лк 2, 1–20):

— Ці лёгка вам ноччу сцерагчы авечак?

— Раскажыце, калі ласка, падрабязней пра гэту цудоўную ноч. Каго вы бачылі і што вы пачулі?

— Што абазначаюць пачутыя словы? Што вы зрабілі пасля гэтай сустрэчы?

— Дзе вы знайшлі Езуса?

— Што вы можаце сказаць пра ўмовы, у якіх нарадзіўся Езус?

— Як адрэагавалі Юзаф і Марыя, убачыўшы вас у пячоры?

— Як вы прывіталі Немаўля?

— Якія змены адбыліся ў вашым жыцці пасля сустрэчы з Немаўлём?

Пытанні для Ірада (Мц 2, 1–9. 12–18):

— Што Вы адчулі, калі мудрацы прыйшлі ў Ваш палац шукаць нованароджанага Караля?

— Чаму Вы спалохаліся Немаўляці? Няўжо ад Яго сыходзіла рэальная пагроза для Вас?

— Чаму Вы загадалі забіць нованароджаных, бязвінных дзяцей?

— Што Вы адчувалі, калі жаўнеры, выконваючы Ваш загад, без шкадавання забівалі безабаронных дзяцей?

— Як змянілася Ваша жыццё пасля таго, як Вы зрабілі ўсё, каб загубіць Немаўля?

Пытанні для Сімяона (Лк 2, 22–35):

— Раскажыце, калі ласка, пра сябе. Хто Вы? У якім горадзе жывяце?

— Што Вы рабілі ў святыні ў той дзень, калі Немаўля прынеслі, каб ахвяраваць Яго Пану?

— Як Вы зразумелі, што менавіта гэты Нованароджаны з'яўляецца Месіяй?

— Што Вы зрабілі, пазнаўшы Езуса?

— Што Вы адчувалі, калі абдымалі Немаўля?

— Што Вы Яму сказалі?

— Што Вы сказалі Марыі?

— Што азначаюць Вашы словы: «Праз Тваю душу пройдзе меч, каб выявіліся думкі многіх сэрцаў»?

— Як змянілася Ваша жыццё пасля сустрэчы з Боскім Немаўлём?

<u>Пытанні для Ганны</u> (Лк 2, 22–24. 36–40):

— Раскажыце, калі ласка, пра сябе. Хто Вы? У якім горадзе жывяце?

— Што Вы рабілі ў святыні ў той дзень, калі Немаўля прынеслі, каб ахвяраваць Яго Пану?

— Як змянілася Ваша жыццё пасля сустрэчы з Боскім Немаўлём?

*Катэхет праводзіць перадачу. Можна зняць яе на відэа, выбраўшы папярэдне рэжысёра…*

*Вучні дзеляцца сваімі ўражаннямі ад удзелу ў перадачы.*

**Чалавек адказвае Богу**

Уяві сабе, што ты апынуўся ў той самай пячоры, у якой толькі што нарадзіўся Езус. Паспрабуй акунуцца ў гэтую атмасферу. Сціплы, ўбогі хлеў, вакол шмат сена. У хляве ціха адпачываюць жывёлы: асёл, карова з цялём і пара авечак. На сене ляжыць Марыя, Яна стамілася, але адначасова Яна выглядае самай шчаслівай Жанчынай на зямлі. Яна не можа адвесці вачэй ад свайго Немаўляці. Юзаф таксама шчаслівы, ён рады, што, нягледзячы на ўсе цяжкасці з Божай дапамогай усё атрымалася. Што ты адчуваеш, калі глядзіш на Святую Сям'ю? Ты нясмела падыходзіш да Марыі, кленчыш і глядзіш на Немаўля, якое нараджаецца і ў тваім сэрцы. Што ты хочаш сказаць Марыі і Юзафу? Марыя прапануе табе ўзяць Езуса ў свае абдымкі, Юзаф дапамагае табе, асцярожна і пяшчотна перадае табе Езуса. Што ты адчуваеш, прытуляючы Езуса? Што ты Яму хочаш сказаць? Пабудзь з Немаўлём…

Чаму ты навучыўся ад Святой Сям'і ў цішы ўбогага хлява, які на гэты часператварыўся ў сэрца сусвету, бо ў жолабе ляжыць Валадар Валадароў, Божы Сын — Збаўца свету — Езус Хрыстус. Ён нарадзіўся для цябе…

*Вучні дзеляцца вынікамі сваёй медытацыі.*

**Развважанне**

*Катэхет задае вучням пытанні:*

— Ці ўдзячны ты Богу Айцу за нараджэнне Езуса Хрыста?

— Анёлы абвясцілі пастухам радасную вестку пра нараджэнне Езуса Хрыста. Для каго ты можаш стаць анёлам, які прыносіць добрую вестку пра нараджэнне Збаўцы?

— Бэтлеемская зорка вяла мудрацоў да Езуса. Як ты можаш прывесці сваіх родных, сяброў і аднагодкаў да Езуса?

— Што ты хочаш падарыць нованароджанаму Езусу?

— Што ты можаш і хочаш зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з Ім?

**Пастанова**

*Катэхет прапануе запісаць пастанову ў сшытак.*

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям'і і сябрам біблійныя гісторыі, звязаныя з абставінамі нараджэння Езуса Хрыста.

— Пастарайся быць для сваіх родных, сяброў і аднагодкаў «анёлам» і «зоркай», якія заўсёды вядуць да Езуса.

**Заключная малітва**

Урывак з Літаніі да Найсвяцейшага Імені Езус.

## Тэма 3. Што Езус Хрыстус сказаў нам пра Бога Айца?

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з тым, што ў Святым Пісанні Езус гаворыць пра Айца; дапамагчы вучням зразумець, што Айцец для Езуса быў усім у літаральным сэнсе гэтага слова.

**Выхаваўчая мэта:**

фарміраваць у вучняў імкненне пазнаваць і любіць свайго Нябеснага Айца, а таксама выконваць Яго Волю.

**Матэрыялы:**

Біблія: Мц 6, 26–33; Мц 7, 7–11; Лк 12, 6–7; Мц 5, 48; Лк 6, 36; Ян 3, 16–17; Ян 5, 19; Ян 10, 30; Ян 14, 31; Ян 5, 30; Ян 4, 34; Ян 3, 35; Ян 6, 32; Ян 16, 27.

Ілюстрацыя: «Найсвяцейшая Тройца».

Надпісы: «Я і Айцец — адно» (Ян 10, 30); «Ежа Мая ў тым, каб выконваць волю таго, хто паслаў Мяне, і завяршыць Яго справу» (Ян 4, 34); «Будзьце міласэрнымі, як і Айцец ваш міласэрны» (Лк 6, 36).

Фрагмент з фільма пра жыццё Езуса Хрыста, у якім Ён кажа пра Айца. Відэаролік «Сапраўдны тата».

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразом, асацыяцыі, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагмента з фільма, дыялог, пісьмовая праца на падставе тэксту, праца ў групах, разважанне над словам Божым.

### Ход занятку

**Малітва**

Ойча наш

**Праверка хатняга задання**

*Вучні дзеляцца сваімі ўражаннямі ад таго, як у іх атрымалася выканаць місію «анёла» і «зоркі».*

*Калі перадача «Божае нараджэнне вачамі відавочцаў» здымалася на відэа, можна паглядзець яе разам з вучнямі.*

*Падчас паўтарэння хатняга задання можна карыстацца крыжаванкамі, змешчанымі ў канцы сшытка (крыжаванка № 2).*

**Чалавек пытаецца**

*Катэхет паказвае вучням відэаролік «Сапраўдны тата» і прапаноўвае вучням апісаць рысы добрага, сапраўднага таты і паразважаць пра яго ролю ў жыцці дзіцяці (заданне ў сшытку № 1). Вучні дзеляцца сваімі адказамі.*

*Катэхет задае вучням пытанне (заданне ў сшытку № 2):* чаму мы можам назваць Бога сапраўдным і добрым Айцом?

**Бог адказвае**

На падставе біблійных тэкстаў сёння мы з вамі даведаемся, кім з’яўляецца для Езуса Бог Айцец.

*Катэхет вешае на дошку ілюстрацыю «Найсвяцейшая Тройца» і надпісы: «Я і Айцец – адно» (Ян 10, 30); «Ежа Мая ў тым, каб выконваць волю таго, хто паслаў Мяне, і завяршыць Яго справу» (Ян 4, 34); «Будзьце міласэрнымі, як і Айцец ваш міласэрны» (Лк 6, 36). Можна паказаць фрагмент з фільма пра жыццё Езуса Хрыста, у якім Ён гаворыць пра Айца.*

*Катэхет прапаноўвае вучням прачытаць выказванні Езуса, у якіх Ён гаворыць пра свайго Айца.*

Бо так палюбіў Бог свет, што аддаў Сына свайго Адзінароднага, каб кожны, хто верыць у Яго, не загінуў, але меў жыццё вечнае. Бо не паслаў Бог Сына свайго ў свет, каб судзіць свет, але каб свет быў збаўлены праз Яго (Ян 3, 16–17).

Не можа Сын рабіць сам ад сябе нічога, калі б не бачыў Айца, які робіць. Бо што робіць Ён, тое і Сын робіць таксама (Ян 5, 19).

Я і Айцец — адно (Ян 10, 30).

Але каб свет ведаў, што Я люблю Айца і раблю так, як наказаў Мне Айцец (Ян 14, 31).

Я не шукаю сваёй волі, але волі таго, хто паслаў Мяне (Ян 5, 30).

Ежа Мая ў тым, каб выконваць волю таго, хто паслаў Мяне, і завяршыць Яго справу (Ян 4, 34).

Айцец любіць Сына і ўсё аддаў у рукі Ягоныя (Ян 3, 35)

Айцец Мой дае вам сапраўдны хлеб з неба (Ян 6, 32).

Сам Айцец любіць вас, бо вы Мяне палюбілі і паверылі, што Я выйшаў ад Бога (Ян 16, 27).

Паглядзіце на птушак нябесных: яны ні сеюць, ні жнуць, ні збіраюць у засекі, і Айцец ваш Нябесны корміць іх. Ці ж вы не больш вартыя за іх? І хто

з вас, турбуючыся, можа дадаць да свайго росту хоць адзін локаць? І аб вопратцы навошта турбуецеся? Паглядзіце на палявыя лілеі, як яны растуць: ні працуюць, ні прадуць. Кажу вам, што нават Саламон ва ўсёй славе сваёй не апранаўся так, як адна з іх. Калі ж палявую траву, якая сёння ёсць, а заўтра будзе кінута ў печ, Бог так апранае, ці не намнога больш вас, малаверныя? Таму не турбуйцеся і не кажыце: «Што нам есці?» або: «Што піць?», або: «У што апрануцца?» Бо ўсяго гэтага шукаюць язычнікі. А ваш Айцец Нябесны ведае, што вы маеце патрэбу ва ўсім гэтым. Шукайце найперш Валадарства Божага і справядлівасці Ягонай, а гэта ўсё дадасца вам (Мц 6, 26–33).

Прасіце, і будзе дадзена вам; шукайце, і знойдзеце; стукайце, і адчыняць вам. Бо кожны, хто просіць, атрымлівае; і хто шукае, знаходзіць; і хто стукае, таму будзе адчынена. Ці ёсць сярод вас чалавек, які, калі сын ягоны папросіць у яго хлеба, дасць яму камень? Або калі папросіць у яго рыбы, дасць яму змяю? Калі ж вы, будучы благімі, ведаеце, як даваць дзецям вашым добрыя дары, тым больш Айцец ваш, які ў нябёсах, дасць добрае тым, хто просіць у Яго (Мц 7, 7–11).

Ці ж не пяць вераб’ёў прадаецца за два асы? І ніводзін з іх не забыты перад Богам. А ў вас і валасы на галаве ўсе палічаны. Не бойцеся, вы вартыя больш за мноства вераб’ёў (Лк 12, 6–7).

Будзьце міласэрнымі, як і Айцец ваш міласэрны (Лк 6, 36).

Будзьце дасканалымі, як дасканалы Айцец ваш Нябесны (Мц 5, 48).

*Катэхет дзеліць вучняў на 2 групы і раздае ўрыўкі з Бібліі (заданне ў сшытку № 3):*

І група

Прачытай выказванні Езуса пра Айца і напішы, хто для Езуса Бог Айцец.

*Вучням раздаюцца карткі з наступнымі фрагментамі: Ян 3, 16-17; Ян 5, 19; Ян 10, 30; Ян 14, 31; Ян 5, 30; Ян 4, 34; Ян 3, 35; Ян 6, 32; Ян 16, 27.*

ІІ група

Прачытай біблійныя тэксты: Мц 6, 26–33; Мц 7, 7–11; Лк 12, 6–7 і напішы, што ў іх гаворыцца пра Нябеснага Айца *(заданне ў сшытку № 4).*

*Вучні дзеляцца сваімі адказамі.*

*Катэхет задае вучням пытанні:*

— Якое выказванне Езуса пра Айца было для вас новым і раней не вядомым?

— Якое выказванне Езуса вам больш за ўсё запомнілася і спадабалася?

**Чалавек адказвае Богу**

*Катэхет прапаноўвае вучням раздзяліцца на пары і ўзяць адзін у аднаго інтэрв'ю на тэму «Твой Нябесны Айцец — які Ён?» (заданне ў сшытку № 5). Вучні дзеляцца сваёй творчасцю.*

*Катэхет прапаноўвае вучням пісьмова адказаць на пытанне (заданне ў сшытку № 6):*

Як ты разумееш наступныя выказванні Езуса?

— Будзьце міласэрнымі, як і Айцец ваш міласэрны (Лк 6, 36).

— Будзьце дасканалымі, як дасканалы Айцец ваш Нябесны (Мц 5, 48).

Як вы можаце рэалізаваць гэтыя словы у паўсядзённым жыцці? *(заданне ў сшытку № 7).*

*Вучні дзеляцца сваімі адказамі.*

**Разважанне**

*Катэхет задае вучням пытанні:*

— Што мой Нябесны Айцец робіць для мяне?

— Ці ўдзячны я Яму? У чым гэта праяўляецца?

— Чым я падобны да майго Нябеснага Айца?

— Ці добры я сын для Нябеснага Айца?

— Як я выконваю волю майго Нябеснага Айца? Ці паслухмяны я Яму?

— Што мне трэба зрабіць для таго, каб быць годным сынам/дачкою Нябеснага Айца?

— Чаму я навучыўся ад Езуса — Сына Божага?

— Што я магу і хачу зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з Ім?

**Пастанова**

*Катэхет прапануе дзецям запісаць пастанову ў сшытак.*

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям'і і сябрам пра тое, што Езус сказаў пра Нябеснага Айца.

— На падставе вывучанага матэрыялу падрыхтуй вуснае сачыненне на тэму «Твой Нябесны Айцец — які Ён?»

**Заключная малітва**

Уявіце, што вы бачыце Езуса Хрыста… Вы чуеце, як Ён звяртаецца да вас: «Не шукай волі сваёй, але волі твайго Нябеснага Айца…»

Не адгукайцеся… Проста слухайце, як Ён зноў і зноў паўтарае: «Не шукай волі сваёй, але волі твайго Нябеснага Айца…» Хай Яго словы пранізваюць вас, хай яны гучаць у вашым сэрцы…

Слухайце… Словы Езуса пабуджаюць вас адказаць Яму… Маўчыце да таго часу, пакуль вы не адчуеце, што ўжо не маеце моцы стрымлівацца, і тады адкажыце Пану так, як загадвае вам ваша сэрца.

## Тэма 4. Ян Хрысціцель — Божы пасланец

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з біблійным персанажам Янам Хрысціцелем; дапамагчы вучням зразумець, што сутнасць паклікання Яна Хрысціцеля заключаецца ў падрыхтоўцы ізраэльскага народа да прыйсця Езуса Хрыста.

**Выхаваўчая мэта:**

фарміраваць у вучняў імкненне рыхтаваць дарогі Пану.

**Матэрыялы:**

Біблія: Лк 1, 5–20. 24. 57–64. 66. 80; Мк 1, 1–8; Ян 1, 19–37.

Ілюстрацыі, прысвечаныя падзеям з жыцця Яна Хрысціцеля.

Надпісы: «Падрыхтуйце дарогу Пану, простымі рабіце сцежкі Яму» (Мк 1, 3); «Вось Баранак Божы, які бярэ на сябе грэх свету» (Ян 1, 29).

Фрагменты з фільма пра жыццё Яна Хрысціцеля.

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразом, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагмента з фільма, дыялог, пісьмовая праца на падставе тэксту, праца ў парах, праца ў групах, стварэнне фільма, дыскусія.

### Ход занятку

**Малітва**

Малітва да Анёла Ахоўніка

**Праверка хатняга задання**

*Вучні дзеляцца сваёй творчасцю — вусным сачыненнем на тэму «Твой Нябесны Айцец — які Ён?»*

*Падчас паўтарэння хатняга задання можна карыстацца крыжаванкамі, змешчанымі ў канцы сшытка (крыжаванка № 3).*

**Чалавек пытаецца**

*Катэхет піша на дошцы пытанне:*

Хто і якія заданні можа даваць вам і вашым аднагодкам?

*Сваімі разважаннямі дзеці дзеляцца з суседзямі па парце. Пры жаданні дзеці могуць падзяліцца сваімі разважаннямі з усімі.*

*Катэхет працягвае:*

На працягу ўсяго жыцця чалавек атрымлівае розныя заданні, якія ён павінен выканаць, ад розных людзей. Сярод тых, ад каго мы атрымліваем заданні, ёсць і Пан Бог. Заданні, якія мы атрымліваем ад Пана Бога, часам

вырашальна ўплываюць не толькі на нашу працу, але і на наша пакліканне — стыль жыцця.

**Бог адказвае**

Сёння мы з вамі даведаемся вельмі шмат цікавага з жыцця Яна Хрысціцеля, Божага пасланца.

*Катэхет вешае на дошку ілюстрацыі, прысвечаныя падзеям з жыцця Яна Хрысціцеля, а таксама надпісы: «Падрыхтуйце дарогу Пану, простымі рабіце сцежкі Яму» (Мк 1, 3); «Вось Баранак Божы, які бярэ на сябе грэх свету» (Ян 1, 29).*

*Катэхет дае вучням магчымасць праслухаць аўдыёзапіс біблійных тэкстаў: Лк 1, 5–20. 24. 57–64. 66. 80; Мк 1, 1–8; Ян 1, 19–37.*

*Можна паказаць фрагменты з фільма пра жыццё Яна Хрысціцеля (звярніце ўвагу на тое, каб фрагмент дакладна адлюстроўваў біблійны сюжэт).*

*Катэхет дзеліць вучняў на дзве групы і прапаноўвае ім самастойна папрацаваць з біблійнымі тэкстамі.*

I група

Уважліва прачытайце тэкст: Лк 1, 5–20. 24. 57–64. 66. 80 і адкажыце на пытанні:

— Кім былі бацькі Яна Хрысціцеля?

— З якога асяроддзя яны паходзілі?

— Кім будзе Ян Хрысціцель?

— Якое заданне ён выканае?

— Чаму Захарыя папрасіў у анёла знаку?

— Як трэба разумець імя Ян?

II група

Уважліва прачытайце тэксты: Мк 1, 1–8; Ян 1, 19–37 і адкажыце на пытанні:

— Які лад жыцця вёў Ян?

— Што Ян гаварыў пра сябе людзям, якія пыталіся ў яго пра гэта? Што гэтыя словы кажуць пра Яна?

— Што абвяшчаў Ян Хрысціцель?

— Што Ян казаў пра Езуса?

— Чаму вучні Яна пайшлі за Баранкам Божым?

*Вучні прадстаўляюць свае адказы на форум.*

**Чалавек адказвае Богу**

Святы Ян Хрысціцель сваімі словамі і ўчынкамі паказваў на Езуса Хрыста. Дзякуючы гэтаму людзі распазналі ў Езусе Месію і ішлі за Ім. Сёння Езус заклікае цябе, каб ты стаў для сваіх бліжніх Божым пасланцам, які словамі і ўчынкамі паказвае бліжнім на Езуса і дапамагае ім ісці за Збаўцам.

Напішы, як ты разумееш выраз: «Я — Божы пасланец»

*Катэхет:*

Мы хочам зняць фільм пра наша жыццё. Назва будучай стужкі гучыць так: **«Мы — Божыя пасланцы».** На падставе нашага жыцця напішам сцэнар да фільма. Неабходна намаляваць эскізы або зрабіць кароткія інсцэніроўкі да фільма.

Спачатку на таблічках трэба напісаць: месца дзеяння, удзельнікі падзеі, сама падзея і дыялог.




*Па магчымасці зняць фільм.*

**Разважанне**

Катэхет задае вучням пытанні:

— Ці паказваю я бліжнім сваёй жыццёвай пазіцыяй, словамі і ўчынкамі Езуса Хрыста?

— У чым канкрэтна гэта выяўляецца?

— Калі, у якіх сітуацыях бліжнія, гледзячы на мяне, распазнаюць Езуса Хрыста і ідуць за ім?

— Чаму я навучыўся ад Яна Хрысціцеля?

— Што я магу і хачу зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з Ім?

**Пастанова**

*Катэхет:*

Пастанову запішыце ў сшытак.

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям'і і сябрам пра жыццё святога Яна Хрысціцеля.

— Кожны вечар задумвайся пра тое, праз якія твае словы і ўчынкі за апошні дзень твае бліжнія маглі распазнаць Хрыста і сустрэцца з Ім?

**Заключная малітва**

Песня Захарыі

Благаслаўлёны Пан, Бог Ізраэля,
бо наведаў і адкупіў народ свой,
і ўзняў моц збаўлення для нас
у доме Давіда, слугі свайго.
Як абвясціў чалавеку
вуснамі сваіх святых пракрокаў,
што збавіць нас ад ворагаў нашых
і ад рук усіх, хто нас ненавідзіць.
Каб праявіць міласэрнасць да айцоў нашых
і нагадаць пра святы запавет свой.
Прысягу, якую даў Абрагаму, айцу нашаму,
дасць нам.
Каб, выбаўленыя з рук ворагаў,
мы без страху служылі Яму
ў святасці і справядлівасці перад Ім
ва ўсе дні нашыя.
А ты, дзіцятка, пракрокам Найвышэйшага
будзеш названа,
бо пойдзеш прад абліччам Пана
падрыхтаваць шляхі Яму,
каб даць народу Ягонаму пазнаць збаўленне
праз адпушчэнне яго грахоў,
дзякуючы сардэчнай міласэрнасці нашага Бога,
у якой наведаў нас Усход з вышыні;
каб асвятліць тых,
хто сядзіць у цемры і ў цені смяротным;
каб накіраваць ногі нашыя
на шлях спакою.
Хвала Айцу і Сыну,
і Духу Святому.
Як была спрадвеку, цяпер і заўсёды,
і на векі вечныя. Амэн.

(Літургія гадзінаў. Том I. – Мінск, 2012. – С. 595–596).

## Тэма 5. Езус — умілаваны Сын Божы

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з біблійнай гісторыяй пра хрост Езуса Хрыста; дапамагчы вучням зразумець, што праз хрост Езуса ў Ярдане Бог Айцец адкрыў нам праўду пра тое, што Езус Хрыстус з'яўляецца Яго ўмілаваным Сынам.

**Выхаваўчая мэта:**

фарміраваць у вучняў пачуццё ўдзячнасці за сакрамэнт хросту; дапамагчы вучням глыбей асэнсаваць, што значыць быць Божым дзіцём.

**Матэрыялы:**

Біблія: Мц 3, 13–17.

Ілюстрацыя «Хрост Езуса Хрыста».

Надпіс: «Гэта Сын Мой умілаваны, якога Я ўпадабаў» (Мц 3, 17).

Фрагменты з фільма, якія дакладна адлюстроўваюць сюжэт пра Хрост Езуса Хрыста.

Тэкст, які вучні чытаюць па ролях.

Каляровая папера фармату А6, крэйда, фламастары і алоўкі.

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразом, асацыяцыі, чытанне тэксту па ролях, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагмента з фільма, дыялог, пісьмовая праца на падставе тэксту, творчая майстэрня «Робім паштоўкі».

### Ход занятку

**Малітва**

Праслаўленне Найсвяцейшай Тройцы

**Праверка хатняга задання**

*Вучні дзеляцца сваімі словамі і ўчынкамі, якія за апошні тыдзень дапамаглі бліжнім распазнаць Хрыста і сустрэцца з Ім.*

*Падчас паўтарэння хатняга задання можна карыстацца крыжаванкамі, змешчанымі ў канцы сшытка (крыжаванка № 4).*

**Чалавек пытаецца**

*Катэхет пытаецца ў вучняў (заданне ў сшытку № 1):*

— Што абазначае слова «Сын»?

*Катэхет піша на дошцы выраз «Божы Сын» і пытаецца ў вучняў:*

— Як вы разумееце выраз «Божы Сын»?

*Свае адказы вучні запісваюць на дошцы.*

**Бог адказвае**

Пан Бог аб’явіў свайму народу, што Езус з’яўляецца Яго ўмілаваным Сынам — Хрыстом, абяцаным Збаўцам — Месіяй, які збавіць нас ад грахоў.

*Катэхет вешае на дошку ілюстрацыю «Хрост Езуса Хрыста» і надпіс: «Гэта Сын Мой умілаваны, якога Я ўпадабаў» (Мц 3, 17).*

*Можна паказаць фрагменты з фільма пра Хрост Езуса (звярніце ўвагу на тое, каб фрагмент дакладна адлюстроўваў біблійны сюжэт).*

Катэхет выбірае двух вучняў, каб яны па ролях прачыталі тэкст з Бібліі (Мц 3, 13–17). Для гэтага спачатку катэхет прапаноўвае вучням у цішыні прачытаць тэкст пра сябе. Запальвае свечку, вучні ўстаюць і па ролях чытаюць фрагмент са Святога Пісання.

**<u>Аўтар:</u>** Тады Езус прыйшоў з Галілеі на Ярдан да Яна, каб атрымаць ад яго хрост. Ян стрымліваў Яго, кажучы:

**<u>Ян:</u>** Гэта мне трэба прымаць хрост ад Цябе, а Ты прыходзіш да мяне?

**<u>Аўтар:</u>** Але Езус сказаў яму ў адказ:

**<u>Езус:</u>** Дазволь цяпер, бо так належыць нам выканаць усё, што справядліва.

**<u>Аўтар:</u>** Тады Ян дазволіў Яму. Калі Езус ахрысціўся, адразу выйшаў з вады. І вось раскрыліся Яму нябёсы, і ўбачыў Духа Божага, які спускаўся, як голуб, і сыходзіў на Яго. І вось голас з нябёсаў прамовіў:

**<u>Голас з нябёсаў (чытае катэхет):</u>** Гэта Сын Мой умілаваны, якога Я ўпадабаў.

*Катэхет прапаноўвае вучням самастойна папрацаваць з тэкстам (заданне ў сшытку № 2).*

Знайдзі ў Бібліі фрагмент з Евангелля паводле Мацвея 3, 13–17 і ўпішы прапушчаныя словы.

Тады Езус прыйшоў з Галілеі на … да …, каб атрымаць ад яго хрост. стрымліваў Яго, кажучы: «Гэта мне трэба … ад Цябе, а Ты прыходзіш да мяне?» Але Езус сказаў яму ў адказ: «Дазволь цяпер, бо так належыць нам выканаць усё, што справядліва». Тады … дазволіў Яму. Калі Езус …, адразу выйшаў з вады. І вось раскрыліся Яму нябёсы, і ўбачыў …, які спускаўся, як голуб, і сыходзіў на Яго. І вось голас з нябёсаў прамовіў: «Гэта …, якога Я ўпадабаў».

*Катэхет задае вучням пытанні (заданне ў сшытку № 3):*

— Да каго Езус прыйшоў хрысціцца?

— На якой рацэ гэта адбылося?

— Чаму Ян Хрысціцель здзівіўся з таго, што Езус хоча прыняць ад яго хрост?

— Што адбылося пасля таго, як Езус выйшаў з вады?

— Хто адкрыў праўду пра тое, што Езус Хрыстус — Сын Божы?

— Як ты разумееш выразы «*Сын Мой умілаваны»* і *«Якога Я ўпадабаў»?*

**Чалавек адказвае Богу**

Хрост Езуса глыбока раскрывае сэнс нашага хросту. Дзякуючы гэтаму сакрамэнту мы сталі ўмілаванымі дзецьмі Божымі, членамі святога каталіцкага Касцёла.

Многія з нас не памятаюць свайго хросту, але мы можам цяпер заплюшчыць свае вочы і ў думках апынуцца на сваім хросце. Уявім сабе парафіяльны касцёл, куды прынеслі нас шчаслівыя бацькі, уявім нашых хросных бацькоў… Цяпер паспрабуем абудзіць ва ўяўленні ўрачысты момант хросту, калі святар называе наша імя і, вымаўляючы словы: «Я цябе хрышчу ў імя Айца і Сына, і Духа Святога. Амэн», тройчы палівае нашу галаву вадой. Паўтары гэтыя словы павольна пра сябе… Пан Бог стаў тваім нябесным Айцом, а ты стаў умілаваным Божым дзіцём.

Што ты пры гэтым адчуваеш?

*Вучні дзеляцца сваімі пачуццямі.*

*Катэхет прапаноўвае вучням зрабіць паштоўкі, якія будуць нагадваць пра тое, што мы любімыя Божыя дзеці. Вучні атрымліваюць каляровую паперу фармату А6 і робяць паштоўку са словамі: «N. (Імя вучня) — сын/дачка Мой/Мая умілаваны/-ая, якога/-ую Я ўпадабаў». Вучні ўпрыгожваюць паштоўкі. Адбываецца прэзентацыя паштовак.*

**Разважанне**

*Катэхет задае вучням пытанні:*

— Ці памятаеш ты дату свайго хросту?

— Ці ўдзячны ты Богу за дар Хросту і веры? У чым гэта праяўляецца?

— Якія твае ўчынкі кажуць пра тое, што ты — любімае Божае дзіця?

— Якія твае думкі, словы і ўчынкі аддаляюць цябе ад Бога?

— Што ты можаш і хочаш зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з Ім?

**Пастанова**

*Катэхет:*

Пастанову запішыце ў сшытак.

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям’і і сябрам пра хрост Езуса Хрыста.

— Зрабі паштоўку са словамі: «N. (Імя сябра/сяброўкі) — сын/дачка Мой/Мая умілаваны/-ая, якога/-ую Я ўпадабаў» і падары яе свайму сябру ці сяброўцы, якія забыліся пра тое, што праз таямніцу хросту яны сталі дзецьмі Пана Бога.

**Заключная малітва**
Спеў

## Тэма 6. Езус змагаецца са злом

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з біблійнай гісторыяй пра выпрабаванне Хрыста; дапамагчы вучням зразумець, што Езус перамагае спакусы злога духа Божаю моцаю.

**Выхаваўча мэта:**

фарміраваць у вучняў імкненне супрацьстаяць спакусам злога духа моцаю Пана нашага Езуса Хрыста.

**Матэрыялы:**

Біблія: Лк 4, 1–13.

Ілюстрацыя «Выпрабаванне Езуса Хрыста».

Надпіс: «Не хлебам адным будзе жыць чалавек» (Лк 4, 4); «Пану Богу твайму будзеш пакланяцца і Яму аднаму будзеш служыць» (Лк 4, 8); «Не будзеш выпрабоўваць Пана Бога твайго» (Лк 4, 12).

Фрагмент з фільма пра спакушэнне Езуса Хрыста.

Свечкі

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразом, інсцэніроўка, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагмента з фільма, дыялог, пісьмовая праца на аснове тэксту.

### Ход занятку

**Малітва**

Малітва да святога арханёла Міхала.

**Праверка хатняга задання**

*Вучні дзеляцца ўражаннямі ад падораных паштовак.*

*Пры паўтарэнні дамашняга задання можна карыстацца крыжаванкамі, змешчанымі ў канцы сшытка (крыжаванка № 5).*

**Чалавек пытаецца**

*Інсцэніроўку найлепш падрыхтаваць загадзя з вучнямі, але, калі няма такой магчымасці, можна заняцца ёю на ўроку.*

*Вучні паказваюць сцэнку «Злодзей» (яе можна сыграць у касцёле ў першую нядзелю Вялікага Посту)*

*Дзейныя асобы:* сатана (злодзей), два хлопцы і адна дзяўчына.

*Рэквізіт:* чорны касцюм для сатаны.

**Дзеянне**

*Чатыры чалавекі стаяць на адной лініі, спінамі да гледача. Першы з іх — Злодзей.*

**<u>Злодзей:</u>** (злосна смяецца). Прывітанне. Дазвольце мне прадставіцца. Мяне завуць Люцыфер, але некаторыя называюць мяне д’ябал. Паслухайце, я хачу вам расказаць невялікую гісторыю *(паварочвае тварам да гледачоў аднаго чалавека, які ўсміхаецца і штосьці піша).* Гэта Максім, ён вельмі старанны вучань: увесь час нешта вучыць, заўсёды выконвае хатнія заданні. Усё гэта працягвалася да таго часу, пакуль аднойчы я не сказаў яму *(гучна шэпча яму ў вуха):* «Гэй, навошта табе столькі часу траціць на школу? Гэта ж так сумна! Чаму б табе проста не забыцца пра гэта? Пайшоў бы павесяліўся». Такім чынам, ён закінуў урокі, падручнікі і пайшоў на дыскатэку, потым — на іншую. Ён швэндаўся без толку са сваімі сябрамі і так праводзіў час. Бацькі і настаўнікі спрабавалі пагаварыць з ім, але я сказаў яму: «Ды не слухай ты іх! Проста весяліся!» У выніку ён вельмі хутка заваліў экзамен, яго выгналі са школы, і цяпер ён проста бадзяецца па вуліцах – без адукацыі, жылля і працы. *(Злодзей піхае Максіма на зямлю і ён ляжыць там да канца драмы. Злодзей смяецца.)*

А вось Крысціна. Яна была вельмі прыкладнай дзяўчынкай, усе ўскладалі на яе агромністыя надзеі, пакуль я не дабраўся да яе. Я сказаў: «Слухай, Крысціна, на самай справе ты нічога з сябе не ўяўляеш, калі ў цябе няма хлопца». І ведаеце, што адбылося? Яна паверыла мне! Я сказаў: «Ідзі і гуляй, з кім хочаш. Сустракайся з кожным хлопцам. Ты будзеш вельмі крута выглядаць у вачах іншых!» Крысціна так і зрабіла, але ў рэшце рэшт ёй гэта надакучыла, ды і хлопцам яна абрыдла. Як вы думаеце, што здарылася потым? Яна стала адчуваць сябе брудная таннай рэччу, якой карысталіся ўсе, хто хацеў! *(Злодзей піхае Крысціну на зямлю і смяецца).* Мне падабаецца мая праца.

Гэтага хлопца завуць Андрэй. Ён быў вельмі добрым работнікам. Яму падабалася яго праца, яго начальнік ганарыўся ім. Я проста ненавіджу такое! І я сказаў яму: «Гэй, паглядзі на іншых хлопцаў, здаецца, яны праводзяць час лепш, чым ты». Такім чынам ён знайшоў сабе сяброў, з якімі выпіваў. Даволі хутка яму здалося, што выпіўкі недастаткова — ён пачаў курыць. Прайшоў яшчэ некаторы час, але гэтага таксама было мала. Андрэя перастала хваляваць уласная праца, а ўсё таму, што я яму сказаў: «Ды забудзься ты пра гэтую працу, у свеце ёсць столькі цудоўных заняткаў, таму забудзься! Займіся чым-небудзь больш складаным. Я ўпэўнены, гэта спадабаецца табе больш, чым твая папярэдняя праца». Так ён і зрабіў, цяпер у яго няма працы, яго жыццё не залежыць ад яго самога. Ён няўдачнік! *(Штурхае яго, той валіцца на зямлю).*

У Бібліі шмат гаворыцца пра мяне, там мяне называюць злодзеем: лічыцца, што я прыходжу, каб красці, забіваць і разбураць. Але няўжо гэта так? У мяне ёсць план для кожнага жыцця, і ў мяне ёсць план для вас (*смяецца і бяжыць са сцэны*).

*Катэхет задае пытанне вучням:*

— Што вы зразумелі з гэтай сцэнкі?

*Вучні дзеляцца сваімі разважаннямі.*

**Бог адказвае**

Сатана — самы галоўны вораг Бога і чалавека. З-за зайздрасці злога духа ў жыццё чалавека увайшлі грэх і смерць. Асноўная мэта д'ябла заключаецца ў тым, каб загубіць чалавека. У Святым Пісанні пра яго гаворыцца наступным чынам: «Злодзей прыходзіць дзеля таго, каб красці, забіваць і нішчыць» (Ян 10, 10). Сёння мы з вамі даведаемся пра тое, як Езус перамог спакусы злога духа ў пустыні.

*Катэхет вешае на дошку ілюстрацыю «Выпрабаванне Езуса Хрыста», а таксама надпісы: «Не хлебам адным будзе жыць чалавек» (Лк 4, 4); «Пану Богу твайму будзеш пакланяцца і Яму аднаму будзеш служыць» (Лк 4, 8); «Не будзеш выпрабоўваць Пана Бога твайго» (Лк 4, 12). Катэхет прапануе вучням праслухаць фрагмент аўдыёзапісу Бібліі: Лк 4, 1–13.*

*Можна паказаць фрагмент з фільма пра спакушэнне Езуса Хрыста (звярніце ўвагу на тое, каб фрагмент дакладна адлюстроўваў біблейскі сюжэт).*

**Фрагмент Евангелля паводле Лукі 4, 1–13**

Езус, напоўнены Духам Святым, вярнуўся з-над Ярдана, і вадзіў Яго Дух па пустыні сорак дзён, і д'ябал выпрабоўваў Яго. І нічога не еў у тыя дні, а калі яны скончыліся, згаладаўся. Тады д'ябал сказаў Яму: «Калі Ты Сын Божы, скажы гэтаму каменю, каб ён стаў хлебам». І адказаў яму Езус: «Напісана: „Не хлебам адным будзе жыць чалавек“». Тады д'ябал павёў Яго і паказаў Яму ў імгненне ўсе валадарствы свету. І сказаў Яму д'ябал: «Я дам Табе ўсю гэтую ўладу і славу іх, бо яна мне перададзена, і каму хачу, даю яе. Калі Ты паклонішся мне, уся будзе Тваёй». У адказ Езус сказаў яму: «Напісана: „Пану Богу твайму будзеш пакланяцца і Яму аднаму будзеш служыць“». Тады завёў Яго ў Ерузалем і паставіў на крыле святыні, і сказаў Яму: «Калі Ты Сын Божы, кінься адгэтуль уніз, бо напісана: «Анёлам сваім загадае пра Цябе, каб ахоўвалі Цябе» і: «Яны на руках панясуць Цябе, каб Ты часам не спатыкнуўся аб камень нагой сваёй“». І Езус сказаў яму ў адказ: «Сказана: „Не будзеш выпрабоўваць Пана Бога твайго“». Скончыўшы ўсе выпрабаванні, д'ябал адступіў ад Яго да пары.»

*Катэхет прапаноўвае вучням самастойна папрацаваць з тэкстам (заданне ў сшытку № 1).*

Сатана ў пустыні выпрабоўваў Езуса Хрыста. Што Езус адказаў злому духу? Адказы запішы ў табліцу. Можна карыстацца Святым Пісаннем: Лк 4, 1–13.

| Выпрабаванні | Адказы Езуса Хрыста |
|---|---|

| | |
|---|---|
| 1. «Калі Ты Сын Божы, скажы гэтаму каменю, каб ён стаў хлебам» (Лк 4, 3). | |
| 2. «Я дам Табе ўсю гэтую ўладу і славу іх, бо яна мне перададзена, і каму хачу, даю яе. Калі Ты паклонішся мне, уся будзе Тваёй» (Лк 4, 6). | |
| 3. «Калі Ты Сын Божы, кінься адгэтуль уніз, бо напісана: „Анёлам сваім загадае пра Цябе, каб ахоўвалі Цябе“ і „Яны на руках панясуць Цябе, каб Ты часам не спатыкнуўся аб камень нагой сваёй“». (Лк 4, 12) | |

*Катэхет задае вучням пытанні (заданне ў сшытку № 2):*

— Дзе знаходзіўся Езус Хрыстус?
— Што Езус рабіў у пустыні?
— Як доўга Езус быў у пустыні?
— Хто прыйшоў да Езуса?
— Да чаго ён падгаворваў Езуса?
— Што Езус яму адказаў?

Езус хоча, каб мы навучыліся змагацца са злом. Ён маліўся і пасціў на працягу 40 дзён. І даў нам прыклад таго, як мы можам перамагчы сатану.

**Чалавек адказвае Богу**

Людзі маюць розныя патрэбы: часам яны прагнуць супакоіць пачуццё голаду, часам жадаюць славы, улады ці багацця. Але слава, сыты страўнік і багацце не могуць замяніць нам тое, што з’яўляецца сэнсам жыцця кожнага чалавека: Бога і Яго неацэнны дар збаўлення.

Сатана не перастае дзейнічаць, ён увесь час спакушае кожнага з нас. Самае галоўнае — не паддавацца спакусе. Да гэтага нас заклікае Хрыстус: «Чувайце і маліцеся, каб не паддацца спакусе» (Мц 26, 41).

Напішы, як ты разумееш сэнс словаў Езуса: «Чувайце і маліцеся, каб не паддацца спакусе» (Мц 26, 41) — *заданне ў сшытку № 3. Свае адказы вучні запісваюць у сшытак.*

Ніхто на свеце, акрамя Езуса Хрыста, не можа выратаваць нас ад зла і збавіць ад нашых грахоў. Ён сам штодзённа дапамагае нам, каб мы не паддаваліся спакусе. Асабліва дзейсную сілу мае малітва, святыя сакрамэнты, удзел у святой Імшы, прыняцце святой Камуніі. Заўсёды можна прасіць дапамогі Езуса Хрыста, бо Ён перамог сатану.

З прыведзеных слоў выпішы тыя, якія адпавядаюць адказу на пытанне:
— Што нам дапамагае ў барацьбе са злым духам? *(заданне ў сшытку № 4)*

| | | |
|---|---|---|
| Вера ва ўласныя сілы | Малітва | Гараскопы |
| Варажба | Любоў | Перадача «Бітва экстрасэнсаў» |
| Амулеты | Чытанне Бібліі | Забабоны |
| Нянавісць | Сакрамэнт Эўхарыстыі | Прабачэнне |
| Дабрыня | Талісманы | Святое Пісанне |
| Прыкметы | Міласэрнасць | Вера ў Пана Бога |
| Сакрамэнт споведзі | Моц | Учынкі міласэрнасці |

**Разважанне**
*Катэхет задае вучням пытанні:*
— Чым часцей за ўсё спакушае цябе сатана?
— Як ты змагаешся са спакусамі?
— Што ты можаш і хочаш зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з ім?

**Пастанова**
*Катэхет:*
Пастанову запішыце ў сшытак.

**Хатняе заданне**
— Раскажы членам сваёй сям'і і сябрам пра выпрабаванне Езуса Хрыста.
— Напішы сваю малітву, у якой ты:
• дзякуеш Езусу Хрысту за тое, што Ён перамог сатану;
• просіш прабачэння за тое, што часам паддаешся спакусам;
• просіш дапамогі Езуса Хрыста ў барацьбе са злым духам.
— Маліся гэтай малітвай на працягу тыдня.

**Заключная малітва**
*Вучні запальваюць свечкі.*

У таямніцы хросту нашы бацькі і хросныя ад нашага імені адракліся ад зла і вызналі веру ў Бога. Цяпер давайце мы самі дабравольна і свядома адрачомся ад зла і вызнаем нашу веру.

*Катэхет:* Ці выракаецеся граху, каб жыць у свабодзе дзяцей Божых?

*Вучні:* Выракаюся.

*Катэхет:* Ці выракаецеся ўсяго, што вядзе да зла, каб грэх не панаваў над вамі?

*Вучні:* Выракаюся.

*Катэхет:* Ці выракаецеся сатаны — галоўнай прычыны граху?

*Вучні:* Выракаюся.

*Катэхет:* Ці верыце ў Бога Айца ўсемагутнага, Стварыцеля неба і зямлі?

*Вучні:* Веру.

*Катэхет:* Ці верыце ў Езуса Хрыста, Сына Яго адзінага, Пана нашага, народжанага з Дзевы Марыі, замучанага і пахаванага, які ўваскрос з памерлых і сядзіць праваруч Айца?

*Вучні:* Веру.

*Катэхет:* Ці верыце ў Духа Святога, святы Касцёл каталіцкі, еднасць святых, адпушчэнне грахоў, уваскрашэнне цела і жыццё вечнае?

*Вучні:* Веру.

*Катэхет:* Гэта наша вера. Гэта вера Касцёла, вызнаваць якую — наш гонар у Езусе Хрысце, Пану нашым.

*Усе:* Амэн.

## Тэма 7. Езус расказвае пра Нябеснае Валадарства

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з біблійнымі прыпавесцямі пра схаваны скарб у полі і пра каштоўную пярліну; дапамагчы вучням зразумець, што Нябеснае Валадарства — самае каштоўнае для чалавека, што быць у Нябесным Валадарстве азначае прымаць і выконваць волю Божую.

**Выхаваўчая мэта:**

фарміраваць у вучняў імкненне здабыць Нябеснае Валадарства, што азначае дазволіць Богу валадарыць ва ўсіх нашых думках, пачуццях і ўчынках.

**Матэрыялы:**

Біблія: Мц 13, 44–46, Мц 7, 21.

Ілюстрацыя з выявою чалавека, які разглядае знойдзеную пярліну, і з подпісам: «Валадарства Нябеснае падобнае да купца, які шукае прыгожых пярлін» (Мц 13, 45).

Ілюстрацыя з выявою чалавека, які знайшоў скарб у полі, і подпісам: «Валадарства Нябеснае падобнае да скарбу, схаванага ў полі» (Мц 13, 44).

Фрагмент з фільма, прысвечаны гэтым прыпавесцям.

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразом, інсцэніроўка, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагменту з фільма, дыялог, пісьмовая праца на аснове тэксту.

### Ход занятку

**Малітва**

Ойча наш

**Праверка хатняга задання**

*Вучні дзеляцца малітвамі, якія яны напісалі.*

*Пры паўтарэнні дамашняга задання можна карыстацца крыжаванкамі, змешчанымі ў канцы сшытка (крыжаванка № 6).*

**Чалавек пытаецца**

Давайце пагаворым з вамі пра тое, што самае галоўнае для ўрача, бацькоў, банкіра, настаўніка, спартсмена, паліцэйскага і г. д.

*Адказы вучняў запісваюцца на дошцы. Напрыклад: жыццё, здароўе, выхаванне, грошы, веды, перамога, бяспека…*

Катэхет задае вучням пытанне:

— Чаму жыццё, здароўе, выхаванне, грошы, веды, перамога, бяспека — такія важныя для людзей?

Паводле адказаў мы бачым, што для людзей важныя пэўныя каштоўнасці, таму што дзякуючы ім людзі могуць дасягнуць шчасця. Яны шукаюць таго, што ім здаецца самым важным у жыцці. Для адных гэта жыццё і здароўе, для другіх — сям'я, для трэціх — кар'ера і поспех.

Давайце мы з вамі задумаемся: што людзі робяць дзеля дасягнення таго, што яны лічаць самым галоўным у сваім жыцці?

*Вучні адказваюць. Катэхет падагульвае:*

Людзі прысвячаюць шмат часу, высілкаў, стараннеяў для дасягнення пастаўленай мэты.

**Бог адказвае**

*Катэхет вешае на дошку ілюстрацыю з выявамі чалавека, які знайшоў скарб у полі, і подпісам: «Валадарства Нябеснае падобнае да скарбу, схаванага ў полі» (Мц 13, 45). Катэхет задае вучням пытанне:*

— Чаму так радуецца чалавек, адлюстраваны на гэтым малюнку?

*Вучні адказваюць.*

*Катэхет вешае на дошку ілюстрацыю з выявамі чалавека, які разглядае пярліну, і подпісам: «Валадарства Нябеснае падобнае да купца, які шукае прыгожых пярлін» (Мц 13, 44). Катэхет задае вучням пытанне:*

— Што з'яўляецца каштоўнасцю для чалавека, адлюстраванага на гэтым малюнку?

*Вучні адказваюць.*

А цяпер мы з вамі даведаемся, што гэтыя людзі зрабілі для таго, каб атрымаць схаваны скарб і каштоўную пярліну.

*Катэхет прапаноўвае вучням паслухаць аўдыёзапіс біблійнага тэксту (Мц 13, 44–46):*

«Валадарства Нябеснае падобнае да скарбу, схаванага ў полі, які знайшоў чалавек і ўтаіў. У радасці ад гэтага ён ідзе і прадае ўсё, што мае, і купляе гэтае поле.

Яшчэ Валадарства Нябеснае падобнае да купца, які шукае прыгожых пярлін. Знайшоўшы адну каштоўную пярліну, ён ідзе і прадае ўсё, што мае, і купляе яе».

*Можна паказаць фрагмент з фільма, прысвечаны гэтым прыпавесцям.*

Тое, што мы з вамі пачулі, з'яўляецца прыпавесцю. У прыпавесці самае галоўнае — праўда, якую нам аўтар хоча перадаць.

*Катэхет дзеліць вучняў на 2 групы (заданне ў сшытку № 1):*

I група

Паводле біблійнага тэксту (Мц 13, 44) адкажыце на пытанні:

— Якім чалавекам быў герой прыпавесці? Якія ў яго рысы характару?

— Якая галоўная думка прыпавесці пра схаваны скарб?

— Якую важную праўду пра Нябеснае Валадарства хоча перадаць нам Езус?

— Што робіць чалавек, для якога самым важным з’яўляецца Нябеснае Валадарства?

II група

Паводле біблійнага тэксту (Мц 13, 45–46) адкажыце на пытанні:

— Якім чалавекам быў герой прыпавесці? Якія ў яго рысы характару?

— Якая галоўная думка прыпавесці пра пярліну?

— Якую важную праўду пра Нябеснае Валадарства хоча перадаць нам Езус?

Што робіць чалавек, для якога самым важным з’яўляецца Нябеснае Валадарства?

*Групы дзеляцца сваімі адказамі.*

Нябеснае Валадарства — самае галоўнае ў вучэнні Езуса Хрыста. Прыйдзе час, калі сусветнае зло будзе знішчана, калі чалавек канчаткова вернецца да Бога і ў адзінстве з Ім атрымае спакой, радасць і шчасце. Нябеснае Валадарства — гэта не аддаленая будучыня. З моманту аб’яўлення Хрыста яно ўжо пачало заваёўваць свет. Пры гэтым яно не падобнае да зямнога валадарства. Пачынаецца яно з малога, непрыкметнага. Яно падобнае да зерня, з якога вырастае вялікае дрэва. Яно падобна да закваскі, якая паступова заквашвае цеста. Яно нараджаецца ў душы, якая прымае добрую вестку пра Бога — Збаўцу людзей. Чалавек знаходзіць Нябеснае Валадарства, калі ва ўсіх яго думках, пачуццях і ўчынках валадарыць Бог. Радасць уступлення ў Нябеснае Валадарства не можа параўнацца ні з чым у свеце.

**Чалавек адказвае Богу**

Недастаткова называцца хрысціянінам, каб дасягнуць Нябеснага Валадарства. Езус засцерагае нас: «Не кожны, хто кажа Мне: „Пане, Пане“, увойдзе ў Нябеснае Валадарства, але той, хто выконвае волю Айца Майго, які ў нябёсах» (Мц 7, 21).

*Катэхет прапаноўвае вучням пісьмова адказаць на пытанні (заданне ў сшытку № 2):*

| Што нам дапамагае дасягнуць Нябеснага Валадарства? | Што нам перашкаджае ў дасягненні Нябеснага Валадарства? |
|---|---|

*Вучні дзеляцца сваімі адказамі.*

*Катэхет прапаноўвае вучням, карыстаючыся сваімі ведамі пра Нябеснае Валадарства, намаляваць яго герб і сцяг (заданне ў сшытку № 3).*

**Разважанне**

Катэхет задае вучням пытанні:

— Ці з’яўляецца Нябеснае Валадарства для мяне самым каштоўным скарбам? У чым гэта выяўляецца?

— Як я прымаю і выконваю волю Божую?

— Што я магу і хачу зрабіць для таго, каб Бог валадарыў у маіх думках, пачуццях і ўчынках?

— Што я магу і хачу зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з ім?

**Пастанова**

*Катэхет:*

Пастанову запішыце ў сшытак.

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям’і і сябрам прыпавесці пра схаваны скарб і каштоўную пярліну. Растлумач ім сэнс гэтых прыпавесцяў.

— На працягу гэтага тыдня кожны вечар шчыра адказвай на пытанне ў пісьмовай форме: «Як я сёння прымаў і выконваў волю Божую?» *(Заданне ў сшытку № 4).*

**Заключная малітва**

Адданне сябе Богу

Вазьмі, Пане, усю маю свабоду, прымі маю памяць, розум і волю. Усё, што я маю і чым валодаю, Ты мне падараваў, а я аддаю і вяртаю Табе ўсё, каб Ты мною кіраваў паводле волі Тваёй. Дай мне толькі Тваю любоў і ласку, і буду я дастаткова багаты і нічога больш шукаць не буду. Амэн.

## Тэма 8. Езус выбірае Апосталаў

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з біблійнай гісторыяй пра тое, як Хрыстус выбраў Апосталаў; дапамагчы вучням зразумець, што Езус Хрыстус з'яўляецца ініцыятарам паклікання, Ён кліча тых, каго пажадае, а наша місія заключаецца ў тым, каб з даверам і вернасцю ісці за Хрыстом.

**Выхаваўчая мэта:**

фарміраваць у вучняў імкненне верна ісці за голасам свайго хрысціянскага паклікання.

**Матэрыялы:**

Біблія: Мк 1, 16–20; Мк 3, 13–19.

Ілюстрацыя: «Выбранне Апосталаў», надпісы да ілюстрацыі: «Пасля ўзышоў на гару і паклікаў да сябе тых, каго сам хацеў» (Мк 3, 13); «Ідзіце за Мной» (Мк 1, 17).

Фрагмент з фільма пра выбранне Апосталаў.

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразам, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагменту з фільма, дыялог, праца ў групах, пісьмовая праца на над пытаннямі, спеў.

### Ход занятку

**Малітва**

Акт веры…

**Праверка хатняга задання**

*Вучні дзеляцца сваімі адказамі на пытанне: «Як я сёння прымаў і выконваў волю Божую?».*

*Пры паўтарэнні дамашняга задання можна карыстацца крыжаванкамі, змешчанымі ў канцы сшытка (крыжаванка № 7).*

**Чалавек пытаецца**

*Катэхет піша на дошцы выраз «Нашы настаўнікі» і прапануе вучням адказаць на пытанне (у сшытку заданне № 1):*

— Нашы настаўнікі… Хто яны і чаму мы ад іх вучымся?

*Вучні запісваюць свае адказы на дошцы. Катэхет падсумоўвае.*

**Бог адказвае**

*Катэхет вешае на дошку ілюстрацыю* «Выбранне Апосталаў», *а таксама надпісы*: «Пасля ўзышоў на гару і паклікаў да сябе тых, каго сам хацеў» (Мк 3, 13); «Ідзіце за Мной» (Мк 1, 17).

Сёння мы з вамі даведаемся пра тое, што ў Бібліі гаворыцца пра выбранне Апосталаў.

*Катэхет дае вучням магчымасць праслухаць аўдыёзапіс двух фрагментаў з Бібліі: Мк 1, 16–20; Мк 3, 13–19.*

*Можна паказаць вучням фрагмент з фільма пра выбранне Апосталаў (звярніце ўвагу на тое, каб фрагмент дакладна адлюстроўваў біблійны сюжэт).*

*Катэхет дзеліць вучняў на групы і прапануе самастойна папрацаваць з біблійнымі тэкстамі (у сшытку заданне № 2):*

I група.

Прачытайце фрагмент са Святога Евангелля паводле Марка (1, 16–20) і адкажыце на пытанні:

1. Дзе Езус паклікаў першых Апосталаў?
2. Чым яны займаліся, калі Езус іх паклікаў?
3. Што Езус ім сказаў?
4. Што зрабілі Пётр і Андрэй?
5. Што зрабілі Якуб і Ян?
6. Як вы разумееце выраз: «Я зраблю вас рыбакамі людзей»?

II група.

Прачытайце фрагмент са Святога Евангелля паводле Марка (3, 13–19) і адкажыце на пытанні:

1. Паводле якога прынцыпу Езус выбіраў Апосталаў?
2. Якую місію ўсклаў Езус на Апосталаў?
3. Як вы разумееце выраз: «І ўстанавіў Дванаццаць, якіх і назваў Апосталамі, каб яны былі з Ім, каб пасласць іх прапаведаваць»?
4. Як вы разумееце выраз: «Каб яны мелі ўладу выганяць злых духаў»?
5. Хто надзяліў Апосталаў уладай і моцай?
6. Пералічыце імёны Апосталаў.

*Вучні дзеляцца сваімі адказамі. Катэхет падсумоўвае адказы вучняў, расказвае пра далейшы лёс Апосталаў (матэрыял у падручніку).*

*Катэхет прапануе вучням знайсці імёны Апосталаў (у сшытку заданне № 3):*

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Г | Б | А | Р | Т | А | Л | А | М | Е | Й |
| У | Н | Г | Р | Ф | І | Л | І | П | Д | Ш |
| М | Е | Я | К | У | Б | У | Ц | Ы | Г | Я |

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Т | Г | Ч | Н | Л | Я | Н | Ф | Ю | Н | К |
| Н | Т | А | Д | Э | В | У | Ш | В | Е | У |
| Г | Н | Й | Н | У | Й | Ч | Т | Ч | Ю | Б |
| М | А | Ц | В | Е | Й | А | А | Ў | Д | К |
| Х | С | Ы | Т | А | О | С | М | Э | А | Ь |
| Ц | К | П | Ё | Т | Р | Ю | А | Х | Л | Ж |
| Й | Ц | С | Ы | М | О | Н | Ш | Т | Р | Е |
| Ф | Ы | В | М | І | А | Н | Д | Р | Э | Й |

**Чалавек адказвае Богу**

Езус Хрыстус — наш сапраўдны Настаўнік, а мы — Яго вучні.

*Катэхет прапануе вучням напісаць, што для іх азначае быць вучнем Хрыста, што значыць абвяшчаць добрую навіну пра Езуса Хрыста дома, у школе сярод сяброў, праз інтэрнэт (у сшытку заданне № 4 і 5)?*

*Вучні дзеляцца сваімі адказамі.*

**Разважанне**

*Катэхет задае вучням пытанні:*

— Ці з'яўляецца для цябе Езус Хрыстус Настаўнікам? У чым гэта выяўляецца?

— Чаму ты навучыўся ў школе Езуса Хрыста?

— Як ты абвяшчаеш добрую навіну пра Езуса Хрыста дома, у школе сярод сяброў, праз інтэрнэт?

— Што ты можаш і хочаш змяніць у сабе, каб быць годным вучнем Езуса Хрыста?

— Што ты павінен рабіць для таго, каб не стаць здраднікам?

— Што ты можаш і хочаш зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з ім?

**Пастанова**

*Катэхет прапануе вучням запісаць пастанову ў сшытак.*

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям'і і сябрам пра тое, як Езус Хрыстус выбраў Апосталаў.

— Выберы аднаго з Апосталаў і падрыхтуй пісьмовае або вуснае сачыненне пра яго жыццё і апостальскае служэнне.

**Заключная малітва**

Песня «Настаўнік»

## Тэма 9. Езус вучыць нас быць шчаслівымі

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з васьмю благаслаўленнямі Хрыста; дапамагчы вучням зразумець, што па-сапраўднаму шчаслівым чалавека робіць вера ў Пана Бога і наследаванне Яго вучэнню.

**Выхаваўчая мэта:**

фарміраваць у вучняў імкненне выконваць восем благаслаўленняў.

**Матэрыялы:**

Біблія: Мц 5, 1–12.

Фотаздымкі, якія адлюстроўваюць восем благаслаўленняў.

Надпісы: «Шчаслівыя міласэрныя, бо яны спазнаюць міласэрнасць» (Мц 5, 7); «Шчаслівыя чыстыя сэрцам, бо яны Бога ўбачаць» (Мц 5, 8); «Шчаслівыя міратворцы, бо яны будуць названыя сынамі Божымі» (Мц 5, 9).

**Метады катэхезы:**

Малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразом, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагменту з фільма, дыялог, праца ў групах, пісьмовая праца на аснове тэксту, творчая майстэрня — маляванне.

### Ход занятку

**Малітва**

Акт веры…

**Праверка хатняга задання**

*Вучні дзеляцца сваімі сачыненнямі пра Апосталаў.*

*Пры паўтарэнні дамашняга задання можна карыстацца крыжаванкамі, змешчанымі ў канцы сшытка (крыжаванка № 8).*

*Катэхет уводзіць вучняў у новую тэму.*

**Чалавек пытаецца**

У наш час выдаецца мноства кніг, аўтары якіх спрабуюць даць чытачам парады адносна таго, як стаць шчаслівым чалавекам.

*Катэхет можа прывесці прыклады такіх кніг. Затым раскладвае ў класе фотаздымкі на тэму: «Што робіць чалавека па-сапраўднаму шчаслівым?». Сярод іх неабходна размясціць і здымкі, прысвечаныя васьмі благаслаўленням. Катэхет прапануе вучням выбраць фотакарткі, якія, на іх погляд, адлюстроўваюць сапраўднае шчасце. Вучні аргументуюць свае адказы.*

**Бог адказвае**

Пан Бог стварыў нас для шчасця. Але якое ж яно, сапраўднае шчасце? Сёння мы з вамі паслухаем, што Езус гаворыць пра сапраўднае шчасце.

*Катэхет вешае на дошку фотаздымкі, якія адлюстроўваюць восем благаслаўленняў, а таксама надпісы:* «Шчаслівыя міласэрныя, бо яны спазнаюць міласэрнасць» (Мц 5, 7); «Шчаслівыя чыстыя сэрцам, бо яны Бога ўбачаць» (Мц 5, 8); «Шчаслівыя міратворцы, бо яны будуць названыя сынамі Божымі» (Мц 5, 9).

*Катэхет прапануе вучням праслухаць аўдыёзапіс фрагменту Святога Евангелля паводле Мацвея (5, 1–12).*

*Пажадана паказаць урывак з фільма ці з мультфільма, у якім Езус Хрыстус абвяшчае восем благаслаўленняў (звярніце ўвагу на тое, каб фрагмент дакладна адлюстроўваў біблійны сюжэт).*

*Катэхет прапануе вучням, карыстаючыся біблійным тэкстам (Мц 5, 1–12), уставіць прапушчаны словы (у сшытку заданне № 1):*

«Убачыўшы натоўп, Езусу зышоў на ________ . А калі сеў, падышлі да Яго ________ Ягоныя. І, адкрыўшы вусны свае, Ён вучыў іх, кажучы: „Шчаслівыя ________ духам, бо іх ёсць Валадарства Нябеснае. Шчаслівыя ________, бо яны будуць суцешаны. Шчаслівыя ________, бо яны ________. Шчаслівыя ______________, бо яны будуць ______________. Шчаслівыя______________, бо яны ______________. Шчаслівыя ______________, бо яны ______________ ўбачаць. Шчаслівыя ______________, бо яны будуць названыя______________. Шчаслівыя, ______________ за справядлівасць, бо іх ёсць Валадарства Нябеснае. Шчаслівыя вы, калі будуць вас зневажаць, ______________ і ўсяляк зласловіць ______________ за Мяне. ______________ і весяліцеся, бо вялікая ______________ вашая ў нябёсах. Бо так пераследавалі прарокаў, якія былі перад вамі».

| | | | |
|---|---|---|---|
| гару | Валадарства Нябеснае | лагодныя | |
| вучні засмучаныя | галодныя і прагнучыя | міласэрныя | |
| міласэрнасць спазнаюць | чыстыя сэрцам | Бога | |
| ўзнагарода | | | |
| пераследаваць | несправядліва | Радуйцеся | убогія |
| атрымаюць у спадчыну зямлю | будуць насычаны | | |
| сынамі Божымі | | | |

...*не адводзіць 10 хвілінаў (у сшытку заданне № 2).*

І пара

Прачытайце фрагмент з Евангелля (Мц 5, 3) і знайдзіце ў падручніку інтэрпрэтацыю гэтага благаслаўлення. Намалюйце малюнак на гэтую тэму.

II пара
Прачытайце фрагмент з Евангелля (Мц 5, 4) і знайдзіце ў падручніку інтэрпрэтацыю гэтага благаслаўлення. Намалюйце малюнак на гэтую тэму.

III пара
Прачытайце фрагмент з Евангелля (Мц 5, 5) і знайдзіце ў падручніку інтэрпрэтацыю гэтага благаслаўлення. Намалюйце малюнак на гэтую тэму.

IV пара
Прачытайце фрагмент з Евангелля (Мц 5, 6) і знайдзіце ў падручніку інтэрпрэтацыю гэтага благаслаўлення. Намалюйце малюнак на гэтую тэму.

V пара
Прачытайце фрагмент з Евангелля (Мц 5, 7) і знайдзіце ў падручніку інтэрпрэтацыю гэтага благаслаўлення. Намалюйце малюнак на гэтую тэму.

VI пара
Прачытайце фрагмент з Евангелля (Мц 5, 8) і знайдзіце ў падручніку інтэрпрэтацыю гэтага благаслаўлення. Намалюйце малюнак на гэтую тэму.

VII пара
Прачытайце фрагмент з Евангелля (Мц 5, 9) і знайдзіце ў падручніку інтэрпрэтацыю гэтага благаслаўлення. Намалюйце малюнак на гэтую тэму.

VIII пара
Прачытайце фрагмент з Евангелля (Мц 5, 10) і знайдзіце ў падручніку інтэрпрэтацыю гэтага благаслаўлення. Намалюйце малюнак на гэтую тэму.

*Вучні прадстаўляюць свае працы па наступнай схеме:*

— Пра каго гаворыцца ў гэтым благаслаўленні?
— Пра што гаворыць Езус?
— Як гэтае благаслаўленне можна ўвасобіць у жыццё?

**Чалавек адказвае Богу**

Зямное жыццё мае непазбежны канец. Нельга, як казаў Езус, служыць двум гаспадарам. Калі нашыя думкі і пачуцці цалкам занятыя зямнымі клопатамі, імкненнем да дабрабыту і поспеху, мы не можам служыць Богу. Таму вучню Хрыста неабходна перш за ўсё клапаціцца пра тое, каб асвятліць і ачысціць сваю душу, якая ніколі не памірае. Аднак рост духоўных сілаў непадзельна звязаны са служэннем бліжнім тут, на зямлі.

Хто ж увойдзе ў Валадаства Нябеснае?

Вароты гэтага Валадарства зачыненыя для ганарыстых, жорсткіх людзей з нячыстым сэрцам, якія занадта захопленыя часовымі рэчамі, мітуснёй свету.

У яго ўвойдуць людзі, якія будуюць сваё жыццё паводле васьмі благаслаўленняў Хрыста. У Нябесным Валадарстве яны знойдуць тое, што шукаюць — шчасце і вечнае жыццё.

*Катэхет прапануе вучням уявіць восем благаслаўленняў у выглядзе дарожных знакаў, якія вядуць нас у Валадарства Нябеснае. Пад знакамі благаслаўленняў можна размясціць малюнкі вучняў (у сшытку заданне № 3).*

**Разважанне**

Катэхет задае вучням пытанні:

— Як ты адносішся да бедных, засмучаных, лагодных і ціхіх людзей?

— Ці можаш ты сябе назваць абаронцам праўды? У чым гэта канкрэтна выяўляецца?

— Каму ў тваім асяроддзі неабходна твая міласэрнасць?

— У чым выяўляецца твая міратворчая місія ў сям'і, у школе, у інтэрнэце, сярод аднагодкаў і сяброў?

— Што ты можаш і хочаш зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з Ім?

**Пастанова**

*Вучні запісваюць пастанову ў сшытак.*

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям'і і сябрам пра восем благаслаўленняў Хрыста.

— На працягу гэтага тыдня кожны вечар шчыра адказвай сабе на пытанне: «Ці ўдалося мне пражыць сённяшні дзень паводле васьмі благаслаўленняў Езуса Хрыста?»

**Заключная малітва**

Спеў.

## Тэма 10. «Хто мае вушы, няхай слухае»

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з біблійнай прыпавесцю пра сейбіта; дапамагчы вучням зразумець, што сейбіт — гэта Хрыстус, а зерне — гэта слова Божае.

**Выхаваўчая мэта:**

фарміраваць у вучняў культуру ўспрыняцця слова Божага, а менавіта не толькі слухаць слова Божае, але таксама разумець, прымаць і жыць згодна з праўдаю, змешчанаю ў слове Божым.

**Матэрыялы:**

Біблія: Мц 13, 1–9, 18–23.

Ілюстрацыя, прысвечаная прыпавесці пра сейбіта.

Надпіс: «Яшчэ іншыя [зярняты] ўпалі на добрую зямлю і прынеслі плён: адно ў сто разоў, другое ў шэсцьдзясят, а іншае ў трыццаць» (Мц 13, 8).

Фрагмент з фільма (мультфільма), прысвечаны прыпавесці пра сейбіта.

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразам, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагмента з фільма, дыялог, праца ў групах, пісьмовая праца паводле тэксту, творчая майстэрня: маляванне «Карты сэрца».

### Ход занятку

**Малітва**

Песня да Духа Святога

**Праверка хатняга задання**

*Вучні дзеляцца сваімі адказамі на пытанне: «Як на мінулым тыдні ў мяне атрымалася жыць паводле васьмі благаслаўленняў Езуса Хрыста?»*

*Пры паўтарэнні хатняга задання можна карыстацца крыжаванкамі, змешчанымі ў канцы сшытка (крыжаванка № 9).*

**Чалавек пытаецца**

*Катэхет паказве вучням зерне пшаніцы, жыта, ячменю, прапаноўвае вучням раздзяліцца на пары і пытаецца:*

— Што патрэбна для таго, каб зерне прынесла вялікі ўраджай?

*Адказы вучні запісваюць у сшытак (заданне № 1 — вакол фотаздымка, на якім адлюстравана поле, занатоўваюцца адпаведныя выразы).*

*Катэхет:*

Адной з умоў добрага ўраджаю з'яўляецца ўраджайная глеба.

**Бог адказвае**

Калі Езус Хрыстус хацеў адкрыць вучням вельмі важныя праўды, Ён выкарыстоўваў прыпавесці, у якіх даступна і наглядна распавядалася пра тое, што Езус хацеў перадаць сваім слухачам. Сёння мы з вамі на аснове прыпавесці пра сейбіта даведаемся, што неабходна для таго, каб слова Божае прынесла добры плён у нашым жыцці.

*Катэхет вешае на дошку ілюстрацыю, прысвечаную прыпавесці пра сейбіта, а таксама надпіс: «Яшчэ іншыя [зярняты] ўпалі на добрую зямлю і прынеслі плён: адно ў сто разоў, другое ў шэсцьдзясят, а іншае ў трыццаць» (Мц 13, 8). Можна паказаць фрагмент з фільма (мультфільма), у якім адлюстроўваецца прыпавесць пра сейбіта (звярніце ўвагу на тое, кааб фрагмент дакладна адлюстроўваў біблійны сюжэт). Катэхет прапаноўвае вучням праслухаць аўдыёзапіс фрагменту Бібліі: Мц 13, 1–9, 18–23:*

«У той дзень Езус выйшаў з дому і сеў каля мора. І сабралася каля Яго мноства народу, так што Ён увайшоў у човен і сеў, а ўвесь народ стаяў на беразе. Ён шмат гаварыў ім у прыпавесцях, кажучы: „Вось выйшаў сейбіт сеяць. І калі сеяў, некаторыя зярняты ўпалі пры дарозе, і наляцелі птушкі, і падзяўблі іх. Другія ж упалі на камяністае месца, дзе было мала зямлі, і адразу прараслі, бо зямля была неглыбокая. Аднак, калі ўзышло сонца, яны завялі і таму, што не мелі каранёў, засохлі. А іншыя ўпалі сярод церняў, і выраслі церні, і заглушылі іх. Яшчэ іншыя ўпалі на добрую зямлю і прынеслі плён: адно ў сто разоў, другое ў шэсцьдзясят, а іншае ў трыццаць. Хто мае вушы, няхай слухае. <…>

Вы ж паслухайце значэнне прыпавесці пра сейбіта. Да кожнага, хто слухае слова пра Валадарства, а не разумее, прыходзіць злы і крадзе пасеянае ў сэрцы яго; вось каго азначае пасеянае пры дарозе. А пасеянае на камяністых месцах — гэта той, хто чуе слова і адразу прымае яго з радасцю, але не мае ў сабе кораня і нясталы. Калі за слова настане ўціск ці пераслед, ён адразу спакушаецца. Пасеянае ж у церні — гэта той, хто чуе слова, але турботы гэтага веку і зман багацця заглушаюць слова, і яно становіцца бясплодным. Пасеянае ж на добрай зямлі — гэта той, хто чуе слова і разумее, і прыносіць плён, адзін у сто разоў, другі ў шэсцьдзясят, а іншы ў трыццаць».

*Катэхет прапаноўвае вучням самастойна папрацаваць з тэкстам (заданне ў сшытку № 2).*

Запоўні табліцу. Можна карыстацца Святым Пісаннем (Мц 13, 1–9, 18–23):

| Месца, на якое ўпала зерне | Што адбылося з зернем? | Як людзі ўспрымаюць Божае слова? |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |

*Катэхет:*

Бог — сейбіт, зерне — Яго словы. Прыпавесць пра сейбіта паказвае нам, як людзі ўспрымаюць слова, з якім да іх прыходзіць Хрыстус.

*Катэхет дзеліць вучняў на 4 групы, кожная з якіх аналізуе ўспрыняцце людзьмі слова Божага (заданне ў сшытку № 3).*

I група: Дарога.

1. Хто ў прыпавесці ўвасоблены пад вобразам птушак?
2. Які чалавек у прыпавесці паказаны пад вобразам зямлі, з якой птушкі паклявалі зерне?

II група: Камяністае месца.

1. Які чалавек у прыпавесці паказаны пад вобразам камяністага месца?
2. Калі чалавек становіцца падобным да камяністага месца?

III група: Церні.

1. Што такое церні?
2. Чаму чалавек, які ў прыпавесці паказаны пад вобразам зерня ў цернях, не прыносіць вялікага плёну?

IV група: Добрая зямля.

1. Хто ў прыпавесці паказаны пад вобразам добрай зямлі?
2. Што робіць чалавека падобным да добрай зямлі?
3. Пра што такі чалавек заўсёды памятае?
4. Што для яго самае галоўнае?

*Адказы вучняў запісваюцца ў стрэці слупок табліцы «Як людзі ўспрымаюць Божае слова?».*

**Чалавек адказвае Богу**

Для таго, каб прыняць слова Божае, нам неабходны высілак не толькі розуму, але волі і сэрца. Слова Божае мы павінны захоўваць у сваім сэрцы, як Марыя. Каб яно прынесла багаты плён у нашым жыцці, мы павінны не толькі пачуць яго, але таксама зразумець, прыняць і жыць згодна з праўдай, якую яно нам адкрывае. І толькі тады ў нашым жыцці будзе сапраўдны плён.

*Катэхет прапаноўвае вучням намаляваць карту свайго сэрца (заданне ў сшытку № 4):*

— Колькі ўрадлівай зямлі ёсць у тваім сэрцы?

— Намалюй у сваім сэрцы ўчастак, на якім растуць церні.

— Намалюй камяністыя месцы ў сваім жыцці.

— Намалюй стаптаныя дарогі, на якія прыходзіць злы дух і крадзе зерне слова Божага, каб мы не паверылі і не збавіліся.

*Вучні паказваюць сваю творчасць.*

**Разважанне**

*Катэхет задае вучням пытанні:*

— Як ты прымаеш слова Божае на святой Імшы?

— Як часта ты індывідуальна чытаеш Святое Пісанне?

— Ці выконваеш ты ў сваім жыцці тое, пра што даведваешся на катэхезе?

— Што ты можаш зрабіць для таго, каб лепш разумець і выконваць слова Божае?

— Што ты можаш і хочаш зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з Ім?

**Пастанова**

*Катэхет:*

Пастанову запішыце ў сшытак.

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям’і і сябрам значэнне прыпавесці пра сейбіта.

— На працягу гэтага тыдня знайдзі час на індывідуальнае чытанне Святога Пісання. Запішы ў сшытак словы, якія табе больш за ўсё запомніліся. Звярні ўвагу на тое, як уважліва ты слухаеш слова Божае на святой Імшы і як ты яго выконваеш у сваім жыцці (занатуй гэта ў рубрыку «Мае тэксты – мой скарб»)

**Заключная малітва**

Песня «Слова Тваё — светач для стоп маіх»

Рэфрэн: Слова Тваё —светач для стоп маіх,
Святло на сцежцы маёй (х2).

1. Як люблю я Твой закон, Пане,
Увесь дзень ён у думках маіх.
Як салодкі Твае словы, Пане,
Саладзей за мёд вуснам маім.

2. Як душа мая сумуе, Пане,
Па збаўленні Тваім.
Як сумуюць мае вочы, Пане,
Па слове Тваім.

## Тэма 11. Езус заклікае нас маліцца

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з тым, што ў Бібліі напісана пра малітву Езуса; дапамагчы вучням зразумець, што малітва з'яўляецца неад'емнай часткай хрысціянскага жыцця — сэрцам нашай веры.

**Выхаваўчая мэта:**

фарміраваць у вучняў імкненне да штодзённай малітвы.

**Матэрыялы:**

Біблія.

Ілюстрацыя на тэму: «Малітва Езуса ў садзе Аліўным».

Надпісы: «Ойча Мой, калі не можа келіх гэты абмінуць Мяне, каб Мне не піць яго, няхай станецца воля Твая» (Мц 26, 42). «Адпусціўшы народ, Езус падняўся на гару памаліцца асобна. Калі настаў вечар, заставаўся там адзін» (Мц 14, 23). «Ойча, дзякую Табе, што Ты пачуў Мяне» (Ян 11, 41).

Аўдыёзапіс Бібліі.

Фрагмент фільма, прысвечаны малітве Езуса.

Свечкі.

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразом, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагмента з фільма, дыялог, праца ў парах, праца ў групах, пісьмовая праца на аснове тэксту, творчая майстэрня — інсцэніроўка.

### Ход занятку

**Малітва**

Ойча наш

**Праверка хатняга задання**

*Катэхет прапаноўвае вучням падзяліцца словамі, якія ім найбольш запомніліся пры індывідуальным чытанні Святога Пісання.*

*Пры паўтарэнні хатняга задання можна карыстацца крыжаванкамі, змешчанымі ў канцы сшытка — крыжаванка № 10.*

**Чалавек пытаецца**

*Інсцэніроўку найлепш падрыхтаваць з вучнямі загадзя, але, калі няма такой магчымасці, можна заняцца ёю на ўроку.*

Сцэнарый

**МАЛІТВА**

*На сцэну выходзіць гераіня і пачынае маліцца. Бог адказвае ёй, але Яго не бачна, чуваць толькі Яго голас.*

*(Словы Бога запісаныя вялікімі літарамі, словы гераіні — маленькімі).*

— Ойча наш, каторы ёсць у небе…

— ТАК, ТАК…

— Не перабівай мяне, я ж малюся!

— АЛЕ Ж ТЫ КЛІКАЛА МЯНЕ…

—Клікала цябе? Я не клікала, я малюся «Ойча наш, каторы ёсць у небе…»

— НУ ВОСЬ, ЗНОЎ…

— Што зноў?

— ТЫ ПАКЛІКАЛА МЯНЕ. ТЫ СКАЗАЛА «ОЙЧА НАШ, КАТОРЫ ЁСЦЬ У НЕБЕ». ВОСЬ Я. ЧАГО Ж ТЫ ХОЧАШ?

— О, я нічога гэтым не мела на ўвазе. Ведаеш, я ўсяго толькі малілася за гэты дзень. Я заўсёды малюся «Ойча наш». Мне гэта падабаецца — адчуваеш, быццам выканаў свой доўг.

— ДОБРА, ПРАЦЯГВАЙ.

— Свяціся імя Тваё…

— ПАЧАКАЙ, ШТО ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ?

— Што?

— «СВЯЦІСЯ ІМЯ ТВАЁ»?

— Гэта значыць... Гэта значыць… Ну, трэба ж, я не ведаю, што гэта значыць. Ды і адкуль мне ведаць? Проста частка малітвы. А, дарэчы, што гэта значыць?

— ГЭТА АЗНАЧАЕ ПАШАНУ, СВЯТЫЯ АДНОСІНЫ ДА МАЙГО ІМЯ.

— Вось што! Я раней ніколі не думала над гэтымі словамі. Свяціся імя Тваё… Прыйдзі Валадарства Тваё, будзь воля Твая як у небе, так і на зямлі.

— ТЫ НА САМАЙ СПРАВЕ ГЭТАГА ХОЧАШ?

— Ну так, а чаму б не?

— А ШТО ТЫ ДЛЯ ГЭТАГА РОБІШ?

— Раблю? Напэўна, нічога. Я проста лічу, што было б нядрэнна, каб Ты кіраваў тут, на зямлі, усімі справамі гэтак жа, як Ты кіруеш там, на небе.

— А ТАБОЙ Я КІРУЮ?

— Ну, я хаджу ў касцёл…

— ТАК, АЛЕ ГЭТА НЕ ТОЕ, ПРА ШТО Я ЦЯБЕ ПРАСІЎ. А ЯК БЫЦЬ З ТВАЁЙ ЗВЫЧКАЙ ХЛУСІЦЬ ЛЮДЗЯМ? З ГЭТЫМ У ЦЯБЕ, САПРАЎДЫ, ПРАБЛЕМА. І ЯШЧЭ… УСЕ СВАЕ ГРОШЫ ТЫ ТРАЦІШ… НА СЯБЕ…

— Не трэба мяне папракаць. Я нічым не горшая за некаторых іншых нашых парафіянаў.

— ПРАБАЧ, Я ДУМАЎ, ШТО ТЫ МОЛІШСЯ АБ ТЫМ, КАБ СПОЎНІЛАСЯ МАЯ ВОЛЯ. КАЛІ ГЭТА САПРАЎДЫ АДБУДЗЕЦЦА, ТО ТОЛЬКІ З ТЫМІ, ХТО АБ ГЭТЫМ МОЛІЦЦА, ЯК, НАПРЫКЛАД, ТЫ.

— Так, канешне, Я думаю, у мяне на самай справе ёсць недахопы. Ты назваў гэтыя. Я змагла б назваць і некаторыя іншыя.

— Я ТАКСАМА.

— Я не вельмі шмат думала пра іх да гэтага часу, але я сапраўды хачу ад іх пазбавіцца!

— ДОБРА. ГЭТА ЎЖО ШТОСЬЦІ. МЫ БУДЗЕМ ПРАЦАВАЦЬ РАЗАМ, ТЫ І Я.

— Пане, мне ўжо трэба заканчваць. Сёння малітва атрымалася даўжэйшай за звычайную. Хлеба нашага штодзённага дай нам сёння...

— ДАРЭЧЫ, ПРА ХЛЕБ. Я КОЖНЫ ДЗЕНЬ ДАЮ ТАБЕ ХЛЕБ ШТОДЗЁННЫ, А ВОСЬ ПРА ДУХОЎНЫ ТЫ ЗАБЫВАЕШСЯ.

— Што Ты маеш на ўвазе?

— СКАЖЫ, КАЛІ ТЫ АПОШНІ РАЗ УДУМЛІВА ЧЫТАЛА МАЁ СЛОВА? А ЧАСАМ ТЫ ЎВОГУЛЕ АДДАЕШ ПЕРАВАГУ ТЭЛЕВІЗАРУ, КАМП’ЮТАРУ.

— Я, я… Я не хачу Цябе засмучаць, Пане!

— ДОБРА, ПРАЦЯГВАЙ. МЯНЕ ЦІКАВІЦЬ НАСТУПНАЯ ЧАСТКА ТВАЁЙ МАЛІТВЫ. ТАКІМ ЧЫНАМ…

— Я баюся.

— ЧАГО Ж ТЫ БАІШСЯ?

— Я ведаю, што ты скажаш.

— МАЛІТВА — «НЕБЯСПЕЧНАЯ» РЭЧ. ПАСЛЯ МАЛІТВЫ ТЫ МОЖАШ ЗМЯНІЦЦА. ГЭТА ТОЕ, У ЧЫМ Я СПРАБУЮ ТАБЕ ДАПАМАГЧЫ. ТЫ КЛІКАЛА МЯНЕ, І ВОСЬ Я ТУТ. ПОЗНА СПЫНЯЦЦА. ПРАЦЯГВАЙ.

— І адпусці нам правіны нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым.

— А ЯК НАКОНТ СЯРГЕЯ?

— Я так і ведала! Я ведала, што Ты пра яго ўспомніш. Але ж, Пане, ён падмануў мяне. Выманіў грошы і цяпер не аддае. Я павінна разлічыцца з ім!

— А ТВАЯ МАЛІТВА? ЯК БЫЦЬ З ТВАЁЙ МАЛІТВАЙ?

— Гэтага я ў ёй не мела на ўвазе.

— ДОБРА. ПРЫНАМСІ, ТЫ СКАЗАЛА ПРАЎДУ. АЛЕ Ж ГЭТА ТАК НЕПРЫЕМНА — НАСІЦЬ У САБЕ ГЭТЫ ЦЯЖАР СМУТКУ І КРЫЎДЫ. ЦІ НЕ ТАК?

— Так, але мне стане лягчэй толькі пасля таго, як я разлічуся з Сяргеем. Ён яшчэ пашкадуе, што так учыніў са мной!

— ЛЯГЧЭЙ ТАБЕ АД ГЭТАГА НЕ СТАНЕ. БУДЗЕ ТОЛЬКІ ГОРШ. ПОМСТА — НЕПРЫЕМНАЯ РЭЧ. ПАДУМАЙ, ЯК НЯДОБРА ТАБЕ ЎЖО ЗАРАЗ. АЛЕ Я МАГУ ГЭТА ЗМЯНІЦЬ.

— Можаш? Проста зараз?

— ПРАБАЧ СЯРГЕЮ, І Я ПРАБАЧУ ТАБЕ. ТАДЫ ЗЛОСЦЬ І ГРЭХ БУДУЦЬ ПРАБЛЕМАМІ СЯРГЕЯ, А НЕ ТВАІМІ. МОЖА БЫЦЬ, ТЫ СТРАЦІШ ГРОШЫ, АЛЕ ЗАТОЕ АТРЫМАЕШ СПАКОЙ У СЭРЦЫ.

— Так. Ты гаворыш праўду! Ты, як заўсёды, гаворыш праўду. Мне лепш быць у згодзе з Табой, чым помсціць Сяргею *(паўза, уздых)*. Добра. Добра, я прабачаю яму. Дапамажы яму знайсці правільны шлях у жыцці, Пане. Як-небудзь, якім-небудзь чынам пакажы яму свой шлях.

— ВОСЬ ТАК. ЦУДОЎНА! ЯК ТЫ СЯБЕ АДЧУВАЕШ?

— Гм-м... Нядрэнна, зусім нядрэнна. Я адчуваю сябе зараз нават вельмі добра. Ведаеш, сёння я лягу спаць са спакойнай душой упершыню за доўгія гады.

— АЛЕ Ж ТЫ ЯШЧЭ НЕ СКОНЧЫЛА МАЛІТВУ. ПРАЦЯГВАЙ.

— Так, так, добра. І не ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога.

— ДОБРА. Я ГЭТА ЗРАБЛЮ. АЛЕ ТЫ НЕ СТАЎ СЯБЕ Ў ТАКІЯ АБСТАВІНЫ, ДЗЕ ЦЯБЕ МОГУЦЬ СПАКУСІЦЬ.

— Што Ты маеш на ўвазе?

— ЗМЯНІ КОЛА СВАІХ СЯБРОЎ. НЕКАТОРЫЯ З ТВАІХ ТАК ЗВАНЫХ СЯБРОЎ ПАЧЫНАЮЦЬ УПЛЫВАЦЬ НА ЦЯБЕ. ТАК ЯНЫ ХУТКА ЎЦЯГНУЦЬ ЦЯБЕ Ў НЯДОБРЫЯ СПРАВЫ. НЕ ПАДМАНВАЙ СЯБЕ. ЯНЫ РОБЯЦЬ ВЫГЛЯД, ШТО ПРОСТА ЗАБАЎЛЯЮЦЦА, АЛЕ ДЛЯ ЦЯБЕ ГЭТА МОЖА СТАЦЬ КАНЦОМ. І НЕ КАРЫСТАЙСЯ МНОЙ, ЯК ЧАРОЎНАЙ ПАЛАЧКАЙ.

— Я гэтага не разумею.

— ТЫ РАЗУМЕЕШ, ТЫ РАБІЛА ГЭТА ШМАТ РАЗОЎ. ТРАПЛЯЕШ У ЦЯЖКУЮ СІТУАЦЫЮ, У ЦЯБЕ ЎЗНІКАЮЦЬ ПРАБЛЕМЫ, ЯК ТАДЫ НА ДЫСКАТЭЦЫ, ПАМЯТАЕШ? А ПОТЫМ ПРЫБЯГАЕШ ДА МЯНЕ. «ПАНЕ, ДАПАМАЖЫ! Я АБЯЦАЮ ТАБЕ, ШТО БОЛЬШ ТАК НІКОЛІ НЕ ЗРАБЛЮ». ПАМЯТАЕШ НЕКАТОРЫЯ З ТАКІХ ДАМОВАЎ, ЯКІЯ ТЫ СПРАБАВАЛА ЗАКЛЮЧЫЦЬ СА МНОЙ?

— Я шкадую аб гэтым, Пане. Мне сапраўды шкада. Да гэтага часу я думала, што галоўнае — гэта маліцца кожны дзень малітвай «Ойча наш», а потым рабіць, што захочаш. Я не чакала, што так атрымаецца.

— А ЗАРАЗ ДАВАЙ, СКОНЧЫ СВАЮ МАЛІТВУ.

— Бо Тваё Валадарства і моц, і хвала навекі. Амэн.

— ТЫ ВЕДАЕШ, ШТО ПРЫНОСІЦЬ МНЕ ХВАЛУ? ЧАМУ Я САПРАЎДЫ РАДУЮСЯ?

— Не, але я хацела б ведаць. Цяпер я хачу дагадзіць Табе. Я бачу, якая блытаніна атрымалася ў маім жыцці. Цяпер я хачу быць Тваёй паслядоўніцаю, я хачу быць падобнай да Цябе, каб людзі бачылі ўва мне Тваю святасць.

— ТЫ ТОЛЬКІ ШТО САМА АДКАЗАЛА НА ГЭТА ПЫТАННЕ.

— Я адказала?

— ТАК, МЯНЕ ПРАСЛАЎЛЯЕ ТОЕ, КАЛІ ЛЮДЗІ САПРАЎДЫ ЛЮБЯЦЬ МЯНЕ. І Я БАЧУ, ШТО ГЭТА АДБЫВАЕЦЦА ПАМІЖ МНОЙ І ТАБОЙ ЦЯПЕР, КАЛІ СТАРЫЯ ГРАХІ ПРЫБРАНЫЯ З ТВАЙГО ШЛЯХУ. ТАК, НЕМАГЧЫМА РАСКАЗАЦЬ, ШТО МЫ МОЖАМ ЗРАБІЦЬ ЦЯПЕР З ТАБОЙ УДВАІХ.

— Пане, давай паглядзім, што мы можам зрабіць з мяне, га?
— ДАВАЙ ПАГЛЯДЗІМ...

*Катэхет задае вучням пытанне:*
— Што вы зразумелі з гэтай сцэнкі?
*Вучні адказваюць.*

**Бог адказвае**

*Катэхет вешае на дошку ілюстрацыю на тэму: «Малітва Езуса ў садзе Аліўным», а таксама надпісы: «Ойча Мой, калі не можа келіх гэты абмінуць Мяне, каб Мне не піць яго, няхай станецца воля Твая» (Мц 26, 42). «Адпусціўшы народ, Езус падняўся на гару памаліцца асобна. Калі настаў вечар, заставаўся там адзін» (Мц 14, 23). «Ойча, дзякую Табе, што Ты пачуў Мяне» (Ян 11, 41).*

*Можна паказаць фрагмент з фільма пра тое, як маліўся Езус.*

Езус Хрыстус часта маліўся.

*Катэхет прапаноўвае вучням падзяліцца на пары і, карыстаючыся Святым Пісаннем, занатаваць, што гэты фрагмент з Бібліі адкрывае нам пра малітву Езуса (заданне ў сшытку № 1).*

| Урывак з Бібліі | Малітва Езуса Хрыста |
|---|---|
| Мк 1, 35 | «На досвітку, устаўшы вельмі рана, Ён выйшаў і пайшоў у пустыннае месца і там маліўся». |
| Мц 14, 23 | «Адпусціўшы народ, Езус падняўся на гару памаліцца асобна. Калі настаў вечар, заставаўся там адзін». |
| Лк 9, 28–29 | «І пасля гэтых слоў дзён праз восем, узяўшы з сабою Пятра, Яна і Якуба, Ён узышоў на гару памаліцца. І калі маліўся, выгляд твару Ягонага перамяніўся, і адзенне Ягонае стала бліскуча-белым». |
| Ян 11, 41–42 | «А Езус узняў вочы ўгару і сказаў: „Ойча, дзякую Табе, што Ты пачуў Мяне. Я ведаў, што Ты заўсёды чуеш Мяне. Але сказаў дзеля натоўпу, які стаіць вакол, каб паверылі, што Ты паслаў Мяне“». |
| Ян 17, 1–5 | «Сказаўшы гэта, Езус узняў вочы свае да неба і сказаў: „Ойча, прыйшла гадзіна. Услаў Сына свайго, каб і Сын уславіў Цябе. Ты даў Яму ўладу над усякім целам, каб Ён даў жыццё вечнае ўсяму, што Ты даў Яму. А вечнае жыццё ў тым, каб пазналі Цябе, адзінага праўдзівага Бога, і таго, каго Ты паслаў, Езуса Хрыста. Я ўславіў Цябе на зямлі, выканаўшы справу, якую Ты даручыў |

| | |
|---|---|
| | Мне зрабіць. І цяпер Ты, Ойча, услаў Мяне ў сабе хвалою, якую меў Я ў Цябе перад існаваннем свету». |
| Мц 26, 35–44 | «Пётр адказаў Яму: „Хоць бы давялося памерці з Табою, не адракуся ад Цябе“. Падобнае сказалі і ўсе вучні. Потым Езус пайшоў з імі на месца, званае Гетсэманія, і сказаў вучням: „Сядзьце тут, а Я адыду і памалюся там“. І, узяўшы з сабою Пятра і абодвух сыноў Зэбэдэевых, пачаў тужыць і адчуваць трывогу. Тады сказаў ім: „Засмучана душа Мая аж да смерці; застаньцеся тут і чувайце разам са Мною“. І, адышоўшы крыху ўперад, упаў на твар, маліўся і казаў: „Ойча Мой, калі гэта магчыма, няхай абміне гэты келіх Мяне. Аднак, не як Я хачу, але як Ты“. Калі вярнуўся да вучняў і знайшоў іх спячымі, сказаў Пятру: „Чаму вы не маглі адну гадзіну чуваць са Мною? Чувайце і маліцеся, каб не паддацца спакусе, бо дух ахвочы, але цела слабое“. І зноў, адышоўшы другі раз, маліўся, кажучы: „Ойча Мой, калі не можа келіх гэты абмінуць Мяне, каб Мне не піць яго, няхай станецца воля Твая“. І, вярнуўшыся, зноў знайшоў іх спячымі, бо вочы ў іх былі стомленыя. Тады пакінуў іх і адышоўся зноў, і маліўся трэці раз, паўтараючы тыя самыя словы». |
| Лк 23, 33–34 | «І калі прыйшлі на месца, званае Чэрап, там укрыжавалі Яго і злачынцаў, аднаго з правага, другога з левага боку. А Езус сказаў: „Ойча, прабач ім, бо не ведаюць, што робяць“. І, дзелячы вопратку Ягоную, кідалі лёсы». |
| Лк 23, 46. | «І Езус закрычаў моцным голасам: „Ойча, у рукі Твае аддаю дух Мой“. І, сказаўшы гэта, сканаў». |

*Вучні дзеляцца сваімі адказамі. Катэхет падагульняе адказы вучняў:*

Езус заставаўся ў адзіноце — сыходзіў у пустынныя месцы перад важнымі падзеямі і размаўляў з Нябесным Айцом:

• у Кафарнауме пасля таго, як аздаравіў цешчу Сымона і іншых хворых (Мк 1, 35);

• перад тым, як выбраў Апосталаў (Лк 6, 12);

• пасля памнажэння хлябоў (Мц. 14, 23);

• на гары Табор, калі перамяніўся перад Апосталамі (Лк 9, 28–29);

• перад уваскрашэннем Лазара (Ян 11, 41–42);

• падчас Апошняй Вячэры (Ян 17, 1–26);

• асабліва старанна — у Аліўным садзе, перад сваёй мукай і смерцю (Мц 26, 35–44);

• на крыжы за сваіх праследнікаў (Лк 23, 33–34);

• аддаючы на крыжы свой дух у рукі Айца (Лк 23, 46).

Малітва для Езуса была сардэчнай размовай з Айцом. Падчас малітвы Езус — Сын Божы — быў разам з Богам Айцом. Езус шукаў волю Айца ва ўсім і ўзгадняў сваё жыццё з Яго збаўчым планам. З гатоўнасцю, любоўю і паслухмянасцю Сын Божы выконваў тое, чаго хацеў ад Яго Айцец. Умацаваны на малітве размоваю з Ім, Езус рэалізаваў у жыцці цяжкі, але збаўчы план Бога.

Апосталы часта станавіліся сведкамі таго, як Езус сыходзіў у пустыннае месца і маліўся, часам нават цэлую ноч. Яны таксама хацелі размаўляць з Нябесным Айцом, але не ўмелі. Апосталы бачылі, як фарысеі часта прамаўлялі доўгія малітвы, бо думалі: чым даўжэйшая малітва, тым больш яна падабаецца Богу. Але Езус даў сваім вучням наказ не імкнуцца да шматслоўя: Бог ведае ўсё, што ў нас на душы. Ён толькі хоча, каб у малітве мы з даверам адкрывалі Яму сэрца.

*Катэхет запальвае свечку, вучні ўстаюць. Катэхет чытае тэкст з Бібліі: Лк 11, 1–4:*

«Калі Ён маліўся ў пэўным месцы і калі перастаў, адзін з вучняў Ягоных сказаў Яму: „Пане, навучы нас маліцца, як і Ян навучыў сваіх вучняў“. Ён сказаў ім: „Калі моліцеся, кажыце: „Ойча, няхай свяціцца імя Тваё, няхай прыйдзе Валадарства Тваё. Хлеба нашага штодзённага давай нам кожны дзень, і адпусці нам грахі нашыя, бо і мы адпускаем кожнаму даўжніку нашаму, і не ўводзь нас у спакусу“».

*Катэхет дзеліць вучняў на 4 групы і прапаноўвае ім абмеркаваць, як яны разумеюць значэнне заклікаў малітвы «Ойча наш» і што гэтая малітва адкрывае нам пра сэнс хрысціянскай малітвы.*

I група:

Аб чым мы просім Пана Бога, молячыся: «Ойча наш, каторы ёсць у небе, свяціся імя Тваё»?

II група:

Аб чым мы просім Пана Бога, молячыся: «прыйдзі Валадарства Тваё, будзь воля Твая як у небе, так і на зямлі»?

III група:

Аб чым мы просім Пана Бога, молячыся: «хлеба нашага штодзённага дай нам сёння. І адпусці нам правіны нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым»?

IV группа:

Аб чым мы просім Пана Бога, молячыся: «і не ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога»?

*Вучні дзеляцца сваімі адказамі.*

**Чалавек адказвае Богу**

Малітва «Ойча наш» з'яўляецца для нас, хрысціянаў, прыкладам сапраўднай малітвы. І сёння Езус заклікае нас да шчырай размовы з Богам. У першую чаргу малітва — гэта сустрэча з Нябесным Айцом і свядомае прабыванне ў Яго прысутнасці. Існуюць розныя віды малітвы. Мы можам на святой Імшы разам з Езусам Хрыстом і ўсім Касцёлам узносіць нашыя просьбы да Бога. Можам звяртацца да Айца словамі з Бібліі і псальмаў, маліцца паводле тэкстаў, якія напісалі нашыя папярэднікі па веры. Можам маліцца сваімі словамі, праслаўляць Бога за Яго веліч і міласэрнасць, дзякаваць Езусу за дар збаўлення і ўсе духоўныя і матэрыяльныя дары, якімі Ён няспынна адорвае нас, перапрашаць Бога за грахі і прасіць неабходныя ласкі для нашых бліжніх і нас саміх. Самае галоўнае, кааб малітва ішла ад нашага сэрца.

*Катэхет прапануе вучням напісаць малітвы, якія пачынаюцца з наступных словаў (заданне ў сшытку № 2):*

Ойча Нябесны, праслаўляю Цябе…

ДзякуюТабе, Божа мой…

Міласэрны Божа, прабач мне…

Прашу Цябе, Добры Божа, аб…

**Разважанне**

*Катэхет задае вучням пытанні:*

— Ці молішся ты кожны дзень?

— Як ты молішся?

— Як ты сам ацэньваеш сваю малітву?

— Ці верыш ты ў моц малітвы?

— Ці молішся ты з вераю?

— Што ты можаш і хочаш зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з Ім?

**Пастанова**

К прапануе вучням запісаць пастанову ў сшытак.

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям’і і сябрам пра тое, як маліўся Езус Хрыстус.

— На працягу гэтага тыдня звярні ўвагу на якасць сваёй малітвы.

**Заключная малітва**

Вучні чытаюць малітвы, якія напісалі.

## Тэма 12. Езус аздараўляе

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з біблійнымі гісторыямі пра тое, як Езус вярнуў зрок сляпому Бартымэю, ачысціў пракажонага, аздаравіў паралізаванага, вярнуў слых і дар мовы глуханямому; дапамагчы вучням зразумець, што Езус — усемагутны Бог, Ён здольны вылечваць хворых людзей, калі ў іх ёсць неабходная вера для аздараўлення.

**Выхаваўчая мэта:**

выхоўваць у вучнях пачуццё спачування да хворых людзей і павагу да інвалідаў.

**Матэрыялы:**

Біблія: Мк 1, 40–45; Мк 10, 46–52; Лк 5, 17–26; Мк 7, 31–37.

Ілюстрацыі:

1) «Аздараўленне сляпога» з надпісамі: «Сыне Давіда, Езусе, змілуйся нада мною!» (Мк 10, 47); «Ідзі, вера твая ўратавала цябе» (Мк 10, 52);

2) «Аздараўленне пракажонага» з надпісамі: «Калі хочаш, можаш мяне ачысціць» (Мк 1, 40); «Хачу, будзь ачышчаны!» (Мк 1, 41);

3) «Аздараўленне паралізаванага» з надпісамі: «Чалавеча, адпускаюцца табе грахі твае» (Лк 5, 20); «Кажу табе: устань, вазьмі насілкі свае і ідзі да дому свайго» (Лк 5, 24);

4) «Аздараўленне глуханямога» з надпісам: «Эффата, адкрыйся» (пар. Мк 7, 34).

Фрагмент з фільма пра адзін з чатырох цудаў аздараўлення, учыненых Езусам.

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразам, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагмента з фільма, дыялог, праца ў групах, пісьмовая праца на аснове тэксту, акраверш, творчая майстэрня — інсцэніроўка.

### Ход занятку

**Малітва**

Песня

**Праверка хатняга задання**

*Катэхет прапаноўвае вучням падзяліцца меркаваннямі пра якасць сваёй малітвы. Што яны думаюць пра сваю малітву? Над чым яшчэ патрэбна папрацаваць?*

*Пры паўтарэнні хатняга задання можна карыстацца крыжаванкамі, змешчанымі ў канцы сшытка (крыжаванка № 11).*

**Чалавек пытаецца**

*Сярод вучняў выбіраюцца тыя, хто жадае сыграць ролі сляпога, пракажонага, паралізаванага, глуханямога. Яны павінны пастарацца максімальна ўвайсці ў вобраз гэтых людзей і апісаць адзін дзень з іх жыцця. Можна прыдумаць гісторыю для свайго героя (імя героя, кім ён з'яўляецца, чым ён займаецца — усё залежыць ад фантазіі вучняў).*

*Катэхет задае пытанні вучням-акцёрам:*

— Як вы адчуваеце сябе ў ролі выбраных персанажаў?

— Што вы зразумелі з іх жыцця?

— Што змянілася ў вашых адносінах да выбраных персанажаў пасля таго, як вы самі змаглі ў якасці акцёраў пераżыць адзін дзень з іх жыцця?

*Іншыя вучні таксама могуць задаваць пытанні вучням-акцёрам.*

**Бог адказвае**

Перад абліччам болю, хваробы і пакут мы адчуваем сябе безабароннымі. Спрадвеку людзі задавалі сабе пытанне пра паходжанне болю, хвароб і пакут.

*Катэхет задае вучням пытанне (заданне ў сшытку № 1):*

— Адкуль у жыцці чалавека з'явіліся боль, хваробы, пакуты?

Мы з вамі ведаем, што яны з'яўляюцца наступствам першароднага граху. «Не», якое чалавек кажа Богу, прыносіць у свет і жыццё боль, пакуты, хваробы, а ў выніку — смерць. Пан Бог стварыў чалавека для любові і шчасця, а не для таго, каб ён пакутаваў. На аснове Святога Пісання мы з вамі разглядзім, як Езус Хрыстус адносіўся да чалавечых хваробаў.

*Катэхет вешае на дошку ілюстрацыі:*

1) «Аздараўленне сляпога» з надпісамі: «Сыне Давіда, Езусе, змілуйся нада мною!» (Мк 10, 47); «Ідзі, вера твая ўратавала цябе» (Мк 10, 52);

2) «Аздараўленне пракажонага» з надпісамі: «Калі хочаш, можаш мяне ачысціць» (Мк 1, 40); «Хачу, будзь ачышчаны!» (Мк 1, 41);

3) «Аздараўленне паралізаванага» з надпісамі: «Чалавеча, адпускаюцца табе грахі твае» (Лк 5, 20); «Кажу табе: устань, вазьмі насілкі свае і ідзі да дому свайго» (Лк 5, 24);

4) «Аздараўленне глуханямога» з надпісам: «Эффата, адкрыйся» (пар. Мк 7, 34).

*Катэхет дае вучням магчымасць праслухаць чатыры фрагменты з аўдыёзапісу Бібліі: Мк 1, 40–45; Мк 10, 46–52; Лк 5, 17–26; Мк 7, 31–37.*

*Можна паказаць фрагмент з фільма пра адзін з чатырох цудаў аздараўлення, учыненых Езусам.*

*Катэхет дзеліць вучняў на 4 групы і раздае ім 4 фрагменты з Бібліі:*
1) Мк 1, 40–45;
2) Мк 10, 46–52;
3) Лк 5, 17–26;
4) Мк 7, 31–37
*Катэхет прапаноўвае вучням паставіць 4 сцэнкі.*

**І група. Галоўны герой — сляпы (Мк 10, 46–52).**

**Аўтар:** І прыйшлі яны ў Ерыхон. І калі Езус выходзіў з Ерыхона са сваімі вучнямі і з вялікім натоўпам, Бартымэй, сын Тымэя, сляпы жабрак, сядзеў каля дарогі. Пачуўшы, што гэта Езус Назаранін, ён пачаў крычаць:

**Бартымэй:** Сыне Давіда, Езусе, змілуйся нада мною!

**Аўтар:** Многія загадвалі яму змоўкнуць, але ён яшчэ мацней крычаў:

**Бартымэй:** Сыне Давіда, змілуйся нада мною!

**Аўтар:** Езус спыніўся і сказаў:

**Езус:** Паклічце яго.

**Аўтар:** І паклікалі сляпога, кажучы яму: «Смялей, уставай, Ён кліча цябе». Ён жа, скінуўшы вопратку сваю, устаў і падышоў да Езуса. І адказваючы яму, Езус сказаў:

**Езус:** Што хочаш, каб Я зрабіў табе?

**Аўтар:** Сляпы сказаў Яму:

**Бартымэй:** Настаўнік, каб я зноў бачыў.

**Аўтар:** І Езус сказаў яму:

**Езус:** Ідзі, вера твая ўратавала цябе.

**Аўтар:** І той адразу стаў бачыць, і пайшоў за Езусам па дарозе.

**ІІ группа. Галоўны герой — пракажоны (Мк 1, 40–45).**

**Аўтар:** Вось прыйшоў да Яго пракажоны і, упаўшы на калені, прасіў Яго, кажучы:

**Пракажоны:** Калі хочаш, можаш мяне ачысціць.

**Аўтар:** Злітаваўшыся над ім, Ён працягнуў руку, дакрануўся да яго і сказаў яму:

**Езус:** Хачу, будзь ачышчаны!

**Аўтар:** І адразу сышла з яго праказа, і ён стаў чысты. Езус сурова звярнуўся да Яго і зараз жа адправіў. І сказаў яму:

**Езус:** Глядзі, нікому нічога не кажы, але ідзі, пакажыся святару і прынясі ахвяру за ачышчэнне сваё, як загадаў Майсей, на сведчанне ім.

**Аўтар:** Але той, выйшаўшы, пачаў шмат абвяшчаць і расказваць пра здарэнне, так што Езус не мог ужо адкрыта ўвайсці ў горад, а заставаўся звонку, у пустынных мясцінах. І прыходзілі да Яго адусюль.

**ІІІ група. Галоўны герой — паралізаваны (Лк 5, 17–26).**

**Аўтар:** Аднойчы, калі Езус навучаў, былі там фарысеі і кніжнікі, якія прыйшлі з усіх вёсак Галілеі і Юдэі і з Ерузалема. І моц Пана была з Ім, каб мог аздараўляць. І вось людзі прынеслі на ложы паралізаванага чалавека, і спрабавалі ўнесці яго ў дом, і пакласці перад Ім. А калі праз натоўп не змаглі пранесці яго, залезлі на дах дома і праз страху спусцілі яго з насілкамі на сярэдзіну перад Езусам. Убачыўшы іх веру, Ён сказаў:

**Езус:** Чалавеча, адпускаюцца табе грахі твае.

**Аўтар:** А кніжнікі і фарысеі пачалі разважаць, кажучы:

**Кніжнікі і фарысеі:** Хто ён такі, што блюзнерыць? Хто можа адпускаць грахі, калі не сам Бог?

**Аўтар:** Пазнаўшы іх думкі, Езус сказаў ім у адказ:

**Езус:** Як думаеце ў сэрцах вашых? Што лягчэй? Сказаць: «Адпускаюцца табе грахі твае», ці сказаць: «Устань і хадзі»? Але каб вы ведалі, што Сын Чалавечы мае ўладу на зямлі адпускаць грахі.

**Аўтар:** І сказаў паралізаванаму:

**Езус:** Кажу табе: устань, вазьмі насілкі свае і ідзі да дому свайго.

**Аўтар:** Той адразу, устаўшы перад імі, узяў тое, на чым ляжаў, і пайшоў да дому свайго, славячы Бога. Жах ахапіў усіх, яны славілі Бога і, напоўненыя страхам, казалі: «Дзіўнае мы бачылі сёння».

**IV група. Галоўны герой — глуханямы (Мк 7, 31–37).**

**Аўтар:** І зноў выйшаў Езус з межаў Тыра і прайшоў праз Сідон да Галілейскага мора, пасярод зямель Дэкаполіса. І прывялі да Яго глуханямога, і прасілі, каб усклаў на яго руку. Адвёўшы яго далей ад натоўпу, Езус паклаў у яго вушы свае пальцы і, паслініўшы, дакрануўся да ягонага языка. Паглядзеўшы на неба, уздыхнуў і сказаў яму:

**Езус:** «Эффата»,

**Аўтар:** што значыць: «Адкрыйся». І адразу адкрыліся вушы ягоныя і развязаліся путы языка ягонага, і пачаў гаварыць выразна. Тады Езус загадаў ім, каб нікому не казалі. Але колькі ні забараняў ім, яны апавядалі яшчэ больш. Будучы надзвычай здзіўленымі, яны казалі: «Ён зрабіў усё добра: учыніў, што глухія чуюць, а нямыя гавораць!»

*Вучні паказваюць сцэнкі.*

*Катэхет задае вучням пытанні:*

— Які момант са сцэнак для вас быў самым хвалюючым?

— Што вы зразумелі з гэтых сцэнак?

— Якія словы і дзеянні Езуса Хрыста вам найбольш запомніліся?

— Што неабходна чалавеку, каб атрымаць ласку аздараўлення?

*Катэхет прапаноўвае вучням самастойна папрацаваць з тэкстам (заданне ў сшытку № 2).*

Выкарыстоўваючы біблійныя тэксты — Мк 1, 40–45; Мк 10, 46–52; Лк 5, 17–26; Мк 7, 31–37, адкажыце на пытанні. Адказы запішыце ў табліцу:

| Да сустрэчы з Езусам | Сляпы Бартымэй<br><br>(можна ўставіць выявы) | Пракажоны | Паралізаваны | Глуханямы |
|---|---|---|---|---|
| Месца сустрэчы з Хрыстом | | | | Каля Галілейскага мора |
| Пра што прасілі Езуса? | | | | Ускласці на яго руку |
| Што Езус зрабіў? | | | | «Пагглядзеўшы на неба, уздыхнуў і сказаў яму: „Эффата“, што значыць: „Адкрыйся“. |
| Што Езус сказаў? | | | | «Адвёўшы яго далей ад натоўпу, паклаў у яго вушысвае пальцы і, пасліліўшы, дакрануўся да ягонага языка». |
| Пасля сустрэчы з Езусам | | | | «І адразу адкрыліся вушы ягоныя і развязаліся путы языка ягонага, і пачаў гаварыць выразна». |
| Рэакцыя людзей на цуд | | | | «Будучы надзвычай здзіўленымі, яны казалі: „Ён зрабіў ўсё добра: учыніў, што глухія чуюць, а нямыя гавораць!“» |

**Чалавек адказвае Богу**

Езус прыйшоў абвясціць нам пра надыход цалкам новага свету, дзе не будзе граху, хваробаў і смерці. Гэты свет ужо аб’яўлены праз уваскрасенне Езуса Хрыста, але канчаткова ён надыдзе пасля Яго другога прыйсця. Тады Пан Бог вытра апошнюю слязу з нашых вачэй, не будзе пакутаў, болю і смерці.

Адзін з учынкаў міласэрнасці для цела бліжняга вучыць нас наведваць хворых. Клопат, спачуванне і малітва — менавіта праз гэта мы можам

праявіць сваю любоў да хворых і салідарнасць з імі. У сакрамэнце намашчэння хворых Езус Хрыстус прыходзіць на дапамогу хворым людзям, дае ім асаблівую ласку, якая цесна яднае хворых з пакутамі Езуса, прыносіць ім суцяшэнне, спакой і мужнасць, каб яны змаглі вытрымаць усе цяжкасці. А калі хворы ужо не ў стане паспавядацца, прыняты сакрамэнт дае адпушчэнне грахоў.

Выкарыстоўваючы словы акраверша, адкажыце на пытанне *(заданне ў сшытку № 3):*

— Што мы можам зрабіць для хворага чалавека?

| | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | Х | | | | | | | | |
| | | | | | | | | В | | | | | | | | |
| | | | | | | | | А | | | | | | | | |
| | | | | | | | | Р | | | | | | | | |
| | | | | | | | | О | | | | | | | | |
| | | | | | | | | Б | | | | | | | | |
| | | | | | | | | А | | | | | | | | |

**Разважанне**

*Катэхет задае вучням пытанні:*

— Да каго ты звяртаешся, калі хварэеш і пакутуеш?

— Як ты ставішся да хворых людзей?

— Як ты ставішся да інвалідаў?

— Як часта ты молішся за хворых людзей?

— Што ты можаш і хочаш зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з Ім?

**Пастанова**

Катэхет прапануе вучням запісаць пастанову ў сшытак.

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям'і і сябрам пра цуды Езуса Хрыста.

— На працягу гэтага тыдня памаліся за хворых. Калі ўзнікне такая неабходнасць, наведай хворага.

**Заключная малітва**

*Малітва за хворага*

Пане Езу, падчас свайго зямнога жыцця Ты аказваў Сваю любоў церпячым, не мог заставацца абыякавым да чалавечага болю і столькі разоў вяртаў здароўе хворым, а іх сем'ям — радасць і надзею. Наш N. *(імя)* вельмі хворы. Мы апякуемся ім і робім усё, што можам, але адчуваем сябе бяссільнымі, бо ведаем, што яго жыццё не знаходзіцца ў нашых руках. Ахвяруем Табе нашае з ім цярпенне, далучаючы яго да Тваёй мукі. Учыні, каб

гэтая хвароба дапамагла нам лепей зразумець сэнс жыцця, а  на нашага хворага N. спашлі дар здароўя, каб мы маглі заўсёды Табе дзякаваць і праслаўляць Тваю веліч. Няхай станецца паводле Тваёй волі. Амэн.

## Тэма 13. Езус выганяе злых духаў

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з біблійнымі гісторыямі пра тое, як Езус выганяў злых духаў; дапамагчы вучням зразумець, што Езус Хрыстус робіць гэта моцаю Божаю, што з Езусам можна перамагчы зло.

**Выхаваўчая мэта:**

фарміраваць у вучняў імкненне пазбягаць зла і адракацца ад любых яго праяваў.

**Матэрыялы:**

Біблія: Мк 1, 23–27; Мц 12, 28; Мк 5, 1–15; Мк 9, 17–29

Ілюстрацыя: «Езус выганяе злога духа», а таксама надпісы: «Што Табе да нас, Езус Назаранін? Ты прыйшоў загубіць нас? Я ведаю Цябе, хто Ты: Святы Божы» (Мк 1, 24); «Але Езус забараніў яму, кажучы: „Змоўкні і выйдзі з яго!“ (Мк 1, 25); «А калі Я выганяю злых духаў Божым Духам, то настала для вас Валадарства Божае» (Мц 12, 28).

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразом, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагмента з фільма, дыялог, праца ў групах, пісьмовая праца на аснове тэксту, прэзентацыя, творчая майстэрня — пантаміма.

### Ход занятку

**Малітва**

Тваёй абароне

**Праверка хатняга задання**

*Катэхет прапаноўвае вучням падзяліцца сваім вопытам малітвы за хворых, а таксама распавесці, ці атрымалася ў іх наведаць хворых.*

*Пры паўтарэнні хатняга задання можна карыстацца крыжаванкамі, змешчанымі ў канцы сшытка (крыжаванка № 12).*

**Чалавек пытаецца**

*Катэхет ставіць з вучнямі пантаміму «Банты».*

Бог стварае чалавека, паказвае яму ўсё створанае і сыходзіць. Нейкі час чалавек разглядае навакольны свет, пускае птушак і г. д. З’яўляецца дзяўчына, якая нясціпла сябе паводзіць. Яна зацікаўлівае чалавека. Той дазваляе ёй апрануць яму на руку акову — стужку ці бант. Другі канец яна трымае ў сабе. Потым уваходзіць персанаж, які ўвасабляе другую спакусу — грошы. Трэці прапануе наркотыкі, чацвёрты — алкаголь. Кожны з гэтых персанажаў апранае чалавеку на руку сваю павязку і адыходзіць убок. Такім чынам,

чалавек застаецца пасярод сцэны, а гэтыя чацвёра стаяць па двое з розных бакоў. Яны пачынаюць кіраваць ім, як марыянеткай. Чалавек спрабуе кудысьці ісці, рабіць нейкія рухі, але тыя чацвёра кантралююць яго. Чалавек, змучыўшыся, нізка схіляецца. Уваходзіць Хрыстус. Ён падыходзіць ззаду і ўкладвае свае рукі ў банты. Чацвёра ўкрыжоўваюць Яго, але Хрыстус уваскрасае і пазбаўляецца ад бантоў. Усе чацвёра падаюць, церпячы паражэнне. Хрыстус пераможна ўзвышаецца над імі, а чалавек становіцца перад Ім на калені. Гучыць урачыстая музыка.

*Катэхет задае вучням пытанні:*

— Як гэта — быць марыянеткай? Чаму?

— Што вы зразумелі з гэтай пантамімы?

**Бог адказвае**

*Катэхет вешае на дошку ілюстрацыю:* «Езус выганяе злога духа», *а таксама надпісы:* «Што Табе да нас, Езус Назаранін? Ты прыйшоў загубіць нас? Я ведаю Цябе, хто Ты: Святы Божы» (Мк 1, 24); «Але Езус забараніў яму, кажучы: „Змоўкні і выйдзі з яго!“ (Мк 1, 25); «А калі Я выганяю злых духаў Божым Духам, то настала для вас Валадарства Божае» (Мц 12, 28).

*Катэхет дае вучням магчымасць праслухаць чатыры фрагменты з аўдыёзапісу Бібліі: Мк 1, 23–27; Мц 12, 28; Мк 5, 1–15; Марк 9, 17–29.*

*Катэхет дзеліць вучняў на 3 групы і раздае карткі з фрагментамі Бібліі (у сшытку заданне № 1):*

1) Мк 1, 23–27; Мц 12, 28;
2) Мк 5, 1–15;
3) Мк 9, 17–29.

**I группа: Мк 1, 23–27; Мц 12, 28.**

Прачытай біблійныя тэксты і адкажы на пытанні:

— Дзе Езус сустрэў апанаванага злым духам?

— Што крычаў злы дух?

— Як адрэагаваў на гэта Езус?

— Што Езус сказаў злому духу?

— Што злы дух зрабіў?

— Якая была рэакцыя ў людзей на цуд?

— Якою моцаю Езус выганяў злых духаў?

**II група: Мк 5, 1–15.**

Прачытай біблійныя тэксты і адкажы на пытанні:

— Дзе Езус сустрэў апанаванага злым духам?

— Дзе жыў апанаваны?

— Як да яго ставіліся людзі? Чаму?

— Як апанаваны сустрэў Езуса? Што ён сказаў Езусу?

— Што Езус адказаў апанаванаму?

— Пра што прасілі Езуса злыя духі?

— Што здарылася са свіннямі, калі злыя духі ўвайшлі ў іх?

— Якую праўду пра злых духаў адкрываюць нам свінні, што патанулі ў моры?

— Як сябе паводзіў і адчуваў вызвалены ад злых духаў чалавек?

— Якая была рэакцыя ў людзей на гэты цуд?

**III група: Мк 9, 17–29.**

Прачытай біблійныя тэксты і адкажы на пытанні:

— Хто прыйшоў да Езуса і з якой просьбай?

— Па якіх прыкметах можна пазнаць чалавека, апанаванага злым духам?

— Калі злы дух убачыў Езуса, што ён зрабіў з апанаваным?

— Як ты разумееш словы Езуса: «Усё магчыма для таго, хто верыць»?

— Што Езусу адказаў бацька апанаванага?

— Якімі словамі Езус выгнаў злога духа?

— Чаму вучні не маглі выгнаць злога духа?

*Вучні дзеляцца сваімі адказамі.*

*Катэхет прапаноўвае вучням зрабіць пісьмовае заданне ў сшытку.*

На падставе біблійных тэкстаў (**Мк 5, 1–15; Мк 9, 17–29)** запоўні табліцу *(у сшытку заданне № 2).*

| Жыццё апанаванага чалавека | Словы і дзеянні Езуса | Жыццё вызваленага ад апанаванасці чалавека |
|---|---|---|
| | | |
| | | |

*Катэхет:*

Выгнанне злога духа — першы цуд, апісаны св. Маркам. Ён глыбока сімвалічны. Езус рашуча супрацьстаіць злу. У прысутнасці Пана злыя духі трацяць сваю моц. Там, дзе гучыць Яго слова, няма месца цемры.

Праз грэх зло і смерць увайшлі ў жыццё чалавека. І пакуль у злых духаў ёсць права жыць на зямлі, імі кіруе імкненне авалодаць душамі людзей, у якіх яны атрымліваюць спакой і прытулак, а таксама выратаванне ад таго, каб быць раней часу адпраўленымі ў пекла. Часцей за ўсё адным чалавекам авалодвае адзін дэман, але часам у яго могуць усяліцца адразу некалькі злых духаў. Злы дух авалодвае чалавекам з мэтай парушыць сувязь апанаванага з Богам і падштурхнуць яго да дрэнных учынкаў; спакусіць да бязвер’я; прымусіць чалавека ілгаць; апаганіць яго душу. Дэманы няспынна мучаюць апанаванага чалавека і могуць нават выклікаць хваробы: псіхічнае расстройства (Мк 5, 1), эпілепсію (Мк 9, 18), скрыўленне пазваночніка (Лк 13, 11), або зрабіць чалавека нямым (Мц 9, 32), адначасова нямым і сляпым

(Мц 12, 22). Злыя духі, якія прыносяць чалавеку такія пакуты, адрозніваюцца па ступені жорсткасці (Мц 12, 45). Але іх нязменная мэта — загубіць чалавека, каб потым адправіць яго ў валадарства свайго пана (Мк 9, 22).

ПРЫКМЕТЫ АПАНАВАНАСЦІ: выкрыкі, якія вырываюцца ў чалавека не па яго волі, кароткачасовыя неспакойныя паводзіны: скрыгатанне зубамі, прыпадкі, незвычайная фізічная сіла, якая кідаецца ў вочы; рэзкае супрацьстаянне любому боскаму ўплыву; эпілептычныя прыпадкі, сутаргі, якімі суправаджаецца выхад злога духа з апанаванага.

ПРЫЧЫНЫ АПАНАВАНАСЦІ могуць быць самымі разнастайнымі. Свядомае ўтойванне цяжкага граху, звычка брыдкасловіць і блюзнерыць, ілжывая клятва і іншыя дрэнныя ўчынкі могуць даць злому духу нагоду ўсяліцца ў чалавека. Часта апанаванасць чалавека – гэта вынік заняткаў акультызмам: чараўніцтва, выклікання духаў, наведвання празорцаў або спірытычных сходаў. Нашэнне амулетаў, слуханне сатанінскай музыкі, лячэнне гамеапатычнымі лекамі і г. д. — усё гэта можа быць прычынаю для таго, каб д’ябал авалодаў душой чалавека.

ВЫЗВАЛЕННЯ АД ЗЛЫХ ДУХАЎ можна дасягнуць толькі шчырым пакаяннем і адрачэннем ад сатаны, заснаваным на веры ў перамогу, якую Езус Хрыстус дзякуючы свайму крыжу атрымаў над д’яблам. Езус прыйшоў, каб разбурыць справы д’ябла. Ён аздараўляў апанаваных, выганяючы з іх дэманаў. Моцаю выганяць злых духаў Ён надзяліў і сваіх Апосталаў. У касцёле ёсць святары-экзарцысты. Яны прызначаюцца мясцовым біскупам для таго, каб іменем Езуса Хрыста і моцаю Божаю выганяць злых духаў.

Чым больш апанаваны напаўняецца Духам Божым, тым хутчэй слабее ўлада д’ябла над ім, і ў рэшце рэшт ворагу даводзіцца — часта пасля ўпартай барацьбы — выйсці з чалавека. Таму пакорымся Богу і будзем супрацьстаяць д’яблу, тады ён уцячэ ад нас.

**Чалавек адказвае Богу**

*Катэхет паказвае вучням нехрысціянскія сімвалы-знакі, якія ёсць вакол нас, і тлумачыць іх сэнс. Затым паказвае прэзентацыю «Небяспека».*

*Катэхет задае вучням пытанні (у сшытку заданне № 3):*

— Якія сімвалы і знакі вы носіце на сабе?

— У якія гульні вы гуляеце, якія перадачы і фільмы глядзіце?

— Што неабходна зрабіць з прадметамі, на якіх знаходзяцца гэтыя сімвалы?

**Разважанне**

— Дзе вы шукаеце дапамогі ў барацьбе са злым духам?

— Ці не гулялі вы ў гульні, ці не глядзелі перадачы і фільмы, звязаныя са злымі духамі?

— Ці не носіце вы на сабе амулеты, знакі задыякаў і іншыя нехрысціянскія сімвалы?

— Што вы як хрысціяне павінны насіць на шыі?

— Ці не займаецеся вы акультызмам?

— Ці выракаецеся вы д’ябла і ўсіх яго справаў?

— Што вы можаце і хочаце зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з Ім?

**Пастанова**

Катэхет прапануе вучням запісаць пастанову ў сшытак.

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям’і і сябрам пра тое, як Езус выганяе злых духаў.

— Вывучы на памяць малітву да святога арханёла Міхала і маліся ёю на працягу тыдня.

**Заключная малітва**

Малітва да святога арханёла Міхала.

## Тэма 14. Езус уваскрашае з мёртвых

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з біблійнымі гісторыямі пра тое, як Езус Хрыстус уваскрасіў сына ўдавы з Наіна, дачку Яіра і Лазара; дапамагчы вучням зразумець, што Езус Хрыстус — усемагутны Бог, што Ён можа ўваскрашаць з мёртвых.

**Выхаваўчая мэта:**

умацоўваць у вучнях веру ў тое, што Езус Хрыстус з'яўляецца Панам жыцця і смерці.

**Матэрыялы:**

Біблія: Ян 11, 17–45; Лк 7, 11–16; Лк 8, 41–56.

Ілюстрацыі:

1) «Уваскрашэнне Лазара», надпіс да ілюстрацыі: «Я — уваскрасенне і жыццё. Хто верыць у Мяне, калі нават і памрэ, будзе жыць» (Ян 11, 25);

2) «Уваскрашэнне дачкі Яіра», надпіс да ілюстрацыі: «Не бойся, толькі вер — і яна будзе ўратаваная» (Лк 8, 50);

3) «Уваскрашэнне сына ўдавы з Наіна», надпіс да ілюстрацыі: «Хлопча, кажу табе, устань!» (Лк 7, 14).

Фрагмент з фільма пра тое, як Езус уваскрашае.

Абраз «Уваскрасенне Хрыста».

Мелодыя для медытацыі.

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразом, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагмента з фільма, дыялог, праца ў групах, пісьмовая праца на аснове тэксту, творчая майстэрня — сачыненне-выказванне ад імя біблійнага персанажа.

### Ход занятку

**Малітва**

Памолімся за людзей, у якіх памерлі блізкія і дарагія іх сэрцу людзі, каб яны ў Пану Богу атрымалі суцяшэнне.

*Чытаецца «Малітва аб суцяшэнні».*

**Праверка хатняга задання**

*Катэхет задае вучням пытанні:*

— Ад якіх прадметаў вы пазбавіліся?

— У якія гульні вы перасталі гуляць?

— Якія перадачы, фільмы і музыку вы перасталі глядзець і слухаць?

*Пры паўтарэнні хатняга задання можна карыстацца крыжаванкамі, змешчанымі ў канцы сшытка (крыжаванка № 13).*

**Чалавек пытаецца**

*Катэхет задае вучням пытанні (у сшытку заданне № 1):*

— Якія пачуцці выклікае ў вас слова «смерць»?

— Якім чынам смерць увайшла ў жыццё чалавека?

— Хто з вас у апошні час страціў кагосьці блізкага?

— Што мы адчуваем, калі паміраюць блізкія і любімыя намі людзі?

**Бог адказвае**

*Катэхет:*

Мы ведаем пра тое, што смерці Пан Бог не ствараў. Смерць увайшла ў жыццё чалавека пасля грэхападзення. Сёння мы з вамі даведаемся пра тое, як Езус адносіўся да смерці.

Катэхет вешае на дошку ілюстрацыі і надпісы:

1) «Уваскрашэнне Лазара», надпіс: «Я — уваскрасенне і жыццё. Хто верыць у Мяне, калі нават і памрэ, будзе жыць» (Ян 11, 25);

2) «Уваскрашэнне дачкі Яіра», надпіс: «Не бойся, толькі вер — і яна будзе ўратаваная» (Лк 8, 50);

3) «Уваскрашэнне сына ўдавы з Наіна», надпіс: «Хлопча, кажу табе, устань!» (Лк 7, 14).

*Катэхет дае вучням магчымасць праслухаць аўдыёзапіс біблійных тэкстаў: Ян 11, 17–45; Лк 7, 11–16; Лк 8, 41–56.*

*Можна паказаць фрагмент з фільма пра тое, як Езус уваскрашае.*

*Катэхет дзеліць вучняў на тры групы, раздае ім карткі з біблійнымі тэкстамі: Ян 11, 17–45; Лука 7, 11–16; Лука 8, 41–56, і прапаноўвае вучням самастойна папрацаваць з імі (у сшытку заданне № 2).*

I група

1. Уважліва прачытайце фрагмент са Святога Евангелля паводле Лукі (7, 11–16).

2. Падрабязна апішыце гэтую гісторыю ад імя ўдавы з Наіна. Для таго, каб гэта зрабіць, вы павінны ўявіць і адчуць гэта, як удава з Наіна. *Напрыклад: «Я жыву ў Наіне. Нядаўна ў мяне памёр муж. Нам з сынам было вельмі цяжка...» (пажадана апісваць пачуцці, якія яна перажывала, і дзеянні, якія рабілі героі гэтага сюжэта... Што адчула ўдава, калі памёр яе сын, калі Езус падышоў да яе, калі яна ўбачыла ўваскрослага сына?)*

**Святое Евангелле паводле Лукі 7, 11–16**

«На наступны дзень Езус пайшоў у горад, які называўся Наін, і разам з Ім ішлі вучні Ягоныя і вялікі натоўп. Калі ж Ён наблізіўся да гарадской

брамы, выносілі з яе памерлага, адзінага сына ў маці, якая была ўдавою. І шмат людзей з горада ішло разам з ёю. Убачыўшы яе, Пан зліТаваўся над ёю і сказаў: „Не плач!“ І, падышоўшы, дакрануўся да насілак. Тыя, хто нёс, спыніліся, а Ён сказаў: „Хлопча, кажу табе, устань!“ Мёртвы сеў і пачаў гаварыць. І аддаў яго Езус маці ягонай. Усіх жа ахапіў страх, і славілі Бога, кажучы: „Вялікі прарок паўстаў сярод нас“ і: „Бог наведаў свой народ“.

II група

1. Уважліва прачытайце фрагмент са Святога Евангелля паводле Лукі (8, 41–56).

2. Падрабязна апішыце гэту гісторыю ад імя Яіра. Для таго, каб гэта зрабіць, вы павінны ўявіць і адчуць гэта, як Яір. *Напрыклад: «Я — начальнік сінагогі, мяне завуць Яір. У мяне ёсць сям'я, жонка і дачка...» (пажадана апісваць пачуцці, якія ён перажываў, і дзеянні, якія рабілі героі гэтага сюжэта...)*

**Святое Евангелле паводле Лукі 8, 41–42, 49–56**

«І вось прыйшоў чалавек, па імені Яір, які быў кіраўніком сінагогі. Ён прыпаў да ног Езуса і стаў упрошваць Яго зайсці да дому ягонага, таму што яго адзіная дачка, узростам каля дванаццаці гадоў, памірала. Калі Езус пайшоў, натоўп ціснуўся да Яго. <…>

Калі Ён яшчэ гаварыў, прыйшоў нехта з дому ад кіраўніка сінагогі і сказаў: „Твая дачка памерла, больш не турбуй Настаўніка“. Але Езус, пачуўшы гэта, адказаў яму: „Не бойся, толькі вер — і яна будзе ўратаваная“. Прыйшоўшы ў дом, Ён не пусціў з сабой нікога, акрамя Пятра, Яна і Якуба, бацькі і маці дзяўчынкі. І ўсе галасілі і смуткавалі па ёй. Але Ён сказаў: „Не плачце, яна не памерла, а спіць“. І насміхаліся з Яго, бо ведалі, што яна памерла. Тады Ён, узяўшы яе за руку, паклікаў яе: „Дзяўчынка, устань!“ І вярнуўся дух яе, і яна адразу паднялася, а Ён загадаў даць ёй паесці. І здзівіліся бацькі яе. А Езус наказаў ім нікому не расказваць, што адбылося».

III група

1. Уважліва прачытайце фрагмент са Святога Евангелля паводле Яна (11, 17–45).

2. Падрабязна апішыце гэту гісторыю ад імя Марфы, сястры Лазара. Для таго, каб гэта зрабіць, вы павінны ўявіць і адчуць гэта, як Марфа. *Напрыклад: «Я жыву ў Бэтаніі. У мяне памёр брат Лазар. Мы з сястрой Марыяй...» (пажадана апісваць пачуцці, якія яна перажывала, і дзеянні, якія рабілі героі гэтага сюжэта... Што адчувала Марфа, калі памёр яе брат, калі яна пачула словы Езуса, калі ўбачыла ўваскрослага брата?..)*

**Святое Евангелле паводле Яна 11, 17–45**

«Прыйшоўшы, Езус даведаўся, што Лазар ужо чатыры дні ў магіле. Бэтанія была блізка ад Ерузалема, каля пятнаццаці стадыяў. Многія з юдэяў

прыйшлі да Марты і Марыі, каб суцешыць іх у смутку па браце. Калі Марта пачула, што ідзе Езус, яна выйшла Яму насустрач, а Марыя сядзела дома. Тады Марта сказала Езусу: „Пане, калі б Ты быў тут, не памёр бы брат мой! Але і цяпер ведаю, што аб чым бы Ты ні папрасіў Бога, Бог дасць Табе“. Езус сказаў ёй: „Уваскрэсне брат твой“. Марта сказала Яму: „Я ведаю, што ўваскрэсне падчас уваскрашэння ў апошні дзень“. Езус сказаў ёй: „Я — уваскрасенне і жыццё. Хто верыць у Мяне, калі нават і памрэ, будзе жыць. А кожны, хто верыць у Мяне, не памрэ ніколі. Ці верыш у гэта?“ Яна адказала Яму: „Так, Пане. Я веру, што Ты Месія, Сын Божы, які павінен быў прыйсці ў свет“.

Сказаўшы гэта, пайшла і паклікала сваю сястру Марыю, сказаўшы патаемна: „Настаўнік тут, Ён кліча цябе“. Калі яна пачула гэта, устала хутка і пайшла да Яго. Езус яшчэ не ўвайшоў у вёску, але заставаўся на тым месцы, дзе Яго сустрэла Марта. Юдэі, якія былі з ёю ў доме і суцяшалі яе, убачылі, што Марыя хутка ўстала і выйшла, і пайшлі за ёю, думаючы, што яна ідзе да магілы, каб там плакаць. Калі Марыя прыйшла туды, дзе быў Езус, і ўбачыла Яго, яна ўпала да ног Ягоных і сказала Яму: „Пане, калі б Ты быў тут, не памёр бы брат мой!“ Тады Езус, убачыўшы, што яна плача і што плачуць юдэі, якія прыйшлі разам з ёю, сам глыбока ўзрушыўся і ўсхваляваўся ды сказаў: „Дзе вы паклалі яго?“ І адказалі: „Пане, ідзі і паглядзі“. Езус заплакаў. Юдэі ж казалі: „Глядзі, як Ён любіў яго!“ А некаторыя зіх сказалі: „Ці не мог ён, які адкрыў вочы сляпому, зрабіць, каб і гэты не памёр?“

Езус жа, ізноў глыбока ўзрушаны, ідзе да магілы. Была ж гэта пячора, і камень ляжаў на ёй. Сказаў Езус: „Адсуньце камень!“ Сястра памерлага, Марта, кажа Яму: „Пане, ужо смярдзіць, бо чацвёрты дзень, як памёр!“ Езус сказаў ёй: „Ці не казаў Я табе, што, калі будзеш верыць, убачыш славу Божую?“ Тады адсунулі камень. А Езус узняў вочы ўгару і сказаў: „Ойча, дзякую Табе, што Ты пачуў Мяне. Я ведаў, што Ты заўсёды чуеш Мяне. Але сказаў дзеля натоўпу, які стаіць вакол, каб паверылі, што Ты паслаў Мяне“. І, сказаўшы гэта, крыкнуў моцным голасам: „Лазар, выйдзі вонкі!“ І выйшаў памерлы з нагамі і рукамі, абвязанымі палатном, а твар ягоны быў абвязаны хусткаю. Кажа ім Езус: „Развяжыце Яго і дазвольце яму хадзіць“.

Тады многія з юдэяў, якія прыйшлі да Марыі і бачылі, што ўчыніў Езус, паверылі ў Яго».

*Вучні дзеляцца вынікамі сваёй творчасці.*

Катэхет задае вучням пытанні (у сшытку заданне № 2):

— Як вы сябе адчувалі ў ролі біблійных персанажаў?

— Што аказала на вас найбольшае ўражанне?

— Якія словы і ўчынкі Езуса вам запомніліся?

— Што вам спадабалася?

— Што новага вы даведаліся пра Езуса Хрыста?

*Катэхет прапаноўвае вучням, карыстаючыся тэкстамі са Святога Пісання (Ян 11, 17–45; Лк 7, 11–16; Лк 8 41–56), запоўніць табліцу (у сшытку заданне № 3).*

| Каго ўваскрасіў Езус? | Дзеянні Езуса | Ключавыя словы Езуса | Рэакцыя сведкаў цуду |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |
| | | | |

**Чалавек адказвае Богу**

Бог з'яўляецца крыніцай жыцця. Ён усемагутны, і ў Яго руках знаходзіцца наша жыццё. Езус — наша Пасха, і ў Ім мы ўсе ўваскрэснем. У Апостальскім сімвале веры мы вызнаём веру ва ўваскрашэнне цела. Мы чакаем уваскрашэння з мёртвых.

*Катэхет прапаноўвае вучням напісаць пісьмо-суцяшэнне сябру, сяброўцы, які страціў блізкага і любімага чалавека (у сшытку заданне № 4).*

**Разважанне**

*Катэхет задае вучням пытанні:*

— Як часта вы моліцеся за памерлых?

— Калі вы апошні раз прыбіралі на могілках?

— Ці былі вы ўважлівыя да бліжніх, у якіх памерлі блізкія ім людзі?

— Што вы можаце і хочаце зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з Ім?

**Пастанова**

*Катэхет прапануе вучням запісаць пастанову ў сшытак.*

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям'і і сябрам пра тое, як Езус уваскрасіў сына ўдавы з Наіна, дачку Яіра і Лазара.

— Наведай могілкі і памаліся за памерлых малітвай «Анёл Панскі», вывучы гэтую малітву на памяць.

**Заключная малітва**

*Вучні запрашаюцца на кароткую медытацыю. На дошцы вісіць абраз Уваскрослага Езуса і надпіс: «Я — уваскрасенне і жыццё. Хто верыць у Мяне, калі нават і памрэ, будзе жыць. А кожны, хто верыць у Мяне, не памрэ ніколі. Ці верыш у гэта?» (Ян 11, 25–26). Уключаецца ціхая мелодыя. Катэхет просіць вучняў, каб у глыбіні сваіх сэрцаў яны засяродзіліся над словамі: «Я — уваскрасенне і жыццё. Хто верыць у Мяне, калі нават і памрэ, будзе жыць. А кожны, хто верыць у Мяне, не памрэ ніколі. Ці верыш у*

*гэта?» І калі сэрцы вучняў напоўняцца зместам гэтага ўрыўка, няхай яны шчыра адкажуць Езусу Хрысту.*

## Тэма 15. Езус сустракаецца з грэшнікамі

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з біблійнымі гісторыямі пра сустрэчы Езуса з жанчынай, злоўленай на чужаложстве, і з мытнікам Левіем; дапамагчы вучням зразумець, што Пан Бог — Найвышэйшы Суддзя, і толькі Ён можа справядліва судзіць людзей, а чалавек не павінен асуджаць бліжніх.

**Выхаваўчая мэта:**

умацоўваць у вучнях веру ў тое, што Езус Хрыстус з’яўляецца Панам жыцця і смерці.

**Матэрыялы:**

Біблія: Ян 8, 1–11; Лк 5, 27–32

Ілюстрацыі:

1) «Езус і жанчына, злоўленая на чужаложстве», надпісы да ілюстрацыі: «Хто з вас без граху, няхай першы кіне ў яе камень» (Ян 8, 7), «І Я не асуджаю цябе. Ідзі і адгэтуль больш не грашы» (Ян 8, 11).

2) «Езус і Левій», надпісы да ілюстрацыі: «Ідзі за Мною» (Лк 5, 27), «Я прыйшоў заклікаць да пакаяння не праведнікаў, а грэшнікаў» (Лк 5, 32).

Фрагмент з фільма пра сустрэчу Езуса з жанчынай, злоўленай на чужаложстве, і з мытнікам Левіем.

Ксеракопія тытульнай старонкі газеты ці часопіса, зробленая такім чынам, каб на ёй было месца для напісання вучнямі свайго рэпартажу.

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразам, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагмента з фільма, дыялог, праца ў парах, праца ў групах, пісьмовая праца на аснове тэксту, творчая майстэрня — напісанне рэпартажу для газеты.

### Ход занятку

**Малітва**

Песня «Настаўнік»

**Праверка хатняга задання**

*Катэхет правярае веданне малітвы «Анёл Панскі», а таксама біблійных гісторый пра ўваскрашэнне.*

*Пры паўтарэнні хатняга задання можна карыстацца крыжаванкамі, змешчанымі ў канцы сшытка (крыжаванка № 14).*

**Чалавек пытаецца**

*Катэхет прапануе вучням прачытаць міліцэйскія зводкі пра злачынствы (з газет ці з інтэрнэту).*

*Катэхет задае вучням пытанні:*

— Што вы адчувалі, калі слухалі зводкі пра злачынствы?

— Якія пачуцці ўзніклі ў вас да ахвяраў злачынстваў?

— Якія пачуцці ўзніклі ў вас да злачынцаў? Што вам хочацца з імі зрабіць?

*Вучні адказваюць.*

**Бог адказвае**

Сёння мы з вамі разгледзім, як Езус адносіўся да людзей, якія зграшылі.

*Катэхет вешае на дошку ілюстрацыі:*

1) «Езус і жанчына, злоўленая на чужаложстве», *надпісы да ілюстрацыі:* «Хто з вас без граху, няхай першы кіне ў яе камень» (Ян 8, 7), «І Я не асуджаю цябе. Ідзі і адгэтуль больш не грашы» (Ян 8, 11).

2) «Езус і Левій», *надпісы да ілюстрацыі:* «Ідзі за Мною» (Лк 5, 27), «Я прыйшоў заклікаць да пакаяння не праведнікаў, а грэшнікаў» (Лк 5, 32).

*Катэхет дае вучням магчымасць праслухаць аўдыёзапіс біблійных тэкстаў: Ян 8, 1–11; Лк 5, 27–32.*

*Можна паказаць фрагмент з фільма пра сустрэчу Езуса з жанчынай, злоўленай на чужаложстве, і з мытнікам Левіем (звярніце ўвагу на тое, каб фрагмент дакладна адлюстроўваў біблійны сюжэт).*

**Святое Евангелле паводле Яна 8, 1–11**

«Езус пайшоў на Аліўную гару, а раніцай зноў прыйшоў у святыню, і ўсе людзі ішлі да Яго, а Ён сеў і вучыў іх. Прывялі тады кніжнікі і фарысеі да Яго жанчыну, якую злавілі на чужаложстве і, паставіўшы яе пасярэдзіне, сказалі Яму: „Настаўнік, гэтую жанчыну злавілі на чужаложстве. У Законе ж Майсей наказаў нам каменаваць такіх. А Ты што скажаш?“ Яны казалі гэта, бо выпрабоўвалі Яго, каб мець у чым абвінаваціць Яго. Але Езус, схіліўшыся, пісаў пальцам на зямлі. Калі ж пыталіся ў Яго далей, Ён выпрастаўся і сказаў ім: „Хто з вас без граху, няхай першы кіне ў яе камень“. І зноў, схіліўшыся, пісаў на зямлі. Яны ж, калі пачулі гэта, адыходзілі адзін за адным, пачынаючы са старэйшых. Застаўся толькі Езус і жанчына, якая стаяла пасярэдзіне. Езус выпрастаўся і сказаў ёй: „Жанчына, дзе яны? Ніхто не асудзіў цябе?“ Яна адказала: „Ніхто, Пане“. Езус сказаў ёй: „І Я не асуджаю цябе. Ідзі і адгэтуль больш не грашы“».

**Святое Евангелле паводле Лукі 5, 27–32**

«Выйшаўшы пасля гэтага, Езус убачыў мытніка па імені Левій, які сядзеў на мытні, і сказаў яму: „Ідзі за Мною“. Той пакінуў усё, устаў і пайшоў за Ім. І наладзіў Левій для Яго вялікую гасціну ў сваім доме. Было там шмат мытнікаў і іншых, якія сядзелі з імі за сталом. І наракалі фарысеі і кніжнікі, кажучы вучням Ягоным: „Чаму вы ясце і п’яце з мытнікамі і

грэшнікамі?“ А Езус сказаў ім у адказ: „Не здаровым патрэбны лекар, а хворым. Я прыйшоў заклікаць да пакаяння не праведнікаў, а грэшнікаў“».

Катэхет падзяляе вучняў на дзве групы (у сшытку заданне № 1) і прапануе ім напісаць рэпартаж.

I група

1. Уважліва прачытайце фрагмент са Святога Евангелля паводле Яна (8, 1-11).

2. З дапамогаю пастаўленых пытанняў напішыце рэпартаж у газету ці часопіс пра гэтыя біблійныя падзеі. Катэхет дае вучням ксеракопію тытульнай старонкі газеты ці часопіса, зробленую такім чынам, каб на ёй было месца для напісання вучнямі свайго рэпартажу.

Пытанні:

1. Дзе адбылася сустрэча з Езусам?
2. Хто прыйшоў да Езуса?
3. З якой мэтай гэтыя людзі прыйшлі да Езуса?
4. Што рабіў Езус?
5. Што Езус ім адказаў?
6. Што адбылося з біблійным персанажам пасля таго, як ён сустрэўся з Езусам?
7. Што вы зразумелі з гэтай гісторыі?

II група:

1. Уважліва прачытайце фрагмент са Святога Евангелля паводле Лукі (5, 27–32).

2. З дапамогаю пастаўленых пытанняў напішыце рэпартаж у газету ці часопіс пра гэтыя біблійныя падзеі. Катэхет дае вучням ксеракопію тытульнай старонкі газеты ці часопіса, зробленую такім чынам, каб на ёй было месца для напісання вучнямі свайго рэпартажу.

Пытанні:

1. Дзе адбылася сустрэча з Езусам?
2. Хто прыйшоў да Езуса?
3. З якой мэтай гэтыя людзі прыйшлі да Езуса?
4. Што рабіў Езус?
5. Што Езус ім адказаў?
6. Што адбылося з біблійным персанажам пасля таго, як ён сустрэўся з Езусам?
7. Што вы зразумелі з гэтай гісторыі?

*Вучні прэзентуюць сваю творчасць.*

*Катэхет прапаноўвае вучням на аснове біблійных тэкстаў запоўніць табліцу (у сшытку заданне № 2).*

| Біблійны сюжэт | Ключавыя словы сюжэта | Чаму Езус нас вучыць? |
|---|---|---|
| Жанчына, злоўленая на чужаложстве *(можна ўставіць выяву)*<br>**Ян 8, 1-11** | | |
| Пакліканне Левія<br>**Лк 5, 27–32** | | |

*Вучні дзеляцца сваімі адказамі.*

**Чалавек адказвае Богу**

Пан Бог — Найвышэйшы Суддзя, толькі Ён ведае пра самае таемнае ў нашых сэрцах, і толькі Ён можа справядліва судзіць, таму што Ён нас любіць. Мы ўсе — браты і сёстры ў Хрысце. Часам нашы бліжнія робяць грахоўныя ўчынкі, але мы не маем права асуджаць іх, мы павінны папярэджваць іх, настаўляць, даваць парады, цярпліва зносіць надакучлівых людзей і маліцца аб навяртанні бліжніх.

*Катэхет прапаноўвае вучням самастойна папрацаваць з тэкстам (у сшытку заданне № 3).*

На аснове біблійнага тэксту напішы, чаго чакае ад нас Езус Хрыстус у штодзённым жыцці ў адносінах да нашых бліжніх.

**Святое Евангелле паводле Мацвея (7, 1–5)**

«Не судзіце, каб вас не судзілі. Бо якім судом вы судзіце, такім і вас асудзяць, і якой мераю мераеце, такой і вам будзе адмерана. Чаму бачыш шчэпку ў воку брата свайго, а бервяна ў сваім воку не заўважаеш? Або, як скажаш брату свайму: „Дазволь мне выняць шчэпку з вока твайго“, калі ў тваім воку бервяно? Крывадушнік, спачатку вымі бервяно са свайго вока і тады ўбачыш, як выняць шчэпку з вока твайго брата».

**Разважанне**

*Катэхет задае вучням пытанні:*

— Як ты адносішся да людзей, якія чыняць зло?

— Што змянілася ў тваіх адносінах да людзей, якія чыняць зло, пасля сённяшняга занятку?

— Як ты можаш дапамагчы бліжнім, якія грашаць?

— Ці молішся ты за навяртанне грэшнікаў?

— Што ты можаш і хочаш зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з Ім?

**Пастанова**

*Катэхет прапануе вучням запісаць пастанову ў сшытак.*

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям'і і сябрам пра сустрэчы Езуса з жанчынай, злоўленай на чужаложстве, і з мытнікам Левіем.

— На працягу гэтага тыдня штодзённа маліся малітвай аб навяртанні грэшнікаў *(гл. малітву ў канцы падручніка).*

**Заключная малітва**

Малітва аб навяртанні грэшнікаў

## Тэма 16. Езус сустракаецца з фарысеямі

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з біблійнымі гісторыямі пра сустрэчы Езуса з фарысеямі; дапамагчы вучням зразумець, што «фарысейская закваска» —крывадушнасць і сябелюбства, якія з'яўляюцца наступствам знешняй праведнасці, прывялі фарысееў да таго, што яны сталі ворагамі Езуса; дапамагчы вучням убачыць адносіны Езуса да сваіх ворагаў.

**Выхаваўчая мэта:**

фарміраваць у вучняў імкненне да сапраўднай праведнасці — шанавання Бога ўсім сэрцам, а не толькі вуснамі; выхоўваць у вучнях добразычлівыя адносіны да ворагаў.

**Матэрыялы:**

Біблія: Мц 9, 34–35; Мц 22, 15; Мк 8, 11; Лк 5, 30; Мц 12, 14; Ян 7, 32; Мц 15, 8; Мц 23, 25–28. 33; Мц 5, 44–45; Лк 23, 33–34.

Ілюстрацыі:

1) «Езус і фарысеі», надпіс да ілюстрацыі: «Сляпы фарысей, спачатку ачысці кубак унутры, каб ён стаў чыстым і звонку» (Мц 23, 26);

2) «Езус на крыжы», надпісы да ілюстрацыі: «Ойча, прабач ім, бо не ведаюць, што робяць» (Лк 23, 34); «А Я кажу вам: любіце ворагаў вашых і маліцеся за тых, хто пераследуе вас» (Мц 5, 44).

Карткі для запісу

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразом, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагмента з фільма, дыялог, праца ў групах, пісьмовая праца на аснове тэксту, творчая майстэрня — чытанне тэксту па ролях.

### Ход занятку

**Малітва**

Ойча наш...

**Праверка хатняга задання**

*Катэхет выпісвае словы на дошцы і прапаноўвае вучням выбраць правільныя адказы на пытанне:*

— Як дапамагчы бліжнім, якія завязлі ў грахах?

Асудзіць

Маліцца

Запужаць

Даць параду

Праклінаць
Помсціць
Прабачаць
Ненавідзець
Наставіць
Прасіць
Ігнарваць

*Пры паўтарэнні хатняга задання можна карыстацца крыжаванкамі, змешчанымі ў канцы сшытка (крыжаванка № 15).*

*Катэхет уводзіць вучняў у новую тэму.*

**Чалавек пытаецца**

У старажытнасці помста лічылася святой. «Вока за вока, зуб за зуб» — так гаварылася ў Старым Запавеце.

Цяпер уявім сабе, што сучасныя людзі жывуць паводле гэтага закону. Такі закон валадарыць у нашых дамах, у нашых школах, у нашай краіне... (*Заданне ў сшытку № 1)*

— Як выглядаў бы свет?
— Якія адносіны панавалі б паміж людзьмі?
— Якая атмасфера панавала б у нашым свеце без прабачэння?

**Бог адказвае**

Сёння мы з вамі даведаемся пра непрыяцеляў Езуса, пра Яго вучэнне, якое датычылася ворагаў, і пра тое, як Езус сам адносіўся да сваіх ворагаў.

*Катэхет вешае на дошку ілюстрацыі:*

1) «Езус і фарысеі», надпіс да ілюстрацыі: «Сляпы фарысей, спачатку ачысці кубак унутры, каб ён стаў чыстым і звонку» (Мц 23, 26);

2) «Езус на крыжы», надпісы да ілюстрацыі: «Ойча, прабач ім, бо не ведаюць, што робяць» (Лк 23, 34); «А Я кажу вам: любіце ворагаў вашых і маліцеся за тых, хто пераследуе вас» (Мц 5, 44).

Катэхет прапаноўвае вучням прачытаць па ролях тэкст, які складаецца з фрагментаў Евангелля.

**Аўтар:** А фарысеі казалі:

**Фарысеі:** Князем злых духаў Ён выганяе злых духаў.

**Аўтар:** І хадзіў Езус па ўсіх гарадах і паселішчах, навучаючы ў іхніх сінагогах, абвяшчаючы Евангелле Валадарства і вылечваючы ўсялякую хваробу і ўсялякую немач. Тады Фарысеі пайшлі і раіліся, як бы злавіць Езуса на слове. І выйшлі фарысеі, і пачалі спрачацца з Ім, патрабуючы ад Яго знаку з неба, каб выпрабаваць Яго. Але Ён уздыхнуў у духу сваім і сказаў:

**Езус:** Чаму гэтае пакаленне патрабуе знаку? Сапраўды кажу вам: не будзе дадзена знаку пакаленню гэтаму.

**Аўтар:** Пасля Ён пакінуў вучняў, зноў сеў у човен і адплыў на другі бок. І наракалі фарысеі і кніжнікі, кажучы вучням Ягоным:

**Фарысей:** Чаму вы ясце і п’яце з мытнікамі і грэшнікамі?

**Езус:** Не здаровым патрэбны лекар, а хворым. Я прыйшоў заклікаць да пакаяння не праведнікаў, а грэшнікаў.

**Аўтар:** Фарысеі ж выйшлі і мелі нараду супраць Езуса, як бы загубіць Яго. Але Езус, даведаўшыся, адышоў адтуль.

Фарысеі ж пачулі, як народ абураецца, і паслалі першасвятары і фарысеі слуг схапіць Яго.

**Езус:** Народ гэты шануе Мяне вуснамі, а сэрца іхняе далёка ад Мяне.

Гора, вам кніжнікі і фарысеі, крывадушнікі, таму што звонку ачышчаеце кубак і місу, а ўнутры яны поўныя драпежнасці і нястрыманасці! Сляпы фарысей, спачатку ачысці кубак унутры, каб ён стаў чыстым і звонку. Гора вам, кніжнікі і фарысеі, крывадушнікі, бо вы падобныя да пабеленых трунаў, якія звонку здаюцца прыгожымі, але ўнутры поўныя касцей нябожчыкаў і ўсялякай нячыстасці! Так і вы звонку здаяцеся людзям справядлівымі, але ўнутры поўныя крывадушша і беззаконня. Вужы, пакаленне змяінае, як вы пазбегнеце прысуду да геены?

А Я кажу вам: любіце ворагаў вашых і маліцеся за тых, хто пераследуе вас, каб сталіся вы сынамі Айца вашага, які ў нябёсах. Бо Ён загадвае сонцу свайму ўзыходзіць над дрэннымі і добрымі і пасылае дождж на справядлівых і несправядлівых.

**Аўтар:** І калі прыйшлі на месца, званае Чэрап, там укрыжавалі Яго і злачынцаў, аднаго з правага, другога з левага боку. А Езус сказаў:

**Езус:** Ойча, прабач ім, бо не ведаюць, што робяць.

**Аўтар:** І, дзелячы вопратку Ягоную, кідалі лёсы.

*Катэхет дзеліць вучняў на тры групы, раздае карткі з біблійнымі тэкстамі і прапаноўвае вучням самастойна папрацаваць з імі (заданне ў сшытку № 2).*

І група

Знайдзіце наступныя фрагменты з Евангелля: Мц 9, 34–35; Мц 22, 15; Мк 8, 11; Лк 5, 30; Мц 12, 14; Ян 7, 32.

Пісьмова адкажыце на пытанні:

— Як фарысеі адносіліся да Езуса?

— Што яны хацелі ўчыніць з Езусам?

— Як Езус адказваў на дзеянні фарысеяў?

ІІ група

Знайдзіце наступныя фрагменты з Евангелля: Мц 15, 8; Мц 23, 25–28. 33.

Пісьмова адкажыце на пытанні:

— Што Езусу не падабалася ў адносінах фарысеяў да Бога?

— Як Езус называў фарысеяў? Чаму?

— Як ты разумееш слова «крывадушнасць»?

— Ад чаго Езус Хрыстус хоча засцерагчы фарысеяў і кніжнікаў?
— Да чаго крывадушнасць можа давесці чалавека?
— Ад чаго хоча засцерагчы нас Езус?

III група:

Знайдзіце наступныя фрагменты з Евангелля: Мц 5, 44–45; Лк 23, 33–34. Запоўніце табліцу:

| Як мы павінны адносіцца да ворагаў? | Што Езус казаў пра людзей, якія ўкрыжавалі Яго і дзялілі паміж сабой Яго вопратку? |
|---|---|
| | |

*Вучні працуюць у групах і затым дзеляцца сваімі адказамі.*

Хоць фарысеі і апынуліся ў ліку ворагаў Езуса, аднак мы маем выразнае сведчанне бязмернай любові Божай. Паміраючы на крыжы, Езус маліўся: «Ойча, прабач ім, бо не ведаюць, што робяць».

Мы, хрысціяне, павінны вучыцца прабачаць сваім крыўдзіцелям, любіць ворагаў, рабіць дабро тым, хто ненавідзіць нас, благаслаўляць тых, хто праклінае нас, і маліцца за тых, хто зневажае нас, каб такім чынам стаць сынамі нашага Нябеснага Айца. «Бо Ён загадвае сонцу свайму ўзыходзіць над дрэннымі і добрымі і пасылае дождж на справядлівых і несправядлівых». Таму што ў нянавісці няма ні будучыні, ні жыцця.

**Чалавек адказвае Богу**

*Катэхет раздае вучням карткі і прапаноўвае:*

1. Прыдумайце псеўданім для свайго непрыяцеля і напішыце яго на картцы.

2. Напішыце прычыну, па якой вы лічыце гэтага чалавека сваім непрыяцелем.

*Катэхет прапаноўвае вучням выбраць сабе пару — іншага вучня, якому яны хацелі б паказаць сваю картку і абмеркаваць яе змест. Просіць вучняў, каб яны пагаварылі пра сваіх непрыяцеляў і пры гэтым улічылі наступныя аспекты:*

1. Ці з’яўляецца аб’ектыўнаю прычына, па якой вы залічваеце крыўдзіцеля ў непрыяцелі?

2. Пагаварыце пра тое, што вы адчуваеце, калі думаеце пра сваіх непрыяцеляў, а таксама пра тое, як мы абыходзімся з нашымі непрыяцелямі.

3. Дайце свайму напарніку параду: як можна вызваліцца ад нянавісці і як правільна адносіцца да ворагаў (як з непрыяцеля стаць сябрам).

*Катэхет прапаноўвае вучням напісаць «Парады пра тое, як пазбавіцца ад нянавісці і стаць сябрам свайму ворагу» (у сшытку заданне № 3).*

Гэтыя парады могуць быць быць сфармуляваныя па кроках:
1 крок:
2 крок:
Выкладзіце гэтую інфармацыю «У Кантакце».

**Разважанне**

— Ці не крывадушнічаеш ты перад Богам і людзьмі?
— Як ты адносішся да сваіх ворагаў?
— Ці адказваеш ты злом на зло?
— Ці благаслаўляеш ты тых, хто праклінае цябе?
— Ці робіш ты дабро тым, хто ненавідзіць цябе?
— Ці молішся ты за тых, хто крыўдзіць і ненавідзіць цябе?
— Што ты можаш і хочаш зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з Ім?

**Пастанова**

Катэхет прапануе вучням запісаць пастанову ў сшытак.

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям'і і сябрам пра адносіны Езуса Хрыста да сваіх ворагаў.
— Пастарайся быць добразычлівым да сваіх ворагаў, кожны вечар чытай малітву аб памнажэнні любові.

**Заключная малітва**

Аб любові да Бога

Божа сусвету, ад Цябе паходзіць усялякая дасканаласць. Укарані ў сэрцах нашых любоў да Твайго святога імені і дай нам ласку ўзрастаць у пабожнасці; умацуй у нас усё добрае і клапатліва беражы ўмацаванае Табою.

Адары нас, Пане, пастаяннаю бояззю і любоўю да святога імені Твайго, бо Ты ніколі не адмаўляеш у апецы тым, каго ўмацоўваеш у сваёй любові.

Божа, Ты для тых, хто Цябе любіць, падрыхтаваў нябачныя даброты, таму ўлі ў нашыя сэрцы гарачую любоў да Цябе, каб мы, мілуючы Цябе ва ўсім і больш за ўсё, атрымалі абяцаную спадчыну, якая пераўзыходзіць усялякія жаданні.

Усемагутны вечны Божа, памнож у нас веру, надзею і любоў і дай нам палюбіць Твае запаведзі, каб мы маглі атрымаць абяцаную ўзнагароду і вечна праслаўляць Цябе. Праз Хрыста, Пана нашага. Амэн.

## Тэма 17. Езус паказвае нам міласэрнага Айца

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з біблійнай гісторыяй пра міласэрнага айца; дапамагчы вучням зразумець, што міласэрны Бог ахвотна прабачае нам нашы грахі, калі мы ў іх шчыра раскайваемся.

**Выхаваўчая мэта:**

фарміраваць у вучняў імкненне да пакаяння і штодзённага рахунку сумлення, каб вучні не баяліся сваёй грахоўнасці, але імкнуліся ў пакоры і праўдзе стаяць перад абліччам міласэрнага Бога.

**Матэрыялы:**

Біблія: Лк 15, 11–32.

Галінкі з чырвонымі стужкамі.

Ілюстрацыя: «Вяртанне марнатраўнага сына», надпісы да ілюстрацыі: «Пан Бог Міласэрны, таму што Ён ахвотна прабачае нам нашы грахі, калі мы ў іх шчыра раскайваемся»; «Будзем есці і весяліцца, бо гэты сын мой быў мёртвы і ажыў, прапаў і знайшоўся» (Лк 15, 23–24).

Фрагмент з фільма, прысвечаны прыпавесці пра міласэрнага айца.

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразом, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагмента з фільма, дыялог, праца ў групах, пісьмовая праца на аснове тэксту, творчая майстэрня — сачыненне-выказванне ад імя біблійнага персанажа, шыфраванне.

### Ход занятку

**Малітва**

Ойча наш...

**Праверка хатняга задання**

*Катэхет прапаноўвае вучням распавесці пра канкрэтныя словы і дзеянні, якімі на працягу мінулага тыдня яны выказвалі зычлівасць да непрыяцеляў.*

*Пры паўтарэнні хатняга задання можна карыстацца крыжаванкамі, змешчанымі ў канцы сшытка (крыжаванка № 16).*

**Чалавек пытаецца**

### Чырвоныя стужачкі

У адной беларускай вёсцы жыла сям’я: тата, мама і сын, якога звалі Паўлікам. Хлопчык з дзяцінства быў вельмі прыгожы. Падрастаючы, ён радаваў бацькоў сваёй паслухмянасцю, ветлівасцю, любоўю да Бога і Касцёла. Потым сын вырас і паехаў вучыцца ў вялікі горад. Там у Паўла з’явілася шмат знаёмых, якія паводзілі сябе зусім не так, як бацькі вучылі яго ў сям’і. Паступова і Павел уцягнуўся у такі лад жыцця: перастаў маліцца і хадзіць у Касцёл, стаў паліць і выпіваць, замест вучобы бавіў час у клубах і барах. А паколькі грошай пачало не хапаць, то разам са сваімі знаёмымі ён вырашыў красці тавар у супермаркеце. Але гэта працягвалася нядоўга. Аднойчы яго злавілі ахоўнікі і выклікалі міліцыю. Так Павел апынуўся ў судзе, а потым і ў турме.

Бацькі моцна перажывалі за сына, увесь час маліліся за яго. Але Павел, седзячы ў турме, не ведаў пра гэта. Ён думаў, што яны яго ніколі не прабачаць. Набліжаўся час вызвалення. Куды было ісці юнаку? Нягледзячы на страх і сорам, ён адважыўся напісаць ліст дадому. Павел папрасіў, каб бацькі, калі яны яго чакаюць, завязалі на яблыню каля хаты чырвоную стужку. Ён прыйдзе ў вёску і ўсё зразумее...

І вось Павел на волі. Дайшоў да вакзала, купіў білет на цягнік. Навокал была прыгожая вясна, але юнак нічога не заўважаў. Ён думаў толькі пра тое, ці чакаюць яго дома. Чым бліжэй цягнік пад’язджаў да яго вёскі, тым мацней у хлопца калацілася сэрца. Калі ён ужо ішоў па роднай вуліцы, баяўся нават узняць вочы, каб паглядзець на яблыню каля бацькоўскай хаты. Нарэшце асмеліўся... Перад ім стаяла яблыня, на якой не было відаць лісця ад чырвоных стужак...

*У якасці нагляднага матэрыялу можна выкарыстаць галінкі з чырвонымі стужкамі...*

*Катэхет задае вучням пытанне:*

— Што вы зразумелі з гэтай гісторыі?

**Бог адказвае**

*Катэхет вешае на дошку ілюстрацыю:* «Вяртанне марнатраўнага сына», *і надпісы:* «Пан Бог Міласэрны, таму што Ён ахвотна прабачае нам нашы грахі, калі мы ў іх шчыра раскайваемся»; «Будзем есці і весяліцца, бо гэты сын мой быў мёртвы і ажыў, прапаў і знайшоўся» (Лк 15, 23–24).

*Катэхет прапануе вучням праслухаць аўдыёзапіс біблійнага тэксту (Лк 15, 11–32).*

*Можна паказаць фрагмент з фільма пра міласэрнага айца (звярніце ўвагу на тое, каб фрагмент дакладна адлюстроўваў біблійны сюжэт).*

**Святое Евангелле паводле Лукі (15, 11–32)**

«І сказаў яшчэ [Хрыстус]: „У аднаго чалавека было два сыны. Малодшы з іх сказаў бацьку: „Ойча, дай належную мне частку маёмасці“. І той падзяліў паміж імі маёмасць. Праз некалькі дзён малодшы сын забраў усё

і ад’ехаў у далёкі край, і там растраціў сваю маёмасць, жывучы распусна. А калі аддаў усё, настаў вялікі голад у тым краі, і ён апынуўся ў нястачы. Тады пайшоў і наняўся да аднаго жыхара гэтага краю, а той паслаў яго на свае палі пасвіць свіней. Ён жадаў напоўніць жывот свой стручкамі, што елі свінні, але ніхто не даваў яму. Апамятаўшыся, ён сказаў: „Колькі наймітаў у бацькі майго маюць удосталь хлеба, а я гіну тут з голаду. Устану і пайду да айца майго, і скажу яму: Ойча, я зграшыў супраць неба і перад табою. Я ўжо не варты называцца тваім сынам. Прымі мяне як аднаго з наймітаў тваіх“. І ён устаў, і пайшоў да свайго бацькі.

А калі быў яшчэ далёка, убачыў яго бацька ягоны і зжаліўся; і, пабегшы, кінуўся яму на шыю, і пацалаваў яго. А сын сказаў яму: „Ойча, зграшыў я супраць неба і перад табою. Я ўжо не варты называцца тваім сынам“. Бацька ж сказаў слугам сваім: „Прынясіце хутчэй найлепшыя шаты і апраніце яго, і дайце пярсцёнак на руку яго і сандалі на ногі. Прывядзіце адкормленае цяля і зарэжце. Будзем есці і весяліцца, бо гэты сын мой быў мёртвы і ажыў, прапаў і знайшоўся“. І пачалі весяліцца.

А яго старэйшы сын быў на полі. І калі, вяртаючыся, падышоў да дому, пачуў музыку і танцы. Паклікаўшы аднаго са слугаў, спытаўся, што гэта такое. Той адказаў яму: „Брат твой вярнуўся, і бацька твой зарэзаў адкормленае цяля, бо атрымаў яго назад здаровым“. І разгневаўся ён, і не хацеў уваходзіць. Тады выйшаў бацька ягоны і пачаў прасіць яго. Але ён адказаў свайму бацьку: „Вось я столькі гадоў служу табе і ніколі не парушыў загаду твайго, але ты ніколі не даў мне нават казляняці, каб я павесяліўся з маімі сябрамі. А калі вярнуўся гэты сын твой, які змарнаваў тваю маёмасць з распусніцамі, ты зарэзаў для яго адкормленае цяля“. Ён жа адказаў яму: „Дзіця, ты заўсёды са мною, і ўсё маё — тваё. А цешыцца і весяліцца трэба было таму, што гэты брат твой быў мёртвы і ажыў, прапаў і знайшоўся“».

*Катэхет дзеліць вучняў на тры групы.*

І група
Распавядзіце гісторыю пра міласэрнага айца ад імя марнатраўнага сына.

ІІ група
Распавядзіце гісторыю пра міласэрнага айца ад імя старэйшага сына.

ІІІ група
Распавядзіце гісторыю пра міласэрнага айца ад імя самога айца.

*Вучні прэзентуюць сваю творчасць на форуме. Гэта можа быць у выглядзе інсцэніроўкі ці маналогу (форму выбіраюць самі вучні).*

*Катэхет задае вучням пытанні (у сшытку заданне №2):*

— Як вы сябе адчувалі ў ролі марнатраўнага сына?
— Чаму вы навучыліся ад марнатраўнага сына?
— Як вы сябе адчувалі ў ролі старэйшага сына?
— Што б вы параілі старэйшаму сыну?
— Як вы сябе адчувалі ў ролі міласэрнага айца?
— Чаму вас вучыць міласэрны айцец?
— Якую важную праўду Езус хоча нам перадаць праз гэтую прыпавесць?

**Чалавек адказвае Богу**

Мы ведаем, што Пан Бог — Міласэрны Айцец, Ён прабачае нам нашы грахі, калі мы ў іх шчыра раскайваемся.

Напішы, як ты разумееш выраз: «Пан Бог Міласэрны, таму што Ён ахвотна прабачае нам нашы грахі, калі мы ў іх шчыра раскайваемся» *(у сшытку заданне № 3).*

*Катэхет задае вучням пытанні:*

— У якім сакрамэнце мы сустракаемся з міласэрным Айцом?
— Хто і калі ўстанавіў гэты сакрамэнт?
— Які плён прыносіць гэты сакрамэнт?

*Катэхет:*

Для таго, каб падрыхтавацца да сакрамэнту пакаяння, нам неабходна выканаць пяць умоваў *(у сшытку заданне № 4).*

Калі накласці рашотку на табліцу, застануцца неабходныя літары — будуць бачныя пяць умоваў сакрамэнту пакаяння.

Знайдзі іх і выпішы

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | Ь | П | В | А | Ы | М |
| Й | Ц | У | К | | | | | | | | | С |
| | | | | Ы | | | Т | | | | | |
| | | | | | | | Я | Ч | В | Р | О | Д |
| Д | О | М | А | Ф | У | Ц | Ь | Б | Ю | Ж | Э | Г |
| | | | | | | | | | | | | |
| Я | | | | | | | | | | | Б | Ю |
| І | А | Ы | Ф | | | | | | | Л | Ж | Х |
| Т | Н | | | | | | | | | У | Ч | М |
| У | Ц | В | А | П | Ў | З | Ц | Ы | Р | Л | Ц | К |
| Ы | | | | | | | | | | Р | Л | Р |
| | | | | | | | | | | | В | У |
| В | С | Я | | | | | | | Ю | Б | С | М |

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Р | А | Х | У | Н | А | К | Ь | П | В | А | Ы | М |

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Й | Ц | У | К | С | У | М | Л | Е | Н | Н | Я | С |
| Ж | А | Л | Ь | Ы | З | А | Т | Г | Р | А | Х | І |
| Ц | В | Ё | Р | Д | А | Е | Я | Ч | В | Р | О | Д |
| Д | О | М | А | Ф | У | Ц | Ь | Б | Ю | Ж | Э | Г |
| П | А | С | Т | А | Н | А | Ў | Л | Е | Н | Н | Е |
| Я | В | Ы | П | Р | А | В | І | Ц | Ц | А | Б | Ю |
| І | А | Ы | Ф | Ш | Ч | Ы | Р | А | Я | Л | Ж | Х |
| Т | Н | С | П | О | В | Е | Д | З | Ь | У | Ч | М |
| У | Ц | В | А | П | Ў | З | Ц | Ы | Р | Л | Ц | К |
| Ы | В | Ы | К | А | Н | А | Н | Н | Е | Р | Л | Р |
| П | Р | Ы | З | Н | А | Ч | А | Н | А | Й | В | У |
| В | С | Я | П | А | К | У | Т | Ы | Ю | Б | С | М |

**Разважанне**

*Катэхет задае вучням пытанні:*

— Як часта ты задумваешся пра сваё жыццё, пра свае думкі, словы і ўчынкі?

— Як часта ты прыступаеш да сакрамэнту споведзі?

— Калі ты апошні раз прыступаў да сакрамэнту споведзі?

— Як ты рыхтуешся да сакрамэнту паяднання?

— Што ты можаш і хочаш зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з Ім?

**Пастанова**

*Катэхет прапануе вучням запісаць пастанову ў сшытак.*

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям’і і сябрам прыпавесць пра міласэрнага айца.

*Катэхет прапаноўвае вучням прыдумаць завяршэнне прыпавесці пра міласэрнага айца ці намаляваць малюнак па гэтай тэме.*

**Заключная малітва**

Малітва св. Фаўстыны Кавальскай аб міласэрнасці

Дапамажы мне, о Пане, каб вочы мае былі міласэрныя, каб ніколі не глядзела я з падазронасцю і не меркавала па знешніх прыкметах, заўважала тое, што прыгожае ў душах бліжніх, і прыходзіла ім на дапамогу.

Дапамажы мне, Пане, каб рукі мае былі міласэрныя і поўныя добрых учынкаў, каб я ўмела рабіць бліжняму толькі дабро і браць на сябе самую цяжкую, карпатлівую працу.

Дапамажы мне, каб ногі мае былі міласэрныя, каб я заўсёды спяшала на дапамогу бліжнім, перамагаючы сваю ўласную стому і змучанасць.

О Езу мой, перамяні мяне ў Сябе, бо Ты ўсё можаш.

## Тэма 18. Езус вучыць любіць бліжніх

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з біблійнымі прыпавесцямі пра добрага самараніна і пра смакоўніцу; дапамагчы вучням зразумець, што Езус Хрыстус заклікае нас любіць бліжніх, выконваць справы міласэрнасці для душы і цела бліжняга.

**Выхаваўчая мэта:**

фарміраваць у вучняў пачуццё павагі і любові да бліжніх.

**Матэрыялы:**

Біблія: Лк 10, 25–37; Лк 13, 6–9.

Ілюстрацыі:

1) «Прыпавесць пра міласэрнага самараніна», надпіс да ілюстрацыі: «„Як здаецца табе, хто з гэтых трох быў бліжнім таму, хто трапіў у рукі разбойнікаў?“ Ён сказаў: „Той, хто паступіў з ім міласэрна“. Тады Езус сказаў яму: „Ідзі і ты рабі таксама“ (Лк 10, 36–37);

2) «Прыпавесць пра смакоўніцу», надпіс да ілюстрацыі: «Але той сказаў яму ў адказ: „Пане, пакінь яе на гэты год. Я абкапаю яе і абкладу гноем. Можа, прынясе плод у будучым, а калі не, ссячэш яе“» (Лк 13, 8–9).

Фрагменты з фільма (мультфільма), прысвечаныя прыпавесцям пра міласэрнага самараніна і смакоўніцу.

Касцюмы для інсцэніроўкі.

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразом, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагмента з фільма, дыялог, праца ў групах, творчая майстэрня — інсцэніроўка, маляванне.

### Ход занятку

**Малітва**

Акт любові…

**Чалавек пытаецца**

*У класе можна павесіць шнур для бялізны і падрыхтаваць прышчэпкі.*

*Катэхет піша на дошцы пытанне: «Хто мой бліжні?» (у сшытку заданне № 1).*

*Вучні вешаюць свае адказы на шнур. Катэхет падсумоўвае адказы вучняў.*

**Бог адказвае**

Сёння мы з вамі даведаемся пра тое, як Езус адказаў на пытанне: «Хто з'яўляецца нашым бліжнім?»

*Катэхет вешае на дошку ілюстрацыі:*

1) «Прыпавесць пра міласэрнага самараніна», *надпіс да ілюстрацыі:* «„Як здаецца табе, хто з гэтых трох быў бліжнім таму, хто трапіў у рукі разбойнікаў?“ Ён сказаў: „Той, хто паступіў з ім міласэрна“. Тады Езус сказаў яму: „Ідзі і ты рабі таксама“ (Лк 10, 36–37);

2) «Прыпавесць пра смакоўніцу», *надпіс да ілюстрацыі:* «Але той сказаў яму ў адказ: „Пане, пакінь яе на гэты год. Я абкапаю яе і абкладу гноем. Можа, прынясе плод у будучым, а калі не, ссячэш яе“» (Лк 13, 8–9).

*Катэхет прапануе вучням праслухаць аўдыёзапіс фрагментаў з Бібліі: Лк 10, 25–37; Лк 13, 6–9. Можна паказаць вучням фрагменты з фільма (мультфільма), прысвечаныя прыпавесцям пра міласэрнага самараніна і смакоўніцу (звярніце ўвагу на тое, каб фрагменты дакладна адлюстроўвалі біблійныя сюжэты).*

*Катэхет дзеліць вучняў на 2 групы і прапануе ім паставіць сцэнкі.*

I група
Лк 10, 25–37

II група:
Лк 13, 6-9

*Вучні прадстаўляюць сцэнкі.*

*Катэхет задае вучням пытанні (у сшытку заданне № 2):*

— Чаму святар і левіт прайшлі міма параненага і не дапамаглі яму?
— Чаму самаранін дапамог параненаму?
— Што самаранін зрабіў для чалавека, які трапіў у бяду?
— Чаму навучыў цябе міласэрны самаранін?
— З чым кожнага з нас параўноўвае Езус у прыпавесці пра смакоўніцу?
— Хто з'яўляецца вінаградарам, які клапоціцца пра дрэва нашага жыцця?
— Якія плады Бог хоча ўбачыць у нашым жыцці?
— Які момант са сцэнак для вас быў самым хвалюючым?
— Што вы зразумелі з гэтых сцэнак?
— Да якога з біблійных персанажаў вы найбольш падобныя?
— Якія словы і дзеянні з прыпавесці вам найбольш запомніліся?
— Чаму нас навучылі гэтыя прыпавесці?

**Чалавек адказвае Богу**

Езус Хрыстус цалкам справядліва чакае пладоў ад нашага жыцця. Ён дае нам любоў і ласку, каб мы маглі любіць нашых бліжніх. Святы апостал

Якуб вучыць нас: «Вера без учынкаў мёртвая». Напішы, як ты разумееш гэтыя словы *(у сшытку заданне № 3)*.

*Катэхет прапануе кожнаму вучню намаляваць дрэва, якое сімвалізуе яго жыццё.*

У гэтым вам дапамогуць адказы на пытанні:

— Якое гэта дрэва?

— Што гэтае дрэва дае іншым?

— Чаго не хапае ў гэтым дрэве?

— Што патрэбна зрабіць для таго, каб дрэва не загінула? Як гэтае дрэва можна падтрымаць?

— Што ты можаш зрабіць для таго, каб гэтае дрэва прынесла яшчэ большы плён?

*Вучні прымацоўваюць свае малюнкі сваіх дрэў да свайго адзення і ходзяць па памяшканні, знаёмяцца з іншымі малюнкамі-сімваламі. Тыя, хто знойдзе сабе субяседніка, аб'ядноўваюцца ў невялікія групы і абмяркоўваюць свае малюнкі.*

**Разважанне**

Катэхет задае вучням пытанні:

— Ці кожны чалавек, якога ты сустракаеш, з'яўляецца тваім бліжнім? Чаму не?

— У якіх учынках канкрэтна праяўляецца твая любоў да бліжніх?

— Што ты мог зрабіць для бліжніх, але не зрабіў?

— Што табе патрэбна пераадолець і змяніць у сабе дзеля таго, каб кожны чалавек стаў тваім бліжнім?

— Ці ўдзячны ты людзям, якія праяўляюць да цябе міласэрнасць? Ці не ўспрымаеш ты атрыманае дабро як належнае, быццам людзі абавязаныя для цябе чыніць яго?

— Што ты можаш і хочаш зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з Ім?

**Пастанова**

*Катэхет прапануе вучням запісаць пастанову ў сшытак.*

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям'і і сябрам прыпавесці пра міласэрнага самараніна і смакоўніцу.

— Будзь па-сапраўднаму, на справе бліжнім для кожнага, каго сустрэнеш на сваім шляху.

**Заключная малітва**

Песня пра любоў да бліжніх.

## Тэма 19. Езус дае нам сваё Цела

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучня з біблійнымі гісторыямі пра памнажэнне хлябоў і пра ўстанаўленне сакрамэнту Эўхарыстыі; дапамагчы вучням зразумець, што сакрамэнт Эўхарыстыі з’яўляецца крыніцаю і вяршыняю нашай веры.

**Выхаваўчая мэта:**

выхоўваць у вучнях пачуццё ўдзячнасці Богу за сакрамэнт Эўхарыстыі і заахвоціць вучняў, каб яны прымалі поўны ўдзел у святой Імшы.

**Матэрыялы:**

Біблія: Мц 14, 14–21; Лк 14, 17–19; Ян 6, 47–59.

Ілюстрацыі:

1) малюнак (фотаздымак) з дзецьмі, якія галадаюць;

2) «Памнажэнне хлябоў», надпісы да ілюстрацыі: «І, загадаўшы народу сесці на траву, Ён узяў пяць хлябоў і дзве рыбіны, паглядзеў на неба, благаславіў і, разламаўшы, даў хлеб вучням, а вучні — людзям» (Мц 14, 19); «Гэта чыніце на Маю памяць» (Лк 22, 19); «Бо Цела Маё — праўдзівы спажытак, а Кроў Мая — праўдзівы напой» (Ян 6, 55).

Фрагменты з фільма, прысвечаныя біблійным гісторыям пра памнажэнне хлябоў і пра ўстанаўленне сакрамэнту Эўхарыстыі.

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразам, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагмента з фільма, дыялог, праца ў групах, пісьмовая праца на аснове тэксту, творчая майстэрня — біблійны рэпартаж.

### Ход занятку

**Малітва**

Эўхарыстычная песня.

**Праверка хатняга задання**

*Катэхет прапануе вучням падзяліцца тым, як у іх атрымалася на працягу мінулага тыдня быць бліжнімі для тых людзей, якіх яны сустрэлі.*

*Пры паўтарэнні хатняга задання можна карыстацца крыжаванкамі, змешчанымі ў канцы сшытка (крыжаванка № 18).*

*Катэхет уводзіць вучняў у новую тэму.*

**Чалавек пытаецца**

На дошцы прымацаваная ілюстрацыя дзяцей, якія галадаюць. Катэхет прыносіць на занятак хлеб, паказвае яго вучням і задае пытанні:

— Што гэта?

— Навошта людзям хлеб?

— Чаму мы яго ядзім?

— Што адбудзецца, калі людзям не хопіць хлеба?

**Бог адказвае**

Ствараючы свет, Пан Бог паклапаціўся пра чалавека і даў яму хлеб. Кожны дзень Пан клапоціцца пра нас, каб мы мелі хлеб штодзённы. Сёння мы з вамі пагаворым пра Хлеб Нябесны, які дае нам нябесны Айцец.

*Катэхет вешае на дошку ілюстрацыю* «Памнажэнне хлябоў», *надпісы да ілюстрацыі*: «І, загадаўшы народу сесці на траву, Ён узяў пяць хлябоў і дзве рыбіны, паглядзеў на неба, благаславіў і, разламаўшы, даў хлеб вучням, а вучні — людзям» (Мц 14, 19); «Гэта чыніце на Маю памяць» (Лк 22, 19); «Бо Цела Маё — праўдзівы спажытак, а Кроў Мая — праўдзівы напой» (Ян 6, 55).

*Катэхет дае вучням магчымасць праслухаць аўдыёзапіс трох урыўкаў з Бібліі: Мц 14, 14–21; Лк 14, 17–19; Ян 6, 47–59.*

*Катэхет паказвае вучням фрагменты з фільма, прысвечаныя біблійным гісторыям пра памнажэнне хлябоў і пра ўстанаўленне сакрамэнту Эўхарыстыі.*

*Катэхет дзеліць вучняў на тры групы і прапануе напісаць рэпартаж з месцаў біблійных падзей (у сшытку заданне № 1).*

І група: Мц 14, 14–21.

ІІ група: Лк 14, 17–19.

ІІІ група: Ян 6, 47–59.

*Вучні павінны стварыць рэпартаж, у якім апісваецца:*

1. Месца здарэння.
2. Удзельнікі здарэння.
3. Сама падзея.
4. Уражанні ўдзельнікаў падзеі.
5. Уражанне самога карэспандэнта ад пачутых слоў і дзеянняў Езуса.

*Вучні прадстаўляюць сваю творчасць.*

*Катэхет задае вучням пытанні:*

— Што ёсць агульнага паміж гэтымі падзеямі?

— Пра які хлеб Езус гаварыў у сінагозе ў Кафарнауме?

— Што з’яўляецца сапраўдным хлебам і напоем для хрысціянаў?

— Што нам дае сапраўднае Цела і Кроў Езуса Хрыста пад выглядам хлеба і віна?

— Што адбудзецца з людзьмі, якія не прымаюць святую Камунію?

— Кім жыве чалавек, які прымае святую Камунію?

— Хто жыве ў нас, калі мы прымаем святую Камунію?

Карыстаючыся фрагментам са Святога Евангелля паводле Лукі (14, 17–19), выпішы словы, якімі Езус устанавіў сакрамэнт Эўхарыстыі *(у сшытку заданне № 3).*

**Чалавек адказвае Богу**

Эўхарыстыя з’яўляецца крыніцаю і вяршыняю нашай веры.

*Катэхет можа прывесці ў прыклад сваё сведчанне або сведчанне іншых людзей пра ролю Эўхарыстыі ў іх жыцці.*

*Катэхет прапануе вучням закончыць сказы (у сшытку заданне № 4)*:

Эўхарыстыя для мяне …

Святую Камунію не можа прымаць чалавек …

Без святой Камуніі …

Святую Камунію я прымаю …

Святая Камунія дае мне …

*Вучні дзеляцца сваімі адказамі.*

**Разважанне**

*Катэхет задае вучням пытанні:*

— Як часта ты дзякуеш Пану Езусу за дар Эўхарыстыі?

— Ці не прапускаў ты святой Імшы ў нядзелю і святы?

— Ці не губляў час замест святой Імшы на неабавязковыя заняткі і прыемнасці (доўгі сон, адведзіны сяброў, гульня на камп’ютары, прагляд фільмаў)?

— Ці не спазнаўся ты на святую Імшу?

— Ці належным чынам удзельнічаў у святой Імшы, адказваючы, стараючыся лепш зразумець сутнасць і значэнне паасобных яе частак?

— Ці ўшаноўваў ты Найсвяцейшы Сакрамэнт у касцёле (укленчваючы) альбо праходзячы каля касцёла?

— Што ты можаш і хочаш зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з Ім?

**Пастанова**

*Катэхет прапануе вучням запісаць пастанову ў сшытак.*

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям’і і сябрам тое, што ты даведаўся пра сакрамэнт Эўхарыстыі, пра значэнне святой Камуніі ў жыцці хрысціяніна.

— Напішы, у якой інтэнцыі ты будзеш маліцца і прымаць святую Камунію ў бліжэйшую нядзелю.

**Заключная малітва**

*Калі касцёл знаходзіцца блізка ад класа, у якім праводзяцца заняткі, лепш за ўсё закончыць катэхезу ў касцёле словамі малітвы:*

О Пане, Ты мне вельмі патрэбны. Мне патрэбна Тваё святло, каб я мог што-небудзь разумець; патрэбна Твая любоў, каб я мог любіць; патрэбна Тваё прабачэнне, каб я мог дасягнуць ласкі вечнага збаўлення; мне патрэбны Твой Хлеб, каб я мог наталіць голад сваёй душы; патрэбна Тваё кіраванне, каб я не згубіўся ў дарозе да неба; патрэбна Твая падтрымка, каб я не ўпаў пад цяжарам грахоў. Выслухай мяне, Езу, бо Ты — сама Дабрыня.

Дарагі Збаўца, памнож маю веру і напоўні маё сэрца радасцю з Тваёй прысутнасці. Я ведаю, што Ты ніколі не пакінеш мяне ў самоце. Ты спадарожнічаеш мне і дапамагаеш, ахоўваеш і вядзеш мяне. Ты штодня са мною і любіш мяне такім, які я ёсць. Якая ж вялікая Твая дабрыня, о Пане!

## Тэма 20. Мука Езуса Хрыста

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з біблійнай гісторыяй пра муку Езуса Хрыста; дапамагчы вучням зразумець, што Езус Хрыстус дзеля нас і нашага збаўлення цярпеў пакуты і смерць на крыжы.

**Выхаваўчая мэта:**

фарміраваць у вучняў пачуццё ўдзячнасці Езусу за дар збаўлення, за тое, што Ён пакутаваў і памёр дзеля нашага збаўлення; дапамагчы вучням прыняць Езуса як Збаўцу.

**Матэрыялы:**

Біблія: Мц 26, 36–56; Мц 26, 57–75; Мц 27, 11–26; Мк 15, 16–47.

Ілюстрацыя: «Мука Хрыста», надпісы да ілюстрацыі: «Ойча Мой, калі гэта магчыма, няхай абміне гэты келіх Мяне. Аднак, не як Я хачу, але як Ты» (Мц 26, 39); «Тады пачалі пляваць Яму ў твар і біць кулакамі, а іншыя білі па шчоках» (Мц 26, 67); «Божа Мой, Божа Мой, чаму Ты Мяне пакінуў?» (Мк 15, 34); «Праўдзіва, Чалавек гэты быў Сынам Божым» (Мк 15, 39).

Фрагмент з фільма пра муку Хрыста.

Карткі з назвамі стацый Крыжовага шляху (пажадана з ілюстрацыямі). Касцюмы і музыка.

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразом, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагмента з фільма, дыялог, праца з біблійным тэкстам (вылучэнне фрагментаў тэксту рознымі колерамі), праца ў групах, пісьмовая праца на аснове тэксту, творчая майстэрня — пантаміма стацый Крыжовага шляху, спеў.

### Ход занятку

**Малітва**

Спеў:

Ты за нас цярпеў ад ранаў, Езу Хрыстэ, змілуйся над намі!
Маці Божая Балесная, заступіся за нас!

**Праверка хатняга задання**

*Катэхет прапаноўвае вучням падзяліцца інтэнцыямі, у якіх яны прынялі ў нядзелю святую Камунію.*

*Пры паўтарэнні хатняга задання можна карыстацца крыжаванкамі, змешчанымі ў канцы сшытка (крыжаванка № 19).*

*Катэхет уводзіць вучняў у новую тэму.*

**Чалавек пытаецца**

*Катэхет дае вучням магчымасць праглядзець урывак з фільма, у якім хтосьці ахвяруе сваім жыццём за іншага (напрыклад, фрагмент з «Тытаніка»: хлопец — у халодным акіяне, яго каханая — на ільдзіне, і ён кажа ёй: «Пакляніся мне, што будзеш жыць…»).*

*Катэхет задае вучням пытанне:*

— Чаму … *(імя персанажа з фільма, які ахвяраваў сваім жыццём дзеля іншага)* выратаваў … *(імя выратаванага персанажа)*?

**Бог адказвае**

Бог любіць нас мацней, чым ... ... (*імя персанажа з фільма, які ахвяраваў сваім жыццём дзеля іншага, а таксама выратаванага персанажа*). Бог паслаў свайго Сына, каб збавіць нас ад нашых грахоў. Для многіх гэтая праўда застаецца вялікаю таямніцаю, у якую мы верым. Кожную нядзелю, вызнаючы нашу веру, мы кажам: «Веру … ў Езуса Хрыста, Пана нашага, які быў зачаты ад Духа Святога, нарадзіўся з Дзевы Марыі, укрыжаваны, памёр і быў пахаваны...».

Смерць Езуса мае падвойнае значэнне:

1. Яна паказвае вялікую любоў Бога да чалавека.
2. Яна была ахвяраю за нашыя грахі.

Сёння мы з вамі паглыбімся ў таямніцу мукі Хрыста.

*Катэхет вешае на дошку ілюстрацыю:* «Мука Хрыста», *а таксама надпісы да ілюстрацыі:* «Ойча Мой, калі гэта магчыма, няхай абміне гэты келіх Мяне. Аднак, не як Я хачу, але як Ты» (Мц 26, 39); «Тады пачалі пляваць Яму ў твар і біць кулакамі, а іншыя білі па шчоках» (Мц 26, 67); «Божа Мой, Божа Мой, чаму Ты Мяне пакінуў?» (Мк 15, 34); «Праўдзіва, Чалавек гэты быў Сынам Божым» (Мк 15, 39).

*Катэхет прапаноўвае вучням паслухаць фрагменты з аўдыёзапісу Бібліі: Мц 26, 36–56; Мц 26, 57–75; Мц 27, 11–26; Мк 15, 16–47.*

*Затым вучням даецца магчымасць прагледзець фрагмент з фільма пра муку Хрыста.*

*Катэхет дзеліць вучняў на 3 групы.*

I група

*Вучні атрымліваюць карткі з фрагментам Святога Евангелля паводле Мацвея (26, 36–56).*

Чырвоным колерам падкрэсліце словы і дзеянні Езуса, сінім колерам падкрэсліце тое, што гаварылі людзі і як яны паводзілі сябе з Езусам *(у сшытку заданне № 1).*

Адкажыце на пытанні:

- Дзе Езус маліўся?
- Чаго Езус баяўся?

- Як Езус пераадольваў свой страх?
- Што Ён казаў свайму Айцу?
- Што ў гэты час рабілі вучні?
- Хто чуваў разам з Езусам?
- Што мы павінны рабіць для таго, каб стойка і годна пераносіць пакуты?
- Якім знакам Юда выдаў Езуса жаўнерам?
- Што Езус сказаў Юдзе?
- Які цуд зрабіў Езус у Аліўным садзе?
- Што Езус сказаў Пятру, калі той узяў у рукі меч?
- Чаму вас навучыў Езус у Аліўным садзе?

II група:

*Вучні атрымліваюць карткі з фрагментам Святога Евангелля паводле Мацвея (26, 57–75; 27, 11–26).*

Чырвоным колерам падкрэсліце словы і дзеянні Езуса, сінім колерам падкрэсліце тое, што гаварылі людзі і як яны паводзілі сябе з Езусам.

Адкажыце на пытанні:

- Якое абвінавачанне ілжэсведкі прад’явілі супраць Езуса?
- Якая была рэакцыя Езуса на абвінавачванні?
- Якое пытанне задаў першасвятар Езусу?
- Што Езус яму адказаў?
- Чаму першасвятар разадраў вопратку на сабе?
- Які прысуд вынеслі Езусу?
- Чаму Пётр адрокся ад Езуса?
- Ці пакаяўся Пётр? У чым гэта выявілася?
- Як Езус паводзіў сябе на судзе ў Пілата?
- Хто падбухторваў народ адпусціць Барабу?
- Што з Езусам зрабілі перад тым, як укрыжавалі Яго?
- Чаму вы навучыліся ад Езуса, даведаўшыся пра тое, што адбывалася з Ім на судзе Сінэдрыёну і на судзе Пілата?

III група:

*Вучні атрымліваюць карткі з фрагментам Святога Евангелля паводле Марка (15, 16–47).*

Чырвоным колерам падкрэсліце словы і дзеянні Езуса, сінім колерам падкрэсліце тое, што гаварылі людзі і як яны паводзілі сябе з Езусам.

Адкажыце на пытанні:

- Як воіны ў прэторыі адносіліся да Езуса?
- Якая была рэакцыя Езуса?
- Чаму Езус пакутаваў?
- Каго Езус сустрэў на Крыжовым шляху?
- У якім надпісе была акрэслена віна Езуса?
- Хто стаяў пад крыжам Езуса?

_ У які дзень Езус памёр на крыжы?
_ Якія прыродныя з’явы суправаджалі смерць Езуса?
_ Што сказаў сотнік, калі ўбачыў смерць Езуса?
_ Ад чаго Езус нас збавіў?
_ Хто заняўся пахаваннем Езуса?
_ Што Езус паказаў нам сваёй смерцю на крыжы?

*Катэхет прапаноўвае вучням зрабіць пісьмовае заданне ў сшытку:*

Карыстаючыся біблійнымі тэкстамі (Мц 26, 36–56; Мц 26, 57–75; Мц 27, 11–26; Мк 15, 16–47) выпішы ў храналагічным парадку падзеі, звязаныя з мукаю і смерцю Езуса Хрыста *(у сшытку заданне № 2).*

**Чалавек адказвае Богу**

*Катэхет дзеліць вучняў на групы і раздае ім карткі з назвамі стацый Крыжовага шляху (пажадана з ілюстрацыямі) і прапаноўвае вучням паказаць гэтыя стацыі ў застылых позах. Можна падрыхтаваць касцюмы і музычнае суправаджэнне.*

*Катэхет задае вучням пытанні:*

_ Якія пачуцці ўзніклі ў вас пасля прачытання тэкстаў і пастагоўкі сцэнак-мініяцюр?
_ Што вас найбольш уразіла? Якія словы, дзеянні?
_ Што новага вы сёння адкрылі для сябе?
_ Што б вы хацелі зрабіць для Езуса?

**Разважанне**

*Катэхет задае пытанні вучням:*

_ Як ты прымаеш цярпенні?
_ Ці молішся ты, калі пакутуеш?
_ Ці адказваеш ты дабром на зло?
_ Як ты паводзіш сябе, калі цябе несправядліва асуджаюць?
_ Ці не падштурхоўваеш ты бліжніх да зла?
_ Ці не здраджваў ты бліжнім?
_ Ці не асуджаў ты бліжніх?
_ Ці ўдзячны ты Езусу за Яго муку і смерць? У чым гэта выяўляецца?
_ Што ты можаш і хочаш зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з Ім?

**Пастанова**

*Катэхет прапануе вучням запісаць пастанову ў сшытак.*

**Хатняе заданне**

_ Раскажы членам сваёй сям’і і сябрам пра муку і смерць Езуса Хрыста.

– Напішы малітву, у якой ты дзякуеш Езусу за Яго муку і смерць на крыжы, просіш прабачэння за свае грахі і молішся аб ласцы быць Яго сапраўдным вучнем і паслядоўнікам.

**Заключная малітва**

Пакланенне Крыжу

## Тэма 21. Езус Хрыстус уваскрос

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з біблійнымі падзеямі, звязанымі з уваскрасеннем Езуса Хрыста і Яго аб’яўленнем вучням; дапамагчы вучням зразумець, што Езус Хрыстус памёр і ўваскрос дзеля нашага збаўлення; што факт уваскрасення з’яўляецца фундаментам — асноваю нашай веры.

**Выхаваўчая мэта:**

фарміраваць у вучняў пачуццё ўдзячнасці Богу за дар збаўлення.

**Матэрыялы:**

Біблія: Лк 24, 1–9; Лк 24, 13–35; Ян 20, 24–31.

Ілюстрацыі:

1) «Уваскрасенне Езуса Хрыста»;

2) «Уваскрослы Езус з’яўляецца вучням па дарозе ў Эмаус»;

3) «Сустрэча Уваскрослага з Тамашам».

Надпісы да ілюстрацый: «Чаму вы шукаеце жывога сярод мёртвых? Яго тут няма; Ён уваскрос» (Лк 24, 5–6); «Калі сядзеў з імі за сталом, узяў хлеб, благаславіў, паламаў і даў ім. Тады адкрыліся іхнія вочы, і яны пазналі Яго. Але Ён стаўся нябачным для іх» (Лк 24, 30–31); «Пан мой і Бог мой!» (Ян 20, 28); «Ты паверыў, таму што ўбачыў Мяне. Шчаслівыя тыя, хто не бачыў, а паверыў!» (Ян 20, 29).

Фрагменты з фільма пра ўваскрасенне Езуса Хрыста і пра аб’яўленне Уваскрослага вучням.

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразам, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагмента з фільма, дыялог, праца ў групах, пісьмовая праца на аснове тэксту, творчая майстэрня — прэс-канферэнцыя.

### Ход занятку

**Малітва**

Веру ў Бога… *(на словы «памёр…» усе становяцца на калені)* або песня пра ўваскрасенне Езуса Хрыста.

**Праверка хатняга задання**

*Катэхет прапаноўвае вучням падзяліцца малітвамі, якія яны напісалі.*

*Пры паўтарэнні хатняга задання можна карыстацца крыжаванкамі, змешчанымі ў канцы сшытка (крыжаванка № 20).*

*Катэхет уводзіць вучняў у новую тэму.*

**Чалавек пытаецца**

*Катэхет задае вучням пытанне (у сшытку заданне № 1):*

— Якая розніца паміж выразамі «Езус уваскрасіў» (напрыклад, «Езус уваскрасіў Лазара») і «Езус уваскрос»?

*Вучні дзеляцца сваімі адказамі.*

**Бог адказвае**

Езус Хрыстус вельмі любіць нас. Ён памёр дзеля нас на крыжы і ляжаў тры дні ў магіле. На трэці дзень Ён паўстаў з мёртвых. Вестка пра тое, што Ён жывы, разышлася па ўсім свеце. Сёння мы з вамі пагаворым пра гэты вялікі цуд, які з'яўляецца фундаментам нашай веры.

*Катэхет вешае на дошку ілюстрацыі:*

1) «Уваскрасенне Езуса Хрыста»;

2) «Уваскрослы Езус з'яўляецца вучням па дарозе ў Эмаус»;

3) «Сустрэча Уваскрослага з Тамашам».

*Надпісы да ілюстрацый:* «Чаму вы шукаеце жывога сярод мёртвых? Яго тут няма; Ён уваскрос» (Лк 24, 5–6); «Калі сядзеў з імі за сталом, узяў хлеб, благаславіў, паламаў і даў ім. Тады адкрыліся іхнія вочы, і яны пазналі Яго. Але Ён стаўся нябачным для іх» (Лк 24, 30–31); «Пан мой і Бог мой!» (Ян 20, 28); «Ты паверыў, таму што ўбачыў Мяне. Шчаслівыя тыя, хто не бачыў, а паверыў!» (Ян 20, 29).

*Катэхет прапануе вучням праслухаць аўдыёзапіс фрагментаў Біблії: Лк 24, 1–9; Лк 24, 13–35; Ян 20, 24–31.*

*Катэхет прапануе паглядзець фрагменты з фільма пра ўваскрасенне Езуса Хрыста і пра аб'яўленне Уваскрослага вучням.*

Сёння адбудзецца прэс-канферэнцыя на тэму: «Уваскрасенне Езуса Хрыста».

*Катэхет дзеліць вучняў на 2 групы. На аснове біблійных тэкстаў I група рыхтуецца да прэс-канферэнцыі, а другая група – група журналістаў-рэпарцёраў – рыхтуе пытанні для ўдзельнікаў прэс-канферэнцыі (у сшытку заданне № 2).*

**I група**

Біблійныя тэксты для падрыхтоўкі:

Лк 24, 1–9;

Лк 24, 13–35;

Ян 20, 24–31.

Падрабязна вывучыце падзеі, звязаныя з уваскрасеннем Езуса Хрыста. Выберыце вучняў, якія будуць прадстаўляць сведкаў уваскрасення:

1. Марыя Магдалена
2. Двое вучняў, якія ішлі ў Эмаус
3. Тамаш.

**II група: журналісты-рэпарцёры (вучні могуць выбраць фотарэпарцёра, могуць здымаць рэпартаж і г. д.).**

Біблійныя тэксты для падрыхтоўкі:

Лк 24, 1–9;

Лк 24, 13–35;

Ян 20, 24–31.

Падрабязна вывучыце падзеі, звязаныя з уваскрасеннем Езуса Хрыста. Падрыхтуйце пытанні, якія дапамаглі б вашым чытачам зразумела і падрабязна даведацца пра падзеі, звязаныя з уваскрасеннем Езуса Хрыста.

*Катэхет:*

Цяпер адбудзецца прэс-канферэнцыя.

*Групы займаюць свае месцы і пачынаецца прэс-канферэнцыя. Пасля яе катэхет задае вучням пытанні (у сшытку заданне № 3)*:

— Якое, на ваш погляд, самае цікавае пытанне задалі рэпарцёры?

— Які, на ваш погляд, самы цікавы адказ?

— Што новага вы даведаліся пра падзеі, звязаныя з уваскрасеннем Езуса Хрыста?

*Катэхет прапануе вучням запоўніць табліцу, карыстаючыся біблійнымі тэкстамі: Лк 24, 1–9; Лк 24, 13–35; Ян 20, 24–31 (у сшытку заданне № 4):*

| Біблійныя тэксты | Ключавыя словы і дзеянні біблійных персанажаў да сустрэчы з Езусам | Месца сустрэчы з Езусам | Ключавыя словы і дзеянні Езуса | Ключавыя словы і дзеянні біблійных персанажаў пасля сустрэчы з Езусам |
|---|---|---|---|---|
| Сустрэча Марыі Магдалены з уваскрослым Езусам (Лк 24, 1–9) | | | | |
| Аб’яўленне па дарозе ў Эмаус (Лк 24, 13–35) | | | | |
| Сустрэча з Тамашам (Ян 20, 19–31) | | | | |

*Вучні дзеляцца сваімі адказамі.*

**Чалавек адказвае Богу**

Уваскрасенне Езуса Хрыста — гэта сэрца нашай веры. Кожная нядзеля для нас, хрысціянаў, з'яўляецца асаблівым днём, які мы прысвячаем Пану. У касцёле падчас святой Імшы мы сустракаемся з уваскрослым Хрыстом, Ён навучае нас сваім словам і корміць нас сапраўднаю ежаю — сваім Целам і Крывёй.

*Катэхет задае вучням пытанне (у сшытку заданне № 5):*

— Што мы можам зрабіць для таго, каб нядзеля ў нашай сям'і і ў нашым грамадстве была па-сапраўднаму святым і святочным днём, у якім мы сустракаемся з Уваскрослым Панам?

*Катэхет прапануе кожнаму вучню напісаць план святкавання нядзелі. Вучні прадстаўляюць свае планы і сумесна ствараюць адзін агульны план — узор святкавання нядзельнага дня для ўсіх хрысціянаў.*

**Разважанне**

Катэхет задае вучням пытанні:

— Ці верыш ты ва ўваскрасенне Езуса Хрыста?

— Чым для цябе з'яўляецца ўваскрасенне Езуса Хрыста?

— Ці з'яўляецца для цябе нядзеля Днём Панскім? У чым гэта выяўляецца?

— Што ў нядзелю з'яўляецца для цябе самым галоўным?

— Што табе перашкаджае ў святкаванні нядзелі?

— Што ты можаш і хочаш зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з Ім?

**Пастанова**

*Катэхет прапануе вучням запісаць пастанову ў сшытак.*

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям'і і сябрам пра ўваскрасенне Езуса Хрыста і пра тое, як Езус аб'яўляўся сваім вучням.

— Выпішы аргументы, якія ты прадставіў бы свайму няверуючаму сябру, калі б ён сцвярджаў, што Хрыстус не ўваскрос. Або намалюй малюнак на тэму: «Хрыстус уваскрос! Ён сярод нас!»

**Заключная малітва**

Медытацыя *(можа суправаджацца спакойнай музыкай)*

Заплюшчы вочы і ўяві, што перад табой паўстаў уваскрослы Хрыстус… Што ты адчуваеш, калі глядзіш на Яго? Ён звяртаецца да цябе са словамі: «Спакой табе!» Якія пачуцці выклікаюць у цябе словы Езуса? Езус гаворыць: «Паглядзі на Мае раны і павер у Мяне…» Уважліва агледзь сляды ранаў на руках і нагах Езуса… Усе гэтыя пакуты і боль Езус перанёс дзеля цябе, дзеля твайго збаўлення… Ты вельмі важны для Бога… Раны Езуса сведчаць пра

Яго любоў да цябе. Што ты пры гэтым адчуваеш? Што ты хочаш зрабіць? Што ты хочаш сказаць Езусу?

## Тэма 22. Езус узышоў на неба

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з біблійнай гісторыяй пра ўнебаўшэсце Езуса Хрыста; дапамагчы вучням зразумець, што пакліканнем кожнага чалавека з’яўляецца Нябеснае Валадарства.

**Выхаваўчая мэта:**

фарміраваць у вучняў імкненне дасягнуць Нябеснага Валадарства.

**Матэрыялы:**

Біблія: Ян 14, 1–3, Мк 16, 19–20, Дз 1, 9–11.

Ілюстрацыя: «Унебаўшэсце Езуса Хрыста», надпісы да ілюстрацыі: «Іду падрыхтаваць месца для вас» (Ян 14, 2); «Я з вамі ва ўсе дні аж да сканчэння веку» (Мц 28, 20).

Фрагмент з фільма пра ўнебаўшэсце Езуса Хрыста.

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразам, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагмента з фільма, дыялог, праца ў парах, праца ў групах, пісьмовая праца на аснове тэксту, творчая майстэрня — маляванне ўсёй групай, спеў.

### Ход занятку

**Малітва**

Песня «Езус — наш Пан»

**Праверка хатняга задання**

*Катэхет прапаноўвае вучням падзяліцца аргументамі, якія яны напісалі свайму няверуючаму сябру. Вучні паказваюць свае малюнкі.*

*Пры паўтарэнні хатняга задання можна карыстацца крыжаванкамі, змешчанымі ў канцы сшытка (крыжаванка № 21).*

*Катэхет уводзіць вучняў у новую тэму.*

**Чалавек пытаецца**

Сёння я хачу расказаць вам гісторыю пра аднаго чалавека, які пасля смерці трапіў у рай. Яго з радасцю сустрэў святы Пётр.

**Дом у раі**

Памёр чалавек. На зямлі яго лічылі добрым каталікам: ён хадзіў па нядзелях у касцёл, часам спавядаўся, нічога дрэннага, здаецца, не рабіў: не забіваў, не краў, не гаварыў няпраўды. Так, прынамсі, лічылі родныя і

знаёмыя, ды і ён сам. Пасля смерці ён трапіў у рай. Задаволены, набліжаецца да ўваходу, дзе яго сустракае святы Пётр з таўшчэзнаю кнігаю ў руках.

— Каткоўскі Іван? — перапытвае святы, гартаючы кнігу. — Так, ёсць тут такі. Хадзем са мной, я пакажу табе твой дом.

Ідуць яны па раі. Наперадзе бачыць Іван вялізны палац такой прыгажосці, якую на зямлі нават уявіць сабе немагчыма. Іван радасны бяжыць да яго.

— Затрымайся, — кажа Пётр, — гэта яшчэ не твой дом.

Засумаваў Іван. Ідуць яны далей. Неўзабаве паказаўся шыкоўны катэдж, у якім марыў бы жыць любы чалавек. Іван памкнуўся звярнуць да яго, але Апостал зноў папярэдзіў:

— І гэта не твой дом.

Яшчэ больш засумаваў Іван. Ды бачыць: наперадзе стаіць ужо аднапавярховы дом, але дастаткова вялікі і прыгожы. «Нічога, — думае Іван, — і гэта яшчэ няблага». Толькі ірвануўся пайсці, як зноў чуе:

— Пачакай, твой дом будзе наступны.

Прайшлі яны яшчэ крыху, і перад імі паўстаў маленькі бедны домік, нават сцены ў ім былі не пафарбаваныя. Іван ледзь не заплакаў ад крыўды:

— Чаму такая несправядлівасць у раі? Хтосьці жыве ў палацы, хтосьці ў катэджы, а мне дасталася гэтая халупа.

Пётр уздыхнуў і адказаў:

— Таго матэрыялу, які я атрымліваў ад цябе падчас твайго жыцця, хапіла толькі на такі дом…

*Апавяданне катэхета можа суправаджацца паказам дамоў на праектары.*

*Катэхет задае вучням пытанні (у сшытку заданне № 1):*

— Які матэрыял выкарыстоўваецца для будаўніцтва нябесных палацаў?

— Што вы зразумелі з гэтай гісторыі?

*Вучні дзеляцца сваімі адказамі.*

**Бог адказвае**

*Катэхет вешае на дошку ілюстрацыю:* «Унебаўшэсце Езуса Хрыста», *а таксама надпісы да ілюстрацыі:* «Іду падрыхтаваць месца для вас» (Ян 14, 2); «Я з вамі ва ўсе дні аж да сканчэння веку» (Мц 28, 20).

*Катэхет:*

На саракавы дзень пасля ўваскрасення Езус узышоў на неба.

*Катэхет прапануе вучням праслухаць аўдыёзапіс фрагментаў Бібліі: Ян 14, 1–3, Мк 16, 19–20, Дз 1, 9–11.*

*Можна паказаць фрагмент з фільма пра ўнебаўшэсце Езуса Хрыста.*

*Катэхет:*

Цяпер давайце раздзелімся на тры групы і папрацуем з біблійнымі тэкстамі, каб глыбей акунуцца ў збаўчыя падзеі і бліжэй пазнаёміцца з абставінамі ўнебаўшэсця Езуса Хрыста *(у сшытку заданне № 2).*

I група

1. Прачытайце фрагмент са Святога Евангелля паводле Яна (14, 1–3).

«Няхай не трывожыцца сэрца вашае. Верыце ў Бога і ў Мяне верце. У доме Айца Майго шмат святліц. А калі б так не было, ці сказаў бы вам, што іду падрыхтаваць месца для вас. І калі пайду і падрыхтую вам месца, прыйду зноў і забяру вас да сябе, каб і вы былі там, дзе Я».

2. Адкажыце на пытанні:

— Як вы разумееце выраз «Удоме Айца Майго шмат святліц»?

— Што Езус хацеў сказаць Апосталам словамі: «Іду падрыхтаваць месца для вас»?

— Што вы адчуваеце, чытаючы словы: «І калі пайду і падрыхтую вам месца, прыйду зноў і забяру вас да сябе, каб і вы былі там, дзе Я»? Чаму?

II група:

1. Прачытайце фрагмент са Святога Евангелля паводле Марка (16, 19–20).

«І пасля размовы з імі Пан Езус узнёсся ў неба і сеў праваруч Бога. А яны пайшлі і паўсюль прапаведавалі. Пан садзейнічаў ім і пацвярджаў слова знакамі, што яму спадарожнічалі».

2. Выканайце заданні:

— Вызначце месца апісанай падзеі.

— Вызначце час дзеяння.

— Пералічыце сведкаў унебаўшэсця Пана і апішыце дзеянні, якімі суправаджалася гэтая падзея.

— Апішыце ўзаемныя спадзяванні біблійных персанажаў.

III група:

1. Прачытайце фрагмент з кнігі Дзеяў Апосталаў (1, 9–11).

«Калі сказаў гэта, яны ўбачылі, як Ён узнёсся, і воблака забрала Яго з іхніх вачэй. Калі яны пільна ўзіраліся ў неба, як Ён узыходзіў, вось два мужы

сталі перад імі ў белым адзенні і сказалі: „Галілейцы, чаго стаіце і ўглядаецеся ў неба? Гэты Езус, забраны ад вас на неба, прыйдзе таксама, як вы бачылі Яго, калі Ён узыходзіў на неба“».

2. Выканайце заданні:

— Вызначце месца апісанай падзеі.

— Вызначце час дзеяння.

— Пералічыце сведкаў унебаўшэсця Пана і апішыце дзеянні, якімі суправаджалася гэтая падзея.

— Апішыце ўзаемныя спадзяванні біблійных персанажаў.

*Вучні прадстаўляюць працу ў групах (чытанне біблійных тэкстаў абавязковае).*

Факт унебаўшэсця Езуса Хрыста адкрывае нам праўду пра ўзвышэнне Хрыста над усім стварэннем. Езус застаўся з намі ў шматлікіх знаках. Ён прысутны ў Касцёле, які сам заснаваў, у святых сакрамэнтах, якія Ён устанавіў, у сваім Слове, на святой Імшы, на катэхезе. Гэта шматлікія знакі Яго прысутнасці сярод нас. І хоць мы Яго не бачым, Ён вядзе нас у дом Нябеснага Айца.

— Напішыце, як вы разумееце выраз: «Езус Хрыстус — мой Пан!» *(у сшытку заданне № 4).*

— Якія думкі, словы, учынкі і дзеянні чалавека сведчаць пра тое, што Езус з’яўляецца для яго Панам?

**Чалавек адказвае Богу**

*Катэхет прапануе вучням раздзяліцца на пары і намаляваць на сцяне малюнкі на тэму: «Што мы можам зрабіць для таго, каб дасягнуць Нябеснага Валадарства і быць з Езусам Хрыстом?» (сцяну неабходна падрыхтаваць загадзя — напрыклад, прымацаваць да яе паперу для малявання). Тэхнічнае вырашэнне гэтага задання залежыць ад магчымасцяў класа і колькасці дзяцей (можна прапанаваць вучням намаляваць малюнкі за партамі і затым павесіць іх на сцяну) — у сшытку заданне № 5.*

*У цэнтры сцяны для малявання прымацаваны абраз Езуса, які ўзыходзіць на неба, а таксама надпіс: «Іду падрыхтаваць месца для вас» (Ян 14, 2).*

*Вучні дзеляцца сваёй творчасцю.*

**Разважанне**

*Катэхет задае вучням пытанні:*

— Што ты робіш для таго, каб дасягнуць Валадарства Нябеснага?

— Што табе перашкаджае ў дасягненні Валадарства Нябеснага?

— Што ты можаш змяніць у сабе і сваіх паводзінах, каб дасягнуць Валадарства Нябеснага?

— Што ты можаш і хочаш зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з Ім?

**Пастанова**

*Катэхет прапануе вучням запісаць пастанову ў сшытак.*

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям'і і сябрам пра ўнебаўшэсце Езуса Хрыста.

— На працягу гэтага тыдня звярні ўвагу на тое, што ты сёння зрабіў для таго, каб дасягнуць Валадарства Нябеснага.

**Заключная малітва**

Песня «Езу, дай сілы...»

Езу, дай сілы, вядзі да Айца мяне.
Езу, дай сілы, вядзі да Айца мяне,
каб акунуўся я ў Яго крыніцы. Амэн, амэн.

## Тэма 23. Езус пасылае нам Святога Духа

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з біблійнай гісторыяй пра спасланне Святога Духа; дапамагчы вучням зразумець, што чалавеку патрэбна пастаянная дапамога Святога Духа і малітвы аб Яго дарах.

**Выхаваўчая мэта:**

фарміраваць у вучняў імкненне быць адкрытымі на дзеянне Святога Духа і супрацоўніцтва з Яго дарамі.

**Матэрыялы:**

Біблія: Ян 14, 26; Ян 16, 13–15, Дз 2, 1–4; Дз 1, 8.

Ілюстрацыя: «Спасланне Святога Духа», надпісы да ілюстрацыі: «І напоўніліся ўсе Духам Святым, і пачалі гаварыць на іншых мовах, як Дух даваў ім прамаўляць» (Дз 2, 4); «А Суцяшыцель, Дух Святы, якога Айцец пашле ў імя Маё, навучыць вас усяму і нагадае вам пра ўсё, што Я сказаў вам» (Ян 14, 26).

Фрагменты з фільма, прысвечаныя гісторыі пра спасланне Святога Духа.

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразам, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагмента з фільма, дыялог, праца ў парах, пісьмовая праца на аснове тэксту, творчая майстэрня — інсцэніроўка, спеў.

### Ход занятку

**Малітва**

Песня да Святога Духа

**Праверка хатняга задання**

*Катэхет прапаноўвае вучням падзяліцца тым, што ім удалося на працягу мінулага тыдня зрабіць для таго, каб дасягнуць Валадарства Нябеснага.*

*Пры паўтарэнні хатняга задання можна карыстацца крыжаванкамі, змешчанымі ў канцы сшытка (крыжаванка № 22).*

*Катэхет уводзіць вучняў у новую тэму.*

**Чалавек пытаецца**

*Катэхет задае вучням пытанне:*

— Хто нам дапамагае?

*Вучні дзеляцца сваімі адказамі.*

**Бог адказвае**

Пасля ўзнясення на неба Езус абяцаў сваім вучням паслаць памочніка — Святога Духа. Сёння мы з вамі даведаемся, што ў Святым Пісанні гаворыцца пра падзею спаслання Святога Духа і Яго дзеянні ў жыцці хрысціянаў.

*Катэхет вешае на дошку ілюстрацыю*: «Спасланне Святога Духа», і *надпісы да ілюстрацыі:* «І напоўніліся ўсе Духам Святым, і пачалі гаварыць на іншых мовах, як Дух даваў ім прамаўляць» (Дз 2, 4); «А Суцяшыцель, Дух Святы, якога Айцец пашле ў імя Маё, навучыць вас усяму і нагадае вам пра ўсё, што Я сказаў вам» (Ян 14, 26).

*Катэхет прапануе вучням праслухаць аўдыёзапіс урыўкаў з Бібліі: Ян 14, 26; Ян 16, 13–15, Дз 2, 1–4; Дз 1, 8.*

*Катэхет прапануе прагледзець фрагменты з фільма пра спасланне Святога Духа.*

*Катэхет задае вучням пытанні (у сшытку заданне № 1):*

— Калі на Апосталаў сышоў Святы Дух?

— Якія знакі суправаджалі гэтую падзею?

— Якія плады спаслання Святога Духа?

*Катэхет прапануе вучням на аснове біблійных тэкстаў напісаць, кім з'яўляецца Дух Святы і якую ролю Ён іграе ў жыцці хрысціяніна (у сшытку заданне № 2 — можна выконвацца вусна). Тэксты для падрыхтоўкі:*

1. Ян 14, 26
2. Ян 16, 13–15
3. Дз 1, 8

У дыяграме схаваныя назвы дароў Святога Духа.

*Катэхет прапануе вучням знайсці назвы ўсіх сямі дароў (у сшытку заданне № 3):*

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Л | Ў | Я | Ч | Ь | П | Р | А | С | Т | Ў | В |
| Ф | Т | М | У | Д | Р | А | С | Ц | Ь | Ж | І |
| Р | І | Т | Ы | С | О | Д | Б | О | Ж | А | Я |
| А | Л | О | Ь | М | З | Г | М | О | Т | Й | Л |
| З | А | Ш | Ж | Ц | У | Б | О | Я | З | Ь | Ю |
| У | Л | Д | В | У | М | Е | Л | А | С | Ц | Ь |
| М | М | У | Ж | Н | А | С | Ц | Ь | О | Ў | Ч |
| К | П | Б | О | Я | З | Ь | Б | О | Ж | А | Я |
| В | М | П | А | Б | О | Ж | Н | А | С | Ц | Ь |
| К | Е | Н | Г | Й | В | У | Р | А | Д | А | Х |

*Катэхет тлумачыць вучням сэнс дароў Святога Духа. Пасля тлумачэння катэхет прапануе вучням упісаць у табліцу назвы дароў Святога Духа адпаведна іх значэнню (заданне ў сшытку № 4):*

| Дары Святога Духа | Значэнне дароў Святога Духа |
|---|---|
| Мудрасць | Здольнасць успрымаць стварэнне як працу Стварыцеля, які дзейнічае ў нашым жыцці і ў свеце. Гэта асабліва важна ва ўменні бачыць Бога ва ўсім, што з намі адбываецца, і ў кожным, хто нам сустракаецца ў жыцці. |
| Розум | Здольнасць аналізаваць і разважаць, вырашаць праблемы і рашуча ісці за Хрыстом у паўсядзённым жыцці. |
| Рада | Здольнасць адрозніваць добрае ад дрэннага, а таксама выбіраць справядлівае перад несправядлівым і паводзіць сябе адпаведна. |
| Мужнасць | Здольнасць пераадольваць страх, жаданне ісці з Хрыстом і праз гэта актыўна супрацьстаяць спакусе ісці за натоўпам у яго дрэнных учынках і памылках. Першыя хрысціянскія супольнасці апісваюцца ў Бібліі як поўныя мужнасці і гатоўнасці жыць згодна з вучэннем Хрыста і сцвярджаць яго нават пад страхам смерці. |
| Умеласць | Здольнасць ведаць Бога і любіць Яго. |
| Пабожнасць | Здольнасць жыць пакорна і ісці за Панам, напоўніўшыся павагаю да Божых дзяцей. Пабожнасць вядзе да малітвы і пакланення. |
| Боязь Божая | Здольнасць асэнсоўваць няспынную Божую прысутнасць. Той, хто адчувае трапятанне перад Панам, ведае, што ён з'яўляецца дзіцём Айца, Які яго любіць. |

**Чалавек адказвае Богу**

*Катэхет дзеліць вучняў на пары і прапануе паставіць кароткія сцэнкі, у якіх адлюстроўваецца дзеянне дароў Святога Духа ў штодзённым жыцці. Вучні дзеляцца сваёй творчасцю.*

**Разважанне**

Катэхет задае вучням пытанні:

— Ці можаш ты жыць як Божае дзіця без дапамогі Святога Духа?

— Што Дух Святы робіць для цябе?

— Як ты можаш атрымаць дапамогу Святога Духа?

— Што ты можаш і хочаш зрабіць для таго, каб тваё цела стала сапраўднай святыняй Святога Духа?

— Што ты можаш і хочаш зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з Ім?

**Пастанова**

*Катэхет прапануе вучням запісаць пастанову ў сшытак.*

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям’і і сябрам пра тое, як Святы Дух сышоў на Марыю і Апосталаў.

— На працягу тыдня кожны дзень маліся малітвай «Асабістае прысвячэнне Духу Святому».

— На наступны занятак прынясі фотаздымак сваёй сям’і.

**Заключная малітва**

Асабістае прысвячэнне Духу Святому

Дух Святы, Дух Божы, Дух Святла і Любові! Табе прысвячаю мой розум, маё сэрца, маю волю і ўсяго сябе ў зямным і вечным жыцці. Учыні, каб мой розум заўсёды з ахвотаю прымаў натхненні, якія паходзяць ад Цябе, і вучэнне святога Касцёла, якім Ты беспамылкова кіруеш; каб сэрца маё заўсёды палала любоўю да Бога і бліжняга, а воля мая заўсёды адпавядала Божай волі; каб усё маё жыццё было верным наследваннем жыцця і цнотаў нашага Пана і Збаўцы, Езуса Хрыста, якому з Богам Айцом і з Табою няхай заўсёды будзе пашана і хвала. Амэн.

## Тэма 24. Езус збірае нас у Касцёл

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з біблійнымі вобразамі «Езус — Добры Пастыр» і «Езус — вінаградная лаза», у якіх Езус Хрыстус адкрывае нам сутнасць Касцёла; дапамагчы вучням зразумець, што Езус стварыў Касцёл для таго, каб у ім збавіць чалавека.

**Выхаваўчая мэта:**

фарміраваць у вучняў любоў і адказнасць за Касцёл, а таксама імкненне быць сапраўднымі хрысціянамі.

**Матэрыялы:**

Біблія: Ян 10, 11–16; Ян 15, 1–9.

Ілюстрацыі:

1) «Езус — Добры Пастыр», надпіс да ілюстрацыі: «Я — добры пастыр і ведаю сваіх, а Мае ведаюць Мяне» (Ян 10,14);

2) «Езус — вінаградная лаза», надпіс да ілюстрацыі: «Я — вінаградная лаза, вы — галіны. Хто застаецца ўва Мне, а Я ў ім, той прыносіць багаты плён, бо без Мяне нічога не можаце зрабіць» (Ян 15, 5).

Фрагмент з фільма (мультфільма), у якім Езус расказвае прыпавесць пра вінаградную лазу і гаворыць пра сябе як пра Добрага Пастыра.

Плакат у выглядзе касцёла.

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразом, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагмента з фільма, дыялог, праца ў групах, пісьмовая праца на аснове тэксту, творчая майстэрня — маляванне, калаж.

### Ход занятку

**Малітва**

Акт любові…

**Праверка хатняга задання**

*Вучні дзеляцца вопытам малітвы за мінулы тыдзень.*

*Пры паўтарэнні хатняга задання можна карыстацца крыжаванкамі, змешчанымі ў канцы сшытка (крыжаванка № 23).*

**Чалавек пытаецца**

*Катэхет:*

Вы прынеслі сямейныя фотаздымкі. Хто з вас хоча прадставіць нам сваю сям'ю?

*Пасля таго, як ахвотныя прадставілі свае сем'і, фотаздымкі ўсіх вучняў прымацоўваюцца да дошкі.*

*Катэхет пытаецца:*

— Што аб'ядноўвае ўсіх членаў сям'і? *(пад фотаздымкамі дзеці пішуць прозвішчы).*

Кожны з нас належыць да сям'і, а ўсе сем'і належаць да вялікай хрысціянскай сям'і — Касцёла.

*Катэхет задае вучням пытанні (у сшытку заданне № 1):*

— Калі мы становімся членамі Касцёла?

— Хто з'яўляецца заснавальнікам Касцёла?

— Хто з'яўляецца нябачным кіраўніком Касцёла?

**Бог адказвае**

Сёння мы з вамі пагаворым пра тое, з якой мэтай Езус Хрыстус стварыў Касцёл і чаго Ён чакае ад свайго Касцёла.

*Катэхет вешае на дошку ілюстрацыі:*

1) «Езус — Добры Пастыр», *надпіс да ілюстрацыі*: «Я — добры пастыр і ведаю сваіх, а Мае ведаюць Мяне» (Ян 10,14);

2) «Езус — вінаградная лаза», *надпіс да ілюстрацыі:* «Я — вінаградная лаза, вы — галіны. Хто застаецца ўва Мне, а Я ў ім, той прыносіць багаты плён, бо без Мяне нічога не можаце зрабіць» (Ян 15, 5).

*Катэхет прапануе вучням праслухаць аўдыёзапіс фрагментаў з Бібліі: Ян 10, 11–16; Ян 15, 1–9. Можна паказаць вучням фрагмент з фільма (мультфільма), у якім Езус расказвае прыпавесць пра вінаградную лазу і гаворыць пра сябе як пра Добрага Пастыра (звярніце ўвагуна тое, каб фрагмент дакладна адлюстроўваў біблійны сюжэт).*

*Катэхет дзеліць вучняў на дзве групы і прапануе заданне ў сшытку № 2:*

I група

Прачытайце фрагмент са Святога Евангелля паводле Яна **(10, 11–16)** і пісьмова адкажыце на пытанні:

| Што Езус Хрыстус робіць для нас як для членаў свайго Касцёла? | Чаго Езус Хрыстус чакае ад нас як ад членаў свайго Касцёла? |
|---|---|

II група

Прачытайце фрагмент са Святога Евангелля паводле Яна **(15, 1–9)** і пісьмова адкажыце на пытанні:

| Што Езус Хрыстус робіць для нас як для членаў свайго Касцёла? | Чаго Езус Хрыстус чакае ад нас як ад членаў свайго Касцёла? |
|---|---|

*Вучні дзеляцца сваімі адказамі.*

*Катэхет задае вучням пытанні (заданне ў сшытку № 3):*

— Як вы разумееце выраз: «Я — добры пастыр. Добры пастыр аддае жыццё сваё за авечак»?

— Як вы разумееце выраз: «Без Мяне нічога не можаце зрабіць»?

— Што новага вы даведаліся пра Касцёл з сённяшняга ўрока?

**Чалавек адказвае Богу**

*Катэхет:*

Сапраўдны хрысціянін — гэта той, хто:

1. Верыць у тое, што абʼявіў Пан Бог і чаму вучыць Касцёл.
2. Выконвае Божыя запаведзі і касцёльныя наказы.
3. Прымае святыя сакрамэнты.
4. Моліцца і робіць учынкі міласэрнасці.

*Катэхет дзеліць вучняў на 4 групы і прапануе ім заданне № 4:*

I група

Выражце з часопіса ці намалюйце самі малюнак на тэму: «Сапраўдны хрысціянін верыць у тое, што абʼявіў Пан Бог і чаму вучыць Касцёл».

II група

Выражце з часопіса ці намалюйце самі малюнак на тэму: «Сапраўдны хрысціянін выконвае Божыя запаведзі і касцёльныя наказы.

III група

Выражце з часопіса ці намалюйце самі малюнак на тэму: «Сапраўдны хрысціянін прымае святыя сакрамэнты».

IV група

Выражце з часопіса ці намалюйце самі малюнак на тэму: «Сапраўдны хрысціянін моліцца і робіць учынкі міласэрнасці».

*Пры дапамозе сваіх малюнкаў вучні ствараюць калаж на тэму: Каталік на ўсе 100%. Калаж можа быць створаны ў форме касцёла.*

**Разважанне**

Катэхет задае вучням пытанні:

— У чым праяўляецца твая любоў да Касцёла?
— Як часта ты молішся за Касцёл?
— Ці з’яўляецца тваё цела святыняй Святога Духа, які жыве ў табе?
— У чым выяўляецца твая адказнасць за Касцёл?
— Што ты можаш і хочаш зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з Ім?

**Пастанова**

*Катэхет прапануе вучням запісаць пастанову ў сшытак.*

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям’і і сябрам пра тое, што ты даведаўся пра Касцёл, які заснаваў Езус Хрыстус.
— Намалюй ці сфатаграфуй свой парафіяльны касцёл і напішы яго гісторыю. Калі хочаш, можаш павесіць гэтую інфармацыю ў сацыяльнай сетцы, у якой ты зарэгістраваны.

**Заключная малітва**

Малітва за Касцёл

Езу Хрыстэ, Касцёл святы — гэта Твая Божая справа. Учыні, каб паводле Тваёй волі быў ён адзіны, святы, паўсюдны і цалкам скіраваны да той дасканаласці, да якой Ты яго паклікаў. Дай Касцёлу пастаянную жыццяздольнасць і чуйную ўвагу да знакаў часу, каб ён умеў усё спазнаць і ўсё добрае захаваць у кожным часе і ва ўсіх абставінах.

Учыні, каб сярод хрысціянаў любоў была галоўным прынцыпам, міласэрнасць — асаблівай рысай, справядлівасць — хлебам штодзённым, мужнасць у справах — вернасцю, малітва — адпачынкам, радасць — узнагародаю. Просім Цябе, каб Тваё Валадарства праўды і жыцця, святла і ласкі, справядлівасці, любові і спакою пашыралася і ўмацоўвалася з кожным днём. Амэн.

## Тэма 25. Езус прыйдзе судзіць жывых і памерлых

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з біблійнай канцэпцыяй пра другое прыйсце Езуса Хрыста; дапамагчы вучням зразумець, што ніхто не ведае канкрэтнай даты другога прыйсця Езуса Хрыста, што хрысціянін павінен быць заўсёды гатовы да сустрэчы з Панам Богам.

**Выхаваўчая мэта:**

фарміраваць у вучняў імкненне жыць справядлівым жыццём, не баяцца канца свету і быць заўсёды гатовымі да прыйсця Езуса Хрыста.

**Матэрыялы:**

Біблія: Мц 24, 3–14. 36; Мц 25, 31–46; Мц 24, 42. 44–51.

Ілюстрацыя: «Другое прыйсце Езуса Хрыста», надпісы да ілюстрацыі: «А пра дзень той і гадзіну ніхто не ведае, ні анёлы нябесныя, ні Сын, а толькі Айцец» (Мц 24, 36); «Прыйдзіце, благаслаўлёныя Айца Майго, прыміце ў спадчыну Валадарства, падрыхтаванае вам ад стварэння свету» (Мц 25, 34); «Ідзіце ад Мяне, праклятыя, у агонь вечны, падрыхтаваны д'яблу і анёлам ягоным» (Мц 25, 41).

Фрагмент з фільма пра другое прыйсце Езуса Хрыста.

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразом, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагмента з фільма, дыялог, праца ў групах, пісьмовая праца на аснове тэксту, творчая майстэрня — маляванне ці сачыненне.

### Ход занятку

**Малітва**

Веру ў Бога…

**Чалавек пытаецца**

*Катэхет піша на дошцы выраз «Канец свету», задае вучням пытанні (у сшытку заданне № 1):*

— З чым у вас асацыюецца гэты выраз?

— Якія пачуцці ў вас узнікаюць? Чаму?

*Вучні дзеляцца сваімі адказамі.*

**Бог адказвае**

У апошні час мы часта чуем прадказанні пра канец свету. Памятаю, як абяцалі канец свету 21 снежня 2012 года. Але ён не надышоў, і такія ілжэпрадказанні былі і яшчэ не раз будуць у гісторыі чалавецтва. Што нам,

паслядоўнікам Езуса Хрыста, вядома пра канец свету? Для нас, хрысціянаў, канец свету надыдзе з другім прыйсцем Езуса Хрыста. Сёння мы з вамі даведаемся пра тое, што ў Святым Пісанні Пан Бог кажа нам пра гэты дзень.

*Катэхет вешае на дошку ілюстрацыю: «Другое прыйсце Езуса Хрыста», а таксама надпісы: «А пра дзень той і гадзіну ніхто не ведае, ні анёлы нябесныя, ні Сын, а толькі Айцец» (Мц 24, 36); «Прыйдзіце, благаслаўлёныя Айца Майго, прыміце ў спадчыну Валадарства, падрыхтаванае вам ад стварэння свету» (Мц 25, 34); «Ідзіце ад Мяне, праклятыя, у агонь вечны, падрыхтаваны д'яблу і анёлам ягоным» (Мц 25, 41).*

*Катэхет прапануе вучням праслухаць фрагменты з аўдыёзапісу Бібліі: Мц 24, 3–14. 36; Мц 25, 31–46; Мц 24, 42. 44–51. Замест гэтага можна прачытаць тэксты па ролях.*

*Пажадана паказаць фрагмент з фільма ці мультфільма, у якім Езус расказвае пра сваё другое прыйсце (звярніце ўвагу на тое, каб фрагмент дакладна адлюстроўваў біблійны сюжэт).*

«Калі Ён сядзеў на Аліўнай гары, падышлі да Яго вучні асобна, кажучы: „Скажы нам, калі гэта будзе і які знак Твайго прыйсця і сканчэння свету?“

Адказваючы, Езус сказаў ім: „Глядзіце, кааб хто не звёў вас. Бо многія прыйдуць пад імем Маім, кажучы: „Я Хрыстус“, і многіх звядуць. Вы пачуеце пра войны і весткі з войнаў. Глядзіце, не палохайцеся, бо так павінна адбыцца. Але гэта яшчэ не канец. Бо народ паўстане на народ, і каралеўства на каралеўства, і ў розных месцах узнікнуць паморак і землятрусы. Усё гэта — пачатак пакутаў. Пасля аддадуць вас на ўціск і будуць забіваць вас, і зненавідзяць вас усе народы за імя Маё. Тады шмат хто зняверыцца, і будуць выдаваць адзін аднаго і ненавідзець адзін аднаго. І паўстане шмат фальшывых прарокаў, і яны шмат каго звядуць. А з–за таго, што пашырыцца беззаконне, любоў многіх астыне. Але той, хто вытрывае да канца, будзе збаўлены. І гэта Евангелле Валадарства будзе абвешчана па ўсім свеце на сведчанне ўсім народам; і тады настане канец.

<…>

А пра дзень той і гадзіну ніхто не ведае, ні анёлы нябесныя, ні Сын, атолькі Айцец» (Мц 24, 3–14. 36).

«Калі прыйдзе Сын Чалавечы ў славе сваёй і ўсе анёлы з Ім, тады сядзе на троне славы сваёй. І сабраныя будуць перад Ім усе народы, і Ён аддзеліць адных ад другіх, як пастух аддзяляе авечак ад казлоў. І паставіць авечак праваруч, а казлоў — леваруч. Тады скажа Валадар тым, хто праваруч Яго: „Прыйдзіце, благаслаўлёныя Айца Майго, прыміце ў спадчыну Валадарства, падрыхтаванае вам ад стварэння свету. Бо Я быў галодны, і вы далі Мне есці; прагнуў, і вы напаілі Мяне; быў падарожным, і вы прынялі Мяне; быў голы, і

вы апранулі Мяне; быў хворы, і вы адведаліМяне; быў у вязніцы, і вы прыйшлі да Мяне“. Тады адкажуць Яму справядлівыя: „Пане, калі мы бачылі Цябе галодным і накармілі, ці сасмяглым і напаілі? Калі мы бачылі Цябе падарожным і прынялі, ці голым і апранулі? Калі мы бачылі Цябе хворым ці ў вязніцы і прыйшлі да Цябе?“ І Валадар скажа ім у адказ: „Сапраўды кажу вам: тое, што вы зрабілі аднаму з гэтых братоў Маіх меншых, вы Мне зрабілі“. Тады скажа і тым, хто леваруч Яго: „Ідзіце ад Мяне, праклятыя, у агонь вечны, падрыхтаваны д’яблу і анёлам ягоным. Бо Я быў галодны, і вы не далі Мне есці; прагнуў, і вы не напаілі Мяне; быў падарожным, і вы не прынялі Мяне; быў голы, і вы не апранулі Мяне; быў хворы і ў вязніцы, і вы неадведалі Мяне“. Тады і яны адкажуць Яму: „Пане, калі мы бачылі Цябе галодным ці сасмяглым, ці падарожным, ці голым, ці хворым, ці ў вязніцы, і не ўслужылі Табе?“ А Ёнскажаім у адказ: „Сапраўды кажу вам: чаго вы незрабілі аднаму з гэтых меншых, таго не зрабілі Мне“. І гэтыя адыдуць на вечнае пакаранне, а справядлівыя — да вечнага жыцця» (Мц 25, 31–46).

«Таму чувайце, бо не ведаеце, у які дзень Пан ваш прыйдзе. <…> Таму і вы будзьце гатовыя, бо Сын Чалавечы прыйдзе ў тую гадзіну, калі вы не думаеце. Хто ж верны і разумны слуга, якога гаспадар паставіў над слугамі сваімі даваць ім спажытак у адпаведны час? Шчаслівы той слуга, якога гаспадар ягоны, калі прыйдзе, застане, што ён так робіць. Сапраўды кажу вам, што над усёй маёмасцю сваёй паставіць яго.

Калі ж гэты благі слуга скажа ў сэрцы сваім: „Не спяшаецца гаспадар мой“, і пачне біць сяброў сваіх, есці і піць з п’яніцамі, то гаспадар слугі гэтага прыйдзе ў дзень, калі ён не чакае, і ў гадзіну, аб якой не ведае. І адлучыць яго, і вызначыць яму долю разам з крывадушнікамі. Там будзе плач і скрыгатанне зубоў» (Мц 24, 42. 44–51).

*Катэхет дзеліць вучняў на тры групы і прапануе ім выканаць заданне (у сшытку заданне № 2):*

І група

1. Прачытайце фрагмент са Святога Евангелля паводле Мацвея (24, 3–14. 36).

2. Пісьмова адкажыце на пытанні:

— Якія знакі будуць перад канцом свету?

— Растлумачце, як вы разумееце гэтыя знакі?

ІІ група

1. Падрыхтуйце сцэнку на аснове фрагменту са Святога Евангелля паводле Мацвея (25, 31–46).

2. Пісьмова адкажыце на пытанне:

— Па чым Пан Бог будзе судзіць чалавека?

III група

1. Падрыхтуйце сцэнку на аснове фрагменту са Святога Евангелля паводле Мацвея (24, 44–51).
2. Пісьмова адкажыце на пытанне:
— Як падрыхтавацца да другога прыйсця Езуса Хрыста?

*Вучні прадстаўляюць свае працы.*

*Катэхет задае вучням пытанні (у сшытку заданне № 3):*
— Што новага вы для сябе даведаліся пра канец свету?
— Што змянілася ў вашых адносінах да канца свету пасля сённяшняга занятку?

Катэхет прапануе вучням на аснове біблійных тэкстаў (Мц 24, 3–14. 36; Мц 25, 31–46; Мц 24, 42. 44–51) запоўніць табліцу (у сшытку заданне № 4):

| **Пытанні пра канец свету** | **Адказы Езуса Хрыста** |
|---|---|
| Якія падзеі будуць адбывацца перад канцом свету? | |
| Калі надыдзе канец свету? Хто пра гэта ведае? | |
| Што Езус Хрыстус на судзе скажа справядлівым? | |
| Што Езус Хрыстус на судзе скажа грэшнікам? | |
| Як падрыхтавацца да канца свету? | |

**Чалавек адказвае Богу**

*Катэхет прапануе вучням напісаць разважанне або намаляваць малюнак на тэму: «Як ты рыхтуешся да другога прыйсця Езуса Хрыста?» (у сшытку заданне № 5).*
*Вучні дзеляцца сваёй творчасцю.*

**Разважанне**

*Катэхет задае вучням пытанні:*

— Ці верыш ты прадказанням ілжэпрарокаў пра канец свету?

— Як ты рыхтуешся да канца свету?

— Як ты адносішся да бліжніх? Ці бачыш ты ў іх Езуса Хрыста?

— Што ты робіш для бліжніх?

— Ці не робіш ты дабро напаказ?

— Што ты можаш і хочаш зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з Ім?

**Пастанова**

Катэхет прапануе вучням запісаць пастанову ў сшытак.

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям'і і сябрам пра другое прыйсце Езуса Хрыста.

— На працягу гэтага тыдня звярні асаблівую ўвагу на бліжніх, якіх ты недалюбліваеш, маліся за іх і пастарайся зрабіць для іх добрыя ўчынкі. Рабі гэта ў імя Езуса Хрыста і для Яго.

**Заключная малітва**

Літанія да Найсвяцейшага Імені Езус.

## Тэма 26. Жыццё першых хрысціянаў. Мучаніцтва святога Стэфана

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з тым, што ў Бібліі гаворыцца пра жыццё першых хрысціянаў і пра першамучаніка Стэфана; дапамагчы вучням зразумець, што сапраўдным хрысціянам уласціва любоў і адзінства.

**Выхаваўчая мэта:**

фарміраваць у вучняў імкненне быць сапраўднымі хрысціянамі.

**Матэрыялы:**

Біблія: Дз 2, 42–47; Дз 4, 32–35; Дз 5, 14; Дз 7, 54–60.

Ілюстрацыі:

1) «З жыцця першых хрысціянаў», надпісы да ілюстрацыі: «Паглядзіце, як яны любяць адно аднаго» Тэртуліян; «Штодня збіраліся аднадушна ў святыні, і ламаючы дома хлеб, яны спажывалі ежу ў радасці і прастаце сэрца, праслаўляючы Бога і маючы прыхільнасць усяго народу. А Пан штодня далучаў да іх тых, хто меў быць збаўлены» (Дз 2, 46–47);

2) «Мучаніцкая смерць святога Стэфана», надпіс да ілюстрацыі: «І, упаўшы на калені, ён [Стэфан] усклікнуў моцным голасам: „Пане, не лічы ім граху гэтага“. І, сказаўшы гэта, памёр» (Дз 7, 60).

Фрагмент з фільма, у якім адлюстроўваецца жыццё першых хрысціянаў і смерць першамучаніка Стэфана.

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразом, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагмента з фільма, акраверш, праца з біблійным тэкстам (вылучэнне фрагментаў тэксту рознымі колерамі), дыялог, праца ў групах, пісьмовая праца на аснове тэксту, творчая майстэрня — інтэрв’ю.

### Ход занятку

**Малітва**

Акт любові

**Праверка хатняга задання**

*Катэхет прапануе вучням распавесці пра тое, што ў іх атрымалася зрабіць для людзей, якіх яны недалюбліваюць.*

*Пры паўтарэнні хатняга задання можна выкарыстоўваць крыжаванкі, змешчаныя ў канцы сшытка (крыжаванка № 25).*

*Катэхет уводзіць вучняў у новую тэму.*

**Чалавек пытаецца**

*Катэхет прапануе вучням адказаць на пытанне, выкарыстоўваючы першыя літары слова «хрысціянін» (у сшытку заданне № 1):*

— Якога чалавека можна назваць сапраўдным хрысціянінам?

| | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | Х | | | | | | | | |
| | | | | | | | | Р | | | | | | | | |
| | | | | | | | | Ы | | | | | | | | |
| | | | | | | | | С | | | | | | | | |
| | | | | | | | | Ц | | | | | | | | |
| | | | | | | | | І | | | | | | | | |
| | | | | | | | | Я | | | | | | | | |
| | | | | | | | | Н | | | | | | | | |
| | | | | | | | | І | | | | | | | | |
| | | | | | | | | Н | | | | | | | | |

*Вучні выказваюць сваё меркаванне.*

**Бог адказвае**

Сёння мы з вамі пазнаёмімся з фактамі жыцця першых хрысціянаў. Яно апісана ў першых главах кнігі Дзеяў Апосталаў. Хрысціянскую супольнасць узначальвалі Апосталы, да якіх далучыўся Мацвей замест Юды Іскарыёта. Пасля ўнебаўшэсця Езуса Хрыста Касцёл складаўся са 120 чалавек. У дзень спаслання Святога Духа супольнасць павялічылася на 3 000 чалавек. Праз нядоўгі час колькасць хрысціянаў узрасла на 5 000 чалавек. Цяпер нас, хрысціянаў-католікаў, ва ўсім 1, 2 мільярды.

*Катэхет вешае на дошку ілюстрацыі:*

1) «З жыцця першых хрысціянаў», *надпісы да ілюстрацыі:* «Паглядзіце, як яны любяць адно аднаго» Тэртуліян; «Штодня збіраліся аднадушна ў святыні, і ламаючы дома хлеб, яны спажывалі ежу ў радасці і прастаце сэрца, праслаўляючы Бога і маючы прыхільнасць усяго народу. А Пан штодня далучаў да іх тых, хто меў быць збаўлены» (Дз 2, 46–47);

2) «Мучаніцкая смерць святога Стэфана», *надпіс да ілюстрацыі:* «І, упаўшы на калені, ён [Стэфан] усклікнуў моцным голасам: „Пане, не лічы ім граху гэтага“. І, сказаўшы гэта, памёр» (Дз 7, 60).

*Катэхет прапануе вучням праслухаць чатыры фрагменты аўдыёзапісу Біблії: Дз 2, 42–47; Дз 4, 32–35; Дз 5, 14; Дз 7, 54–60.*

*Можна паказаць фрагмент з фільма, у якім адлюстроўваецца жыццё першых хрысціянаў і смерць першамучаніка Стэфана.*

*К. прапануе вучням пісьмова папрацаваць з біблійнымі тэкстамі (у сшытку заданне № 2)*:

Дз 2, 42–47;
Дз 4, 32–35; Дз 5, 14;
Дз 7, 54–60.

Падкрэслі чырвоным колерам усё, што характарызавала жыццё першых хрысціянаў, а таксама словы і дзеянні Стэфана; сінім колерам — адносіны людзей да першых хрысціянаў і да святога Стэфана.

*Катэхет:*

Сёння адбудзецца прэс–канферэнцыя на тэму «Жыццё першых хрысціянаў. Мучаніцтва святога Стэфана» *(у сшытку заданне № 3).*

*Катэхет дзеліць вучняў на 2 групы. Першая група выбірае вучняў, якія будуць прадстаўляць Стэфана і трох першых хрысціянаў. На аснове біблійных тэкстаў група рыхтуецца да прэс–канферэнцыі.*

*Другая група са свайго складу выбірае журналістаў-рэпарцёраў і на аснове біблійных тэкстаў рыхтуе пытанні для ўдзельнікаў прэс–канферэнцыі.*

I група:

Стэфан і трое першых хрысціянаў (вучні могуць падрыхтаваць для сябе касцюмы і іншыя неабходныя атрыбуты).

На аснове біблійных тэкстаў (Дз 2, 42–47; Дз 4, 32–35; Дз 5, 14; Дз 7, 54–60) падрабязна вывучыце падзеі з жыцця першых хрысціянаў і гісторыю мучаніцтва Стэфана. Выбірыце вучняў, якія будуць прадстаўляць Стэфана і трох першых хрысціянаў на прэс-канферэнцыі.

II група:

журналісты-рэпарцёры (вучні могуць выбраць фотарэпарцёра, могуць здымаць рэпартаж і г.д.).

На аснове біблійных тэкстаў (Дз 2, 42–47; Дз 4, 32–35; Дз 5, 14; Дз 7, 54–60) падрабязна вывучыце падзеі з жыцця першых хрысціянаў і гісторыю мучаніцтва Стэфана. Падрыхтуйце пытанні, якія дапамаглі б чытачам вашай газеты (гледачам вашай перадачы) яскрава і падрабязна даведацца пра жыццё першых хрысціянаў і мучаніцтва Стэфана.

*Катэхет:*

Цяпер адбудзецца прэс-канферэнцыя.

*Групы займаюць свае месцы, і пачынаецца прэс-канферэнцыя.*

*Пасля яе завяршэння катэхет задае пытанні вучням:*

— Якое, на ваш погляд, самае цікавае пытанне задалі рэпарцёры?

— Які, на ваш погляд, самы цікавы адказ?

— Што новага вы даведаліся пра жыццё першых хрысціянаў і Стэфана?

— Што вам больш за ўсё спадабалася з жыцця першых хрысціянаў і Стэфана?

**Чалавек адказвае Богу**

*Катэхет прапануе запоўніць табліцу (у сшытку заданне № 4):*

| Жыццё першых хрысціянаў | | Жыццё сучасных хрысціянаў |
|---|---|---|
| Чым першыя хрысціяне адрозніваліся ад сучасных? | Што агульнага паміж першымі і сучаснымі хрысціянамі? | Чым сучасныя хрысціяне адрозніваюцца ад першых хрысціянаў? |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |

*З дапамогаю наступных выразаў катэхет прапануе напісаць петыцыю — зварот да сучасных хрысціянаў.*

Захоўвайце…

Перастаньце чыніць….

Чыніце, як…

*Катэхет прапануе вучням (па жаданні) вывесіць петыцыю-зварот на сваю інтэрнэт-старонку ў сацыяльнай сетцы.*

**Разважанне**

*Катэхет задае вучням пытанні:*

— Што агульнага паміж вашым жыццём і жыццём першых хрысціянаў?

— Чым ваша жыццё адрозніваецца ад жыцця першых хрысціянаў?

— Што вы павінны змяніць у сваіх думках, словах і ўчынках, каб стаць сапраўдныммі хрысціянамі?

— Што вы можаце і хочаце зрабіць для Езуса Хрыста і Яго Касцёла пасля сённяшняй сустрэчы з Ім?

**Пастанова**

*Катэхет прапануе вучням запісаць пастанову ў сшытак.*

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям’і і сябрам пра жыццё першых хрысціянаў і мучаніцтва Стэфана.

— На працягу гэтага тыдня памаліся за людзей, якія ахрышчаныя, але не з’яўляюцца сапраўднымі хрысціянамі, каб яны навярнуліся і адчулі паўнату радасці і збаўлення, якую Бог дае нам праз веру ў Езусе Хрысце.

**Заключная малітва**

Пане, дазволь мне прынесці плён

Пане, Ты клічаш мяне, а я баюся пайсці за Табою. Выпрабоўваеш мяне праз учынкі іншых людзей, праз радасныя і смутныя падзеі, а я баюся пайсці за Табою. Адчуваю, як Ты заахвочваеш мяне, каб я развіваўся, але я трываю ў сваіх звычках і пасрэднасці. Ты хочаш завалодаць мною, а я замыкаюся ў сабе, прагнеш даць мне вялізны дар, а я не магу Яго прыняць.

Прыняцце Цябе вымагае балючага разрыву з маімі прымхамі, баязлівасцю, закаранелым перакананнем ва ўласнай беспамылковасці. Дай мне сілы, каб я мог адкінуць тое, што лёгка і выгодна. Зрабі, каб я адмовіўся ад таго, што акцэптуюць іншыя з прычыны свайго канфармізму і недахопу арыгінальнасці.

Калі я павінен прайсці які-небудзь шлях, пакіруй маімі крокамі, бо я не веру, што сам магу дайсці да мэты. Амэн.

## Тэма 27. Святы Павел — Апостал народаў

**Дыдактычная мэта:**

пазнаёміць вучняў з біблійнай гісторыяй пра навяртанне святога апостала Паўла; дапамагчы вучням зразумець, што Езус Хрыстус — усемагутны Бог, толькі Ён можа карэнным чынам змяніць наша жыццё, як змяніў жыццё Саўла; што навяртанне адбываецца дзякуючы прыняццю ласкі веры і вернаму наследаванню Езусу Хрысту.

**Выхаваўчая мэта:**

фарміраваць у вучняў імкненне быць воінам Езуса Хрыста.

**Матэрыялы:**

Біблія: Дз 8 1–3; Дз 9, 1–22.

Ілюстрацыя: «Навяртанне Паўла», надпісы да ілюстрацыі: «Саўл, Саўл, чаму ты пераследуеш Мяне?» (Дз 9, 4); «Ужо не я жыву, а жыве ўва мне Хрыстус» (Гал 2, 20); «Для мяне жыццё — гэта Хрыстус, а смерць — гэта выгада» (Флп 1, 21); «Калі я гавару мовамі людзей і анёлаў, а любові не маю, я — як медзь звонкая або гулкія цымбалы» (1 Кар 13, 1).

Фрагмент з фільма пра навяртанне Саўла або фрагменты пра жыццё святога Паўла.

**Метады катэхезы:**

малітва, аналіз біблійнага тэксту, медытацыя над абразам, завучванне ключавога верша на памяць, слуханне аўдыёзапісу Бібліі, прагляд фрагмента з фільма, дыялог, праца ў групах, пісьмовая праца на аснове тэксту, творчая майстэрня — рэпартаж.

### Ход занятку

**Малітва**

Акт веры…

**Праверка хатняга задання**

*Катэхет прапануе вучням падзяліцца вопытам малітвы за людзей, якія былі ахрышчаныя, але не з'яўляюцца сапраўднымі хрысціянамі.*

*Пры паўтарэнні хатняга задання можна выкарыстоўваць крыжаванкі, змешчаныя ў канцы сшытка (крыжаванка № 26).*

*Катэхет уводзіць вучняў у новую тэму.*

**Чалавек пытаецца**

*Катэхет:*

Я прынесла вам урыўкі з лістоў аднаго чалавека, прапаную вам на аснове гэтых лістоў скласці духоўны партрэт аўтара.

Што вы можаце сказаць пра гэтага чалавека?

Урыўкі з лістоў *(у сшытку заданне № 1)*:

«Для мяне жыццё — гэта Хрыстус, а смерць — гэта выгада» (Флп 1, 21);

«Ужо не я жыву, а жыве ўва мне Хрыстус» (Гал 2, 20);

«Калі я гавару мовамі людзей і анёлаў, а любові не маю, я — як медзь звонкая або гулкія цымбалы» (1 Кар 13, 1).

«Настаў час майго адыходу. У добрай барацьбе я змагаўся, бег скончыў, веру захаваў. Нарэшце рыхтуецца мне вянок справядлівасці, які дасць мне Пан, справядлівы Суддзя, у дзень той. І не толькі мне, але ўсім, хто палюбіў Яго аб'яўленне» (2 Цім 4, 6–8).

*Вучні дзеляцца сваімі адказамі.*

**Бог адказвае**

Мы з вамі чыталі ўрыўкі з лістоў і спрабавалі скласці духоўны партрэт святога Паўла — Апостала народаў. Сёння мы з вамі бліжэй пазнаёмімся са святым Паўлам і дакранемся да вялізнага багацця яго духоўнай спадчыны.

*Катэхет вешае на дошку ілюстрацыю* «Навяртанне Паўла», *а таксама надпісы:* «Саўл, Саўл, чаму ты пераследуеш Мяне?» (Дз 9, 4); «Ужо не я жыву, а жыве ўва мне Хрыстус» (Гал 2, 20); «Для мяне жыццё — гэта Хрыстус, а смерць — гэта выгада» (Флп 1, 21); «Калі я гавару мовамі людзей і анёлаў, а любові не маю, я — як медзь звонкая або гулкія цымбалы» (1 Кар 13, 1).

*Катэхет прапануе вучням праслухаць аўдыёзапіс урыўкаў з Бібліі: Дз 8, 1–3; Дз 9, 1–22.*

*Можна паказаць вучням фрагмент з фільма пра навяртанне Саўла або фрагменты з жыцця святога Паўла (звярніце ўвагу на тое, каб фрагмент дакладна адлюстроўваў біблійны сюжэт).*

*Катэхет дзеліць вучняў на тры групы і прапануе напісаць рэпартаж пра жыццё святога Паўла (у сшытку заданне № 2). Першая група піша рэпартаж пра жыццё Саўла да сустрэчы з Езусам Хрыстом; другая група піша рэпартаж пра сустрэчу Саўла з Езусам Хрыстом; трэцяя група піша рэпартаж пра жыццё Паўла пасля сустрэчы з Езусам Хрыстом.*

І група

Жыццё Саўла да сустрэчы з Езусам Хрыстом

«А Саўл быў згодны з ягоным забойствам. У той дзень пачаўся вялікі пераслед Касцёла ў Ерузалеме. Усе, акрамя Апосталаў, разышліся па краінах Юдэі і Самарыі. Пахавалі Стэфана пабожныя людзі і ўчынілі вялікі плач па ім. А Саўл нішчыў Касцёл, уваходзіў у дамы, забіраючы мужчын і жанчын і кідаючы іх у вязніцу» (Дз 8, 1–3).

«Саўл усё яшчэ жыў пагрозамі і забойствамі вучняў Пана. Ён прыйшоў да першасвятара і папрасіў у яго лісты да сінагогаў у Дамаску, каб, калі знойдзе якіх-небудзь прыхільнікаў гэтага шляху, мужчын ці жанчын, мог звязаць іх і прывесці ў Ерузалем» (Дз 9, 1–2).

II група
Сустрэча Саўла з Езусам Хрыстом

«Калі ён падчас падарожжа набліжаўся да Дамаска, раптам святло з неба асвятліла яго. Ён упаў на зямлю і пачуў голас, які казаў яму: „Саўл, Саўл, чаму ты пераследуеш Мяне?“ Ён жа сказаў: „Хто Ты, Пане?“ А той адказаў: „Я Езус, якога ты пераследуеш. Устань і ідзі ў горад, там скажуць табе, што ты павінен зрабіць“. Людзі, якія ішлі разам з ім, анямелі, бо чулі голас, але нікога не бачылі. Саўл падняўся з зямлі і, хоць вочы былі адкрытыя, нікога не бачыў. Узяўшы за руку, павялі яго ў Дамаск. Тры дні ён не бачыў і не еў, і не піў» (Дз 9, 3–9).

III група
Жыццё Паўла пасля сустрэчы з Езусам Хрыстом.

«У Дамаску быў адзін вучань па імені Ананія. Пан аб’явіўся яму і сказаў: „Ананія“. А ён адказаў: „Гэта я, Пане“. Пан сказаў яму: „Устань і ідзі на вуліцу, якая завецца Простай, і спытайся ў доме Юды пра Саўла з Тарса, бо ён цяпер моліцца“. І ўбачыў Саўл у аб’яўленні чалавека па імені Ананія, які ўвайшоў і ўсклаў на Яго рукі, каб ён зноў мог бачыць. Адказаў Ананія: „Пане, шмат ад каго я чуў пра гэтага чалавека, колькі ён учыніў зла Тваім святым у Ерузалеме. І тут ён мае ад першасвятароў уладу зняволіць усіх, хто заклікае імя Тваё“. Але Пан сказаў яму: „Ідзі, бо гэты чалавек — маё выбранае начынне. Ён занясе імя Маё народам, каралям і сынам Ізраэля. Я пакажу яму, колькі ён павінен выцерпець дзеля Майго імя“. Тады пайшоў Ананія і ўвайшоў у дом. І, усклаўшы на Яго рукі, сказаў: „Браце Саўле, Пан Езус, які з’явіўся табе на дарозе, якою ты ішоў, паслаў мяне, каб ты зноў мог бачыць і напоўніўся Духам Святым“. І адразу нібы луска спала з вачэй ягоных, і стаў бачыць, падняўся і быў ахрышчаны. А калі спажыў ежу, набраўся сілы.

Некалькі дзён Саўл быў з вучнямі ў Дамаску. І адразу пачаў абвяшчаць у сінагогах пра Езуса, што Ён Сын Божы. І ўсе, хто чуў, здзіўляліся і казалі: „Ці не той гэта, які пераследаваў у Ерузалеме вызнаўцаў імені гэтага? І сюды прыйшоў ён для таго, кааб зняволіць іх і прывесці да першасвятароў“. Але Саўл умацоўваўся яшчэ больш і прыводзіў у замяшанне юдэяў, якія жылі ў Дамаску, даказваючы, што Езус ёсць Месіяй» (Дз 9, 10–22).

*Вучні прадстаўляюць свае працы.*
*Катэхет задае вучням пытанні (у сшытку заданне № 3):*

— Чым займаўся Саўл да сустрэчы з Езусам Хрыстом?

— Што незвычайнага было ў сустрэчы Езуса з Саўлам?

— Што вам больш за ўсё запомнілася?

— Як змянілася жыццё Саўла — Паўла пасля сустрэчы з Езусам Хрыстом?

**Чалавек адказвае Богу**

*Катэхет:*

Святы апостал Павел, сам з'яўляючыся воінам-рыцарам Езуса Хрыста, заклікае нас стаць такімі ж воінамі Хрыстовымі.

*Катэхет прапануе вучнм прачытаць фрагменты з Новага Запавету: Эф 6, 10–11, Эф 6, 13–17 і адказаць на пытанні (у сшытку заданне № 4):*

— Што павінен мець воін Хрыста?

— Што ўваходзіць у склад зброі Божай, дзякуючы якой мы змагаемся са спакусамі д'ябла?

*Катэхет прапануе вучням пісьмова выканаць заданне:*

Прачытай фрагмент з Паслання да Эфесцаў (6, 10–11. 13–17) і дапоўні сказы.

**Разважанне**

Катэхет задае вучням пытанні:

— Які ты воін Езуса Хрыста?

— Як ты пераносіш пакуты, цяжкасці, звязаныя з вызнаваннем сваёй веры?

— Што ты робіш для Езуса Хрыста і Яго Касцёла (назаві канкрэтныя ўчынкі)?

— Якія рысы характару ты павінен імкнуцца выпрацаваць у сабе, каб стаць сапраўдным воінам Езуса Хрыста?

— Чаму ты навучыўся ад святога Паўла?

— Што ты можаш і хочаш зрабіць для Езуса Хрыста пасля сённяшняй сустрэчы з Ім?

**Пастанова**

*Катэхет прапануе вучням запісаць пастанову ў сшытак.*

**Хатняе заданне**

— Раскажы членам сваёй сям'і і сябрам пра жыццё і дзейнасць святога апостала Паўла.

— Кожны вечар рабі аналіз пражытага дня і шчыра адказвай самому сабе на пытанне: як я, з'яўляючыся воінам Езуса Хрыста, супрацьстаяў злу і што я зрабіў для набліжэння Валадарства Божага?

**Заключная малітва**

Пакліканыя да сведчання

Пане, Ты заклікаеш мяне да таго, каб я сведчыў пра Цябе іншым людзям. Ведаю, што я павінен рабіць і якім павінен быць. Адчуваю, што Ты мне вельмі патрэбны, каб я мог жыць згодна з Тваёю воляю.

Ты заклікаеш мяне да таго, каб я, жывучы сярод іншых людзей, распазнаваў Цябе ў сваіх бліжніх. Заклікаеш мяне сур'ёзна адносіцца да часу і жыцця, да людзей і любові. Твой вучань заўжды бачыць Цябе ў іншых людзях і любіць іх, прабачае ім, ён знаходзіць Цябе ва ўбогіх і прыходзіць ім на дапамогу.

Пане, Ты кожны дзень клічаш мяне, як і кожнага чалавека — смутнага ці вясёлага, сціплага ці ганарыстага, магутнага ці слабога. Ты клічаш мяне заўсёды: калі я плачу і пакутую, калі працую і люблю, клічаш мяне ў маёй свабодзе. Ты побач са мною ва ўсім, што я раблю, Ты ведаеш сэрцы ўсіх людзей, дапамажы мне выканаць заданне, якое Ты прызначыў для мяне. Амэн.